MIESIĘCZNIK

POŁOCKI.

Tom I.

Rok 1818.

*«Вестник Полоцкого государственного университета» продолжает традиции первого в Беларуси литературно-научного журнала «Месячник Полоцкий».*

# ВЕСНІК ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА
## Серыя А. Гуманітарныя навукі

У серыі А навукова-тэарэтычнага часопіса друкуюцца артыкулы, якія прайшлі рэцэнзаванне і змяшчаюць новыя навуковыя вынікі ў галіне гісторыі, літаратуразнаўства і мовазнаўства.

# ВЕСТНИК ПОЛОЦКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА
## Серия А. Гуманитарные науки

В серии А научно-теоретического журнала публикуются статьи, прошедшие рецензирование, содержащие новые научные результаты в области истории, литературоведения и языкознания.

# HERALD OF POLOTSK STATE UNIVERSITY
## Series A. Humanity sciences

Series A includes reviewed articles which contain novelty in research and its results in history, literary studies and linguistics.

**Адрес редакции:**
**Полоцкий государственный университет, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, 211440, Беларусь,**
**тел. +375 (214) 53 34 58, e-mail: vestnik@psu.by**

Отв. за выпуск: А.А. Гугнин, Д.В. Дук, Н.Б. Лысова.

Редактор Р.Н. Авласенок.

Подписано к печати 30.07.2014. Бумага офсетная 70 г/м$^2$. Формат $60 \times 84\ ^1/_8$. Ризография.

Усл. печ. л. 13,95. Уч.-изд. л. 16,81. Тираж 100 экз. Заказ 1569.

***2014 – знаменательный год для белорусов. 70 лет назад территория Беларуси была освобождена от немецко-фашистских захватчиков. Главным средством насаждения «нового порядка» нацисты избрали политику геноцида и массового кровавого террора. Гитлеровцы чинили неслыханные зверства, не щадя ни женщин, ни детей. Была создана сеть концентрационных лагерей для военнопленных и гражданского населения. Всего, согласно архивным данным, действовало около 260 различного типа мест концентрации и массового уничтожения военнопленных и около 350 – для гражданского населения. На территории Беларуси было проведено более 140 карательных акций с целью подавления сопротивления, порабощения жителей оккупированной территории, разграбления имущества, во время которых уничтожено около 5,5 тыс. населённых пунктов, в том числе 630 из них вместе с жителями. Но никакими репрессиями оккупанты не могли сломить волю белорусского народа к освобождению. Свой вклад в разгром немецко-фашистских захватчиков внесли партизаны и подпольщики Беларуси, которую в годы оккупации по праву называли «республикой-партизанкой». За три года героической борьбы в тылу врага патриоты Беларуси уничтожили почти полмиллиона гитлеровцев и полицейских. Благодаря героизму белорусского народа – будь-то солдат Красной Армии, сражавшийся на фронтах, или партизан отряда и участник подпольной группы, осуществлявшие диверсии и собиравшие информацию, или остарбайтер, угнанный на работы в Германию, и узник концентрационного лагеря или женщины, старики и дети, оставшиеся на оккупированной территории, – Победа над нацизмом стал реальностью.***

**УДК 94(476.5)**

# ПЛАН ГОРОДА ПОЛОЦКА С НАНЕСЕНИЕМ НА НЕГО ВОЕННЫХ ОБЪЕКТОВ ОТ 20 ОКТЯБРЯ 1942 ГОДА (ПЛАН Н.А. МАНИСА) КАК ИСТОЧНИК ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ НАЦИСТСКОГО ОККУПАЦИОННОГО РЕЖИМА (1941–1944 ГГ.)

***канд. ист. наук, доц. А.И. КОРСАК***
***(Полоцкий государственный университет)***

*Изучение периода нацистской оккупации территории Беларуси в рамках локальной истории на примере городов и местечек на данном этапе развития отечественной историографии представляется актуальным, тем более в связи с отсутствием прямых источников по исследуемой тематике. В данной работе впервые вводятся в научный оборот архивные документы, найденные в Национальном архиве Республики Беларусь, в частности оригинал плана города Полоцка от 20 февраля 1942 года Н.А. Маниса (один из подпольщиков г. Полоцка) с нанесением на него военных и гражданских объектов и пояснительной запиской, известный до этого только в восстановленном виде после войны.*

**Введение.** Исследование периода нацистской оккупации г. Полоцка в годы Великой Отечественной войны затруднено отсутствием фактологического материала по данной теме. Наличие тех архивных данных, которые имеются в Национальном архиве Республики Беларусь (НАРБ), Государственном архиве Витебской области и Зональном государственном архиве в городе Полоцке, является недостаточным для восстановления картины событий 1941–1944 годов. Но совокупность всех косвенных источников и их анализ представляет возможным отобразить деятельность оккупационных органов власти немецко-фашистских захватчиков на территории города Полоцка в годы Великой Отечественной войны.

В фонде № 1403 НАРБ имеются дела № 252 и 253, отражающие боевую и разведывательную деятельность 3-й Белорусской партизанской бригады на территории Полоцкого района в целом и города Полоцка в частности. При изучении содержания документов данных дел был обнаружен так называемый «план Маниса», о котором имеется много информации, но оригинал не был найден. В экспозиции Музея боевой славы Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника находится набросок плана, воссозданный Н.А. Манисом уже после Великой Отечественной войны.

Исходя из этого, основной целью данного исследования является введение впервые в научный оборот «Плана г. Полоцка» с нанесением на него военных объектов, составленного 20 октября 1942 года Н.А. Манисом (см. вклейку). Фактически это единственный план города Полоцка периода нацистской оккупации 1941–1944 годов.

**Основная часть.** Почему план условно называют «планом Маниса»? Немного фактов из биографии его автора. Родился Николай Александрович Манис в 1912 году в Варшаве. Но вскоре семья переехала в Беларусь, где и прожил все оставшиеся годы. В 1927 году он окончил Освейскую 7-летнюю школу и поступил в Полоцкое педагогическое училище [3]; затем – физико-математический факультет БГУ, после окончания которого был направлен на работу в Полоцкое педагогическое училище. В декабре 1936 года призван на службу в Красную Армию. Служил в команде одногодичников в 5-й авиабригаде (ст. Алсуфьево). После демобилизации в звании младшего лейтенанта, в 1937 году вернулся в Полоцк и до начала Великой Отечественной войны преподавал математику в Полоцком педагогическом училище [1, Л. 3]. С 1947 года Н.А. Манис снова на педагогической работе; долгие годы он был директором СШ № 13 города Полоцка. В 1966 году Н.А. Манис был удостоен звания Заслуженного учителя БССР.

До того как уйти в 3-ю Белорусскую партизанскую бригаду, Н.А. Манис находился в оккупированном нацистами Полоцке.

Третья Белорусская партизанская бригада начала своё формирование с сентября 1941 года путём создания мелких групп. Ядром бригады стал отряд А.Я. Марченко, который к маю 1942 года в своих рядах насчитывал до 200 человек. Местом зарождения отряда были деревни Труды, Дретунь, Недружное и другие. Организующим началом отряда были военнопленные и рабочие, работавшие на станции Дретунь, а также жители прилегающих деревень. Таким образом, небольшая группа из 18 человек в сентябре 1941 года к августу 1942-го выросла в бригаду (до 900 человек), имея в своём составе 7 крупных партизанских отрядов. Штаб бригады вместе с разведывательной ротой, хозяйственным взводом и лазаретом насчитывал 100 человек [4, Л. 19].

Деятельность Н.А. Маниса заключалась в распространении информации о положении на фронтах Великой Отечественной войны в виде листовок, в сборе данных о местонахождении и режиме немецких объектов на территории города Полоцка. Согласно воспоминаниям Н.А. Маниса, «В первые дни перед нами возникла проблема получения информации о положении на фронте. Гитлеровцы трубили о своих победах, о захвате Москвы, о разложении Красной Армии… Правдивую информацию мы получали разными путями… Ещё с осени мы с Суховеем организовали тайник для сообщений с фронта и другой информации. Он был устроен в одной из заброшенных коморок около отдела снабжения (часть здания было разрушено и не использовалось). Сводки или листовки, часто написанные от руки или напечатанные на машинке (Пашкевич), клались в тайничок почти ежедневно каждым, кто располагал информацией, и прочитывались после нами (Суховей, я, Миндалев, Пашкевич, а затем к тайничку были приобщены и кое-кто из надёжных людей, приезжавших в отдел снабжения из района)» [1, Л. 11–12]. Кроме того, работая в отделе по снабжению в районной управе, Н.А. Манис имел возможность организации поддержки продуктами городских семей, не имеющих кормильцев, путём вписывания в списки лишних иждивенцев и выдачи на них карточек и т.д.

Его деятельность продолжалась до 20 октября 1942 года до момента ликвидации районной управы и преследования её работников со стороны оккупационных властей.

На вопрос о том, при каких условиях был создан план, отвечает сам Н.А. Манис: «Я с семьёй вышел в партизаны 20 октября 1942 года (этим числом датируется и план – *авт. А. К.*) в первые же два дня по просьбе заместителя командира бригады по разведке Рыжика я по памяти нанёс на карту города более 60 немецких объектов, изучение которых мы производили с Безером. Этот план послужил хорошую службу не только партизанам, как я хорошо помню, с него дважды снималась копия для использования один раз спецгруппой МГБ (Министерство государственной безопасности – *авт. А. К.*), пришедшей из-за фронта» [2, Л. 19].

Манис был определён «в разведку, откуда в самом начале 1943 года командованием бригады, не без ведома, а может быть и по инициативе Марченко, был переведён в штаб бригады», где «было поручено также заниматься делами по разведке, которую вела бригада» [2, Л. 19].

Таким образом, Н.А. Манис в годы нацистской оккупации территории г. Полоцка с 16 июля 1941-го по 20 октября 1942 года находился в пределах города и, соответственно, достаточно хорошо ориентировался и знал месторасположение как военных, так и гражданских объектов. Карта, составленная им (см. вклейку), на наш взгляд, вполне соответствует реальному положению дел в исследуемый период.

### Пояснительная записка к карте

1. Здание Ортскомендатуры;
2. Soldaten Heim (солдатский дом – *авт. А. К.*);
3. Полевая жандармерия;
4. Полоцкая Городская Управа;
5. Казарма воинской части;
6. Склад стройматериалов;
7. Казарма воинской части;
8. Казарма воинской части;
9. Общежитие немцев, строителей железнодорожного моста;
10. Полоцкая жандармерия;
11. Рабочая колонна по вывозке леса;

12. Бензосклад (наземный);
13. Склады;
14. Восточный вокзал;
15. Узел связи (воинский);
16. Школа по подготовке агентов шпионажа. Казарма;
17. Гестапо. Управление транспорта;
18. Здание (неразборчиво – *авт. А. К.*);
19. Гараж автомашин;
20. Фельдкомендатура (полевая комендатура);
21. Группа зданий. Казармы SS, склады;
22. Подземный бензосклад;
23. Крупный наземный бензосклад;
24. Склады строй материалов;
25. Казармы военной части;
26. Казармы военной части;
27. Воинский хлебозавод;
28. Склад боеприпасов;
29. Электростанция;
30. Группа зданий – военный госпиталь;
31. Навесной железнодорожный мост;
32. Железнодорожный мост через р. Полоту;
33. Новое депо – паровозное;
34. Депо паровозное;
35. Железнодорожная полиция (до 20 человек);
36. Западный вокзал;
37. Разрушенный деревянный мост;
38. Пешеходный железный мост;
39. Двухпутный железнодорожный мост;
40. Мясокомбинат;
41. Здание ВИКО-Полоцк;
42. Деревянный мост через р. Полота;
43. Строящийся деревянный мост;
44. Лагерь военнопленных;
45. Место стоянки бронепоезда и воинских эшелонов;
46. Тюрьма;
47. Гараж автомашин.

ЛИТЕРАТУРА


1. Воспоминания Н.А. Маниса // Зональный городской архив в г. Полоцке (ЗГА). – Фонд 1164. – Оп. 25. – Д. 2. – Л. 3.
2. Из письма Н.А. Маниса от 22 января 1985 г. // ЗГА в г. Полоцке. – Фонд 1164. – Оп. 25. – Д. 2. – Л. 19.
3. Манис Н.А. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://local.polotsk.museum.by/node/22735. – Дата доступа: 11.03.2014.
4. Отчёт о боевой деятельности 3-й Белорусской партизанской бригады т. Марченко за период с сентября 1941 г. – по 1 августа 1942 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 1403. – Оп. 1. – Д. 252. – Л. 19.
5. План г. Полоцка с нанесением на него военных объектов от 20 октября 1942 г. // НАРБ. – Фонд 1403. – Оп. 1. – Д. 253. – Л. 4.


*Поступила 27.03.2014*

**THE PLAN, POLOTSK WITH DRAWING ON HIS MILITARY OBJECTS ON OCTOBER 20, 1942 (PLAN N.A. MANISA) AS A SOURCE FOR THE STUDY OF THE NAZI OCCUPATION (1941–1944)**

***A. KORSAK***

*The study of the period of Nazi occupation of Belarus in the framework of local history on the example of cities and towns, at this stage of development of the domestic historiography seems relevant. Moreover, in the absence of direct sources on the topic concerned. This article was first introduced into scientific use of archival documents found in the National archives of the Republic of Belarus. In particular, the original plan, Polotsk on October 20, 1942, N.A. Manisa (one of the underground, Polotsk) with application to him of military and civilian objects and the explanatory note, known before only restored after the war.*

# *ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ*

**УДК 303.442.4(476)“8/11”=161.3**

## АСВЯТЛЕННЕ ІНСТЫТУТА КНЯЖАЦКАЙ УЛАДЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ IX–XII СТАГОДДЗЯЎ У ПІСЬМОВЫХ КРЫНІЦАХ

***Ю.М. КЕЖА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Зроблен аналіз асноўных пісьмовых сярэднявечных крыніц, у якіх асвятляюцца інстытуты ўлады на беларускіх землях “далітоўскага перыяду” (IX–XII стст.). Паводле разгляду старажытнарускіх летапісных і замежных крыніц, хрысціянскіх літаратурных твораў і заканадаўчых матэрыялаў робіцца выснова аб разнароднасці звестак асобных пісьмовых помнікаў у залежнасці ад палітычных, гістарычных і традыцыйна-культурных умоў напісання крыніцы. Сацыяльна-палітычная рэчаіснасць, адлюстраваная ў тэксце крыніцы, абсалютна нехарактэрна для той рацыяналізацыі і сістэматычнасці, якую выкарыстоўваюць пры даследаванні з’яў і працэсаў сучаснага грамадства. Старажытнарускую сацыяльную прастору немагчыма даследваць, не ўлічваючы культурныя і гістарычныя асаблівасці эпохі, умовы напісання тэксту крыніцы, а таксама аксіялагічныя ўстаноўкі і светапогляд аўтара.*

**Уводзіны.** Гісторыя ўсходнеславянскіх зямель перыяду ранняга сярэднявечча адлюстравана ў летапісных паведамленнях, хрысціянскіх літаратурных творах, дакументальных і заканадаўчых матэрыялах, а таксама ў пісьмовых замежыных крыніцах. Пры ўсёй каштоўнасці пісьмовых крыніц па гісторыі Старажытнай Русі відавочны недахоп паведамленняў, прысвечаных гісторыі беларускіх зямель, у прыватнасці тых яе рэгіёнаў, дзе на працягу IX–XIII стагоддзяў пачалі складвацца і развівацца дзяржаўныя ўтварэнні – Полацкае і Тураўскае княствы. Аднак нягледзячы на фрагментарны характар паведамленняў аб гісторыі заходніх зямель дамангольскай Русі, пісьмовыя крыніцы варта лічыць неабходным інфарматыўным матэрыялам пры разглядзе дзяржаватворчых працэсаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы IX–XIII стагоддзяў.

Пры даследаванні працэсу развіцця інстытутаў публічнай улады на землях старажытнай Русі, важнейшыя звесткі прадстаўлены ў летапісах. Пры аналізе паведамленняў, змешчаных у летапісных крыніцах, трэба мець на ўвазе іх тэндэнцыйны і суб’ектыўны характар, які ў асноўным залежыў ад асобы летапісца і замоўца летапісу. У гэтай сувязі даследаванне, прысвечанае сацыяльна-палітычнай гісторыі, патрабуе крытычнага падыходу і ўліку ўмоў, пры якіх летапіс быў напісаны.

**Асноўная частка.** Сярод усіх летапісных крыніц, варта вылучыць важнейшую з іх – “***Аповесць аб мінулых часах***” (АМЧ – *Ю. К.*). Гэты помнік усходнеславянскага пісьменства захаваўся і стаў асновай пазнейшых летапісных зборнікаў: Лаўрэнцьеўскага (1377), Іпацьеўскага (пачатак XV ст.) і Радзівілаўскага (XV ст). Ужо ў недатаванай частцы летапісу аўтар паведамляе пра племянныя княжэнні палян, драўлян, наўгародскіх славен, дрыгавічоў і полацкіх крывічоў [1, с. 7–9]. Такім чынам, аўтар вылучае тыя плямёны, якія, на яго думку, мелі ўласныя княжэнні і вылучаліся больш развітым сацыяльна-грамадскім ладам у параўнанні з іншымі ўсходнеславянскімі плямёнамі. Называючы палянскага князя Кія фактычна родапачынальнікам радавой княжацкай лініі ў палян, аўтар АМЧ таксама звяртае ўвагу на легендарных родапачынальнікаў радзімічаў і вяцічаў – Радзіма і Вятку [1, с. 9]. Верагодна, паведамленне аб гэтых першапродках данесла да нас урыўкі некаторых звязаных з радзімічамі і вяцічамі паданняў, якія існавалі ў кожнага з плямён, і ад імя міфічнага родапачынальніка аўтар выводзіць назву ўсяго племені. Падобная з’ява назіраецца ў датаваным (6488) 980 годам паведамленні аб тураўскім князе Туры [2, с. 3–11].

Пачынаючы з 862 года гісторыя ўсходнеславянскіх зямель у АМЧ ідэалагічна асэнсоўваецца як праўленне роду Рурыкавічаў. З пункту гледжання летапісца, толькі гэты княжацкі род мае спадчыннае права на рускія землі. Летапісец, пачынаючы весці гісторыю дзяржаўнасці на землях усходніх славян з часоў запрашэння Рурыка, паказвае перадачу ўлады ў Старажытнай Русі па адзінай мужчынскай лініі князёў: Рурык – Алег – Ігар – Святаслаў – Уладзімір – Яраслаў. Нашчадкі Яраслава Уладзіміравіча (978–1054) (Яраславічы) асэнсоўваюцца аўтарам “Аповесці” як адзіныя і законныя спадкаемцы яго ўлады. Іх праўленне легітымна абгрунтоўваецца самім фактам прыналежнасці да роду Рурыкавічаў і нашчадкаў Яраслава. Асабліва хваравіта ўспрымаюцца летапісцам міжкняжацкія сутыкненні і войны паміж князямі ўнутры роду Яраслава. У гэтай сувязі прадстаўнікі асобных галін княжацкай дынастыі Рурыкавічаў (Святаполк, полацкія Ізяславічы) разглядаюцца летапісцам або нейтральна, або ў адмоўным ключы.

Полацкая зямля ў старажытнарускіх летапісах разглядаецца як чужая і патэнцыйна варожая. Такі погляд з боку кіеўскага і наўгародскага летапісца на Полаччыну быў перш за ўсё звязаны з адасобленым

праўленнем у Полацку княжацкай дынастыі Рагвалодавічаў [3, с. 21]. У “Аповесці” пад 6488 (980) годам і Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 6636 (1128) годам выкладзена летапісная легенда аб Уладзіміры і Рагнедзе, якая абгрунтоўвае больш чым векавое супрацьстаянне і ўзаемную непрыязнасць полацкіх Ізяславічаў і нашчадкаў Яраслава Уладзіміравіча: “*И оттоле мечь взимають Роговоложи внуци противу Ярославлимъ внукомъ* ” [1, с. 207].

У даследаванні сацыяльна-палітычнай гісторыі Старажытнай Русі АМЧ каштоўная тым, што ў ёй асвятляюцца буйныя палітычныя падзеі старажытнарускіх зямель: міжкняжацкія войны, княжацкія з’езды, пастанаўленні мітрапалітаў і епіскапаў, асобныя падзеі ў княжацкіх сем’ях. Вельмі вялікая роля ў палітычным жыцці адводзіцца царкве. У летапісе асвятляецца дзейнасць княжацкай дружыны і княжацкага апарату кіравання. Некаторыя паведамленні прысвечаны ўдзелу насельніцтва ў палітычным жыцці гарадоў. Даследуючы гэты каштоўны помнік старажытнарускага пісьменства, трэба мець на ўвазе кампілятыўны характар асобных паведамленняў як узораў візантыйскай пісьмовай традыцыі, а таксама легендарны характар асобных артыкулаў.

Паводле даследчыка старажытнарускіх летапісаў А.А. Шахматава, у сярэдзіне XI стагоддзя быў складзены **Наўгародскі летапісны звод**, які істотна адрозніваўся ад кіеўскай галіны летапісання. У сувязі з гэтым даследчык шэраг звестак аб гісторыі Полацка ідэнтыфікаваў як наўгародскія (запісы пад 6488 (980), 6529 (1021), 6552 (1044), 6571 (1063), 6573 (1065), 6574 (1066), 6577 (1067) гг.) [4, с. 127–135]. У кантэксце гэтых паведамленняў Полацк – адзін з галоўных ворагаў Ноўгарада. Гэта датычыцца шэрагу паведамленняў эсхаталагічнага характару, звязанага з полацкім князем Усяславам Брачыславічам (каля 1028–1101 гг.). Пачатак ваеннай дзейнасці гэтага князя супраць Пскова і Ноўгарада, суправаджаўся апісаннем незвычайных прыродных з’яў, якія ў разуменні летапісца нічога добрага не прадвяшчалі. Напрыклад, Наўгародскі I летапіс пад 6571 (1063) годам паведамляе: “*В се же лето в Новегороде идее Волховъ въспять; се же знамение не на добро бысть: на четвертое лето пожьже Всеслав град* ” [5, с. 183–184]. Гэты ж летапіс пад 6573 (1065) годам: “*В се же время бысть знамение на западе: звезда привелика, луце имущи акы кровавы, въсходящи с вечера по заходе солнецьном; пребысть же днии 7. Се же проявляше не на добро…*” [5, с. 184].

Такім чынам, аналізуючы апісанне гісторыі Полацкай зямлі XI стагоддзя ў АМЧ і Наўгародскім першым летапісе, аўтары летапісных твораў успрымалі Полацкае княства як тэрыторыю адасобленую, чужую і незнаёмую [3, с. 21]. Адмоўнае стаўленне да Полаччыны, у параўнанні з Тураўскім княствам, было абумоўлена адасобленасцю роду полацкіх Ізяславічаў ад княжацкай галіны Яраславічаў. Актыўная ваенная дзейнасць Усяслава Брачыславіча супраць Ноўгарада і паўднёварускіх князёў падмацоўвала варожае стаўленне да Полацка з боку наўгародскіх і кіеўскіх летапісцаў. У сваю чаргу, залежнасць Тураўскага княства ў X – першай палове XII стагоддзя ад кіеўскіх князёў і княжэнне ў ім прадстаўнікоў і нашчадкаў кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча (980–1015) і Яраслава Уладзіміравіча адметна не адлюстравалася ў асвятленні яго гісторыі.

Палітычная гісторыя беларускіх зямель XII стагоддзя, дзейнасць асобных палітычных інстытутаў у Полацкім, Тураўскім і Смаленскім княствах адлюстравана ў **Лаўрэнцьеўскім і Іпацьеўскім летапісных зводах** [1; 6]. У летапісах паведамляецца аб грандыёзным ваенным паходзе на Полацк сіл амаль усёй паўднёвай Русі ў 1128 годзе [6, с. 202–203]. Згодна з гэтымі падзеямі ўпершыню гаворыцца пра актыўную дзейнасць палачан у адносінах да свайго князя, што можа сведчыць аб існаванні ў Полацку першай паловы XII стагоддзя веча як пэўнага палітычнага інстытута: “*И тако Полочане сътснувшеси выгнаша Давыда, и съ сыньми поемше Рогъволода идоша къ Мстиславу* (кіеўскаму князю (1125–1132) – *Ю. К.*), *просящее и собе князем, и створи волю ихъ Мстиславъ, и поимше Рогволода ведоша и Полотьску*” [1, с. 206]. Наступнае паведамленне, якое сведчыць аб складаных узаемаадносінах паміж палачанамі і князем, датычыцца 1151 года. У гэтым годзе палачане пазбавілі ўлады Рагвалода Барысавіча, а на яго месца запрасілі менскага князя Расціслава Глебавіча [6, с. 307]. Пад 1159 годам у Іпацьеўскім летапісе паведамляецца аб выгнанні Расціслава і паўторным запрашэнні на полацкі пасад Рагвалода Барысавіча [6, с. 339–340]. Падзеі ў Полацку 20–50-х гадоў XII стагоддзя, зафіксаваныя ў старажытнарускіх летапісах, сведчаць аб моцным крызісе княжацкай улады ў Полацкім княстве і палітычным узмацненні гараджан, што гаворыць аб вялікай ролі веча ў палітычным жыцці Полаччыны. На жаль, летапісы не раскрываюць пытання аб асноўных функцыях веча, яго сацыяльным складзе і перыядзе яго функцыянавання. На падставе асобных паведамленняў, даследчыкамі выдвігаліся пэўныя гіпотэзы, часта супрацьлеглыя, таму гэтае пытанне да сённяшняга дня застаецца адкрытым [7].

У старажытнарускіх летапісах шмат паведамленняў прысвечана Смаленскаму і Тураўскаму княствам. У летапісах змешчаны каштоўныя звесткі аб палітычнай гісторыі Смаленска, асабліва яго росквіту ў другой палове XII стагоддзя. Летапісныя паведамленні сведчаць пра значную ролю ў палітычным жыцці веча на Смаленшчыне ўжо пры дзецях Расціслава Мсціславіча (1108–1167) [6]. У 1186 годзе летапіс паведамляе аб паўстанні смалян: “*Въстань бысть Смоленьске промежи княземъ Давыдомъ и смоляны и много головъ паде луцьшихъ муж*” [6, с. 455]. У дадзеным паведамленні размова магчыма ідзе пра за-

можных гараджан, якія кіруюць вечавым сходам. У XIII стагоддзі роля веча ў Смаленску ўзмацняецца [6]. Аналізуючы летапісную гісторыю Тураўскай зямлі XII стагоддзя, трэба адзначыць, што як зямля, якая бліжэй прылягала да Кіеўскага княства, Тураўшчына да 1113 года кіравалася старэйшымі сынамі кіеўскага князя і, такім чынам, знаходзілася ў прывелеяваным становішчы. Сталае панаванне ў Тураве дынастыі Ізяслава Яраславіча магло сведчыць аб спадчынным валоданні гэтай зямлёй. Паводле паведамлення Іпацьеўскага летапісу, у 1142 годзе Усевалад Ольгавіч (1084–1146), дачыніў да тураўскага княства прынцып старэйшынства і заявіў аб яе прыналежнасці да Кіева [6, с. 215]. Гэты ж летапіс пад 1158 годам паведамляе аб аднаўленні княжацкай дынастыі ў Тураве. У гэты год тураўскі пасад заняў сын Яраполка Святаполчыча, Юрый [6, с. 346]. Такім чынам, з вяртаннем на тураўскі стол нашчадкаў Ізяслава Яраславіча (1054–1073; 1076–1078) самастойнасць Тураўскай зямлі афармляецца канчаткова.

Звесткі пра дзяржаўны лад Полацка XII стагоддзя знайшлі сваё адлюстраванне ў **"Аповесці пра Полацк"**, якая змешчана ў легендарнай частцы **"Хронікі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага"**, другога беларуска-літоўскага зводу. Паводле летапіснай легенды, літоўскі князь Мінгайла пайшоў паходам на Полацк, у бітве разбіў палачан і заняў полацкі стол. Пасля смерці Мінгайлы полацкім князем стаў яго сын Гінвіл. Гэты князь, ахрысціўшыся па праваслаўнаму абраду, стаў "русінам" і прыняў хрысціянскае імя Барыс [8]. Паводле другой рэдакцыі "Аповесці…", у Барыса быў сын Рагвалод-Васіль, а ў таго сын – Глеб і дачка Праскева [9]. Беларускі даследчык Ю.А. Заяц выказаў гіпотэзу аб выкарыстанні аутарам "Аповесці пра Полацк" у якасці крыніцы страчаны Полацкі летапіс [10, с. 85–91]. Варта адзначыць, што паведамленне "Аповесці…" пра заснаванне полацкім князем Барысам горада Барысава на рацэ Бярэзіне знаходзіць адпаведнасць у "Гісторыі Расійскай" В.Н. Тацішчава [11, с. 95]. Паводле М.А. Філіповіч, варыянт генеалогіі літоўскай дынастыі полацкіх князёў змешчаны ў другой рэдакцыі "Аповесці…", можна перанесці на рэальную генеалогію полацкіх Усяславічаў. Гэта, паводле даследчыцы, "і з'яўляецца чарговым аргументам на карысць версіі аб Полацкім летапісе як крыніцы "Аповесці пра Полацк" [3, с. 26]. Варта пагадзіцца з М.А. Філіповіч, бо паведамленне магло захаваць рэшткі народных уяўленняў, дзе за легендарнымі асобамі аўтар бачыў полацкіх князёў XII стагоддзяў.

"Аповесць пра Полацк" даволі змястоўна распавядае пра ўнутраны лад Полацка яшчэ да легендарнага захопу горада літоўскім князем Мінгайлам. Гэта крыніца паведамляе пра панаванне ў Полацку народнага сходу, падобнага на палітычны лад Ноўгарада і Пскова: "*…Новгород Великий, Псков и Полоцк – без княжат почали волно собе жити и князства князей своих сами посели, взявши кшталт справованя Речи Посполитой от оных славных справ грецких афинеов и ляцедемонов…*" [8, с. 29]. У летапісе Рачынскага ўзнікненне моцнага веча ў Полацку адносяць да часоў князя Барыса. "*И пануючи ему в Полоцку был ласкав на подданные свои и дал им волности вечем ся судити и в звон звонити, и по тому ся справовати, як у Великом Новегороде и Пськове*" [9, с. 35]. Дадзенае паведамленне можа адпавядаць гістарычным падзеям першай паловы XII стагоддзя, з улікам таго, што гэтыя звесткі, зафіксаваныя ў XVI стагоддзі, засноўваюцца на вуснай фальклорнай традыцыі, якая магла данесці да нашчадкаў уяўленні аб інстытуце народнага прадстаўніцтва.

Вялікае значэнне для даследавання сацыяльна-палітычнага развіцця ўсходнеславянскіх зямель састаўляюць звесткі, змешчаныя ў арыгінальных літаратурных творах Старажытнай Русі: "Слове аб Законе і Ласцы" кіеўскага мітрапаліта Іларыёна, "Сказанні пра Барыса і Глеба", "Жыціі Феадосія Пячэрскага" "Словах" Кірыла Тураўскага, "Павучэнні" Уладзіміра Манамаха, "Слове пра паход Ігараў", "Памяці і пахвале князю Уладзіміру" Іакава Мніха, "Жыціі Ефрасінні Полацкай". Літаратурныя творы старажытнарускага перыяду каштоўныя перш за ўсё тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне ідэалагічныя пабудовы асэнсавання і легітымізацыі княжацкай улады. У сферы кніжнай ідэалогіі, вобраз улады, у адрозненне ад народных уяўленняў, быў дакладна сфармуляваны і тэарэтычна адпрацаваны. Як адзначае расійскі гісторык В.В. Далгоў, у Старажытнай Русі "кніжная" эліта, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх інтэлектуалаў, выконвала кансалідуючую функцыю і з'ўлялася носьбітам этнічнай своеасаблівасці [12, с. 84]. З другога боку, паколькі ўсходнеславянскія творы былі складзены ў асяроддзі манаства, якое на той час з'яўлялася "інтэлектуальнай элітай" старажытнарускага грамадства, ідэі, прадстаўленыя ў сачыненнях, адлюстроўваюць асэнсаванне княжацкай улады з боку вузкага кола асоб, якія гуртаваліся вакол прадстаўнікоў улады і нярэдка ажыццяўлялі іх заказ.

**"Слова аб Законе і Ласцы"** – адзін з самых старажытных помнікаў усходнеславянскай літаратуры. Твор уяўляе сабой урачыстую прамову кіеўскага мітрапаліта Іларыёна ў сярэдзіне XI стагоддзя. Адно з галоўных месцаў у творы належыць кіеўскім князям Уладзіміру і Яраславу. Апісваючы дзейнасць Уладзіміра Святаславіча ў справе хрышчэння, Іларыён адзначае: "*И не бы ни единого же противящася благочестному его повелению, да аще кто и не любовию, нъ страхом повелевшаага крещаахуся, понеже* ***бе благоверие его съ властию съпряжено***" (тут і далей вылучана мной – *Ю. К.*) [13]. Вылучаючы апошнюю фразу, трэба адзначыць асэнсаванне Іларыёнам улады Уладзіміра як набожнай і ў гэтай сувязі богаабранай. "Дабраахвотнае" хрышчэнне кіеўлян пацвярджае асвячэнне ўлады Уладзіміра Боскай воляй.

Аўтар, апісваючы вялікую заслугу Уладзіміра ў справе хрышчэння Русі, параўноўвае яго з першым рымскім імператарам – хрысціянінам Канстанцінам, а яго бабулю, княгіню Вольгу, з маці Канстанціна – Аленай. Іларыён, прыпісваючы Уладзіміру тыя якасці, якія былі ўласцівы Канстанціну: "*Подобниче великааго Коньстантина, равноумне, равнохристолюбче, равночестителю служителемь его*" [13], тым самым пераносіць яго дзеянні ў справе хрышчэння на Русь: "*Онъ съ материю своею Еленою крестъ от Иерусалима принесъша и по всему миру своему раславъша, веру утвердиста, ты же съ бабою твоею Ольгою принесъша крестъ от новааго Иерусалима, Константина града, и сего по всеи земли своеи поставивша, утвердиста веру.*" [13]. Такім чынам, супастаўленне справы Уладзміра для Русі са справай Канстанціна для грэкаў накіравана на стварэнне канцэпцыі богаабранасці і перанясення сталіцы хрысціянскага свету ў Кіеў, ператварэння яго ў важнейшы сакральны цэнтр хрысціянства.

Паказальна, што пасля супастаўлення Уладзіміра з Канстанцінам Іларыён указвае на прадаўжальніка яго справы, Яраслава Уладзіміравіча, параўноўваючы яго з старазапаветным царом Саламонам. Яраслаў па ўзору яўрэйскага цара пабудаваў храм Святой Сафіі ў Кіеве, як і Саламон пабудаваў вялікі храм у Ерусаліме. Гэта яшчэ раз пацвярджае ідэалагічную накіраванасць канцэпцыі Іларыёна: пераемнасць новай хрысціянскай сталіцы ў справе выратавання чалавецтва – роля, страчаная "ветхім" Іерусалімам. Пасля хрышчэння Русі гэтая ідэя была перанесена на ўсходнеславянскую дзяржаву з мэтай абгрунтавання яе роўнага статуса з Візантыяй [14].

Вялікае дзяржаўна-палітычнае і царкоўнае значэнне ў Старажытнай Русі меў культ Барыса і Глеба. У помніку старажытнарускай літаратуры сярэдзіны XI стагоддзя **"Сказанні пра Барыса і Глеба"** абгрунтоўваецца сакралізацыя нашчадкаў Уладзіміра Святаславіча. Барыс (каля 989–1015) і Глеб (каля 990–1015), з'яўляючыся першымі рускімі святымі і "законнымі" сынамі Уладзіміра згодна з тэкстам "Сказання… " выступаюць святымі заступнікамі правячага роду Рурыкавічаў, нашчадкаў Уладзіміра і Яраслава: "*Родъ правыихъ благословиться, – рече пророкъ, – и семя ихъ въ благословлении будеть*" [15]. Аўтар "Сказання…", апісваючы братазабойства, здзейсненае Святаполкам Яраполчычам (каля 980–1019), робіць асноўны акцэнт на яго грахоўным нараджэнні: "*и бысть отъ дъвою отьцю и брату сущю. Темьже и не любляаше его Володимиръ, акы не отъ себе ему сущю*" [15], тым самым падкрэсліваючы яго "першапачатковую грахоўнасць" і нелегітымнасць праўлення. Згодна з канцэпцыяй аўтара "Сказання…", прыналежнасць Святаполка да лініі Яраполка Святаславіча (праўленне 972–978) не суадносіцца з законнасцю яго права на Кіеўскі пасад.

Акрамя царкоўнага, культ Барыса і Глеба меў важнае палітычнае значэнне. Паводзінамі Барыса і Глеба, якія не паднялі рукі на старэйшага брата нават у абарону свайго жыцця, асвячалася ідэя радавога старэйшынства ў сістэме княжацкай іерархіі: князі, якія не парушылі гэтай запаведзі, сталі святымі. Палітычная тэндэнцыя ўшанавання першых рускіх святых заключалася ў асуджэнні міжкняжацкіх войнаў. У якасці асноўнага сэнсу твора аўтар хацеў данесці ідэю ўмацавання дзяржаўнага адзінства Русі на падставе строгага захавання феадальных узаемаадносін паміж князямі. Усе князі, якія з'яўляюцца нашчадкамі Яраслава Уладзіміравіча, – браты, але старэйшыя павінны абараняць малодшых і заступацца за іх, малодшыя ў сваю чаргу павінны ва ўсіх справах падпарадкоўвацца старэйшым. У гэтай сувязі сэнс твора перагукаецца з "радом Ярослава", які быў складзены перад смерцю кіеўскага князя Яраслава Уладзіміравіча ў сярэдзіне XI стагоддзя.

Цікавай крыніцай пры даследаванні ўзаемаадносін паміж прадстаўнікамі чорнага духавенства (манаства) і вярхоўнай уладай з'яўляецца **"Жыціе Феадосія Пячэрскага"**. Дадзены агеаграфічны твор быў складзены манахам Пячэрскага манастыра Нестарам, які таксама з'яўляўся аўтарам "Сказання аб Барысе і Глебе" і знакамітай "Аповесці аб мінулых часах". У творы даволі выразна адлюстраваны погляд на легтымізацыю ўлады старэйшага прадстаўніка кіеўскага княжацкага дому Яраславічаў. Выказваючы сваю думку аб падзеях выгнання з Кіева ў 1073 годзе Святаславам Яраславічам Чарнігаўскім (1027–1076) і Усеваладам Яраславічам Пераяслаўскім (1030–1093) свайго старэйшага брата Ізяслава, аўтар твора асуджае дзеянні малодшых братоў. Асноўная крытыка і ўкоры Феадосія накіраваны на заняўшага кіеўскі пасад Святаслава: "*Тъгда же отець наш Феодосии напълнивъся святаго духа начатъ того обличати, яко неправьдно сътворивъша и не по закону седъша на столе томь и яко отьця си и брата старѣйшаго прогьнавъша*" [16, с. 55]. Паказальна пры гэтым тое, што на працягу ўсяго твора вобраз кіеўскага князя Ізяслава Яраславіча (1024–1077) паказаны як выключна станоўчы. Ізяслаў у творы называецца як "христолюбивый князь" і адзначаецца добрае стаўленне князя да самаго Феадосія [16]. Паводле твора, Феадосій пасылае князю Святаславу ліст, дзе той у адносінах да Ізяслава параўноўваецца з біблейскім братазабойцам Каінам: "*Се же и послѣже въписа къ нему епистолию велику зѣло, обличаяя того и глаголя: "Глас кръве брата твоего въпиеть на тя къ Богу, яко Авелева на Каина*" [16, с. 56]. Гэтае паведамленне натуральна выказала адмоўную рэакцыю з боку Святаслава, які быў ужо гатовы прымяніць для Феадосія рэпрэсіўныя меры, але, як адзначае аўтар твора, "*Нъ обачеонъ, аще и вельми разгнѣвалъся бѣ на блаженаага, нъ не дьрьзну ни единого же зъла и скърьбьна сътворити тому, видяаше бо мужа преподобьна и правьдьна суща его.*" [16, с. 56]. У гэтым выпадку адносіны князя да манаха выглядаюць як адмоўныя,

але ўсё ж такі паважлівыя. Князь пры ўсім жаданні не можа ўстраніць Феадосія, тым самым прызнаючы яго права даваць маральную адзнаку сваім дзеянням.

"Жыціе Феадосія Пячэрскага" таксама з'яўляецца совеасаблівай крыніцай, дзе адлюстраваны княжацкі быт і правядзенне князем вольнага часу. Вольны час князь праводзіў у весялосці, акружаны музыкамі, на што манах шчыра абураўся: "*И въ единъ от дьний шьдъшю къ тому благому и богоносьному отьцю нашему Феодосию, и яко въниде въ храмъ, идеже бѣ князь сѣдя, и се видѣ многыя играюща прѣдъ нимь: овы гусльныя гласы испущающемъ, другыя же оръганьныя гласы поющемъ, и инѣмъ замарьныя пискы гласящемъ, и тако вьсѣмъ играющемъ и веселящемъся, якоже* ***обычай есть прѣдъ князьмь***" [16, с. 56]. У дадзенай узгадке асаблва адзначаецца, што падобныя паводзіны для князя з'яўляюцца нормай ("*обычай есть прѣдъ князьм*").

Феадосій і ў гэтым выпадку лічыць сваім абавязкам даваць маральна-этычную адзнаку княжацкім дзеянням: "*Блаженый же, бѣ въскрай его сѣдя и долу нича и яко малы въсклонивъся, рече къ тому: "То будеть ли сице на ономь свѣтѣ?" То же ту абие онъ съ словъмь блаженаго умилися и малы просльзиси, повелѣ тѣмъ прѣстати*" [16]. "Жыціе" акрамя маральна-павучальнага характара агульнага тэксту, дае каштоўную інфармацыю па сацыяльнай гісторыі, узаемаадносінам унутры старажытнарускай эліты.

**"Памяць і пахвала князю Уладзіміру"** Іакава Мніха – адзін з найбольш старажытных твораў рускай літаратуры, створаны ў XI стагоддзі. Паводле гіпотэзы А.А. Шахматава, у творы захаваліся паведамленні з летапісу, які папярэднічаў не толькі "Аповесці аб мінулых часах", але і Пачатковаму зводу (канец XI ст.) [4, с. 13 – 28].

Кіеўскі князь Уладзімір на працягу доўгага часу не прызнаваўся святым: яго афіцыйнай кананізацыі пярэчыла грэцкая канстанцінопальская патрыярхія. Аднак шанаванне Уладзіміра як князя-хрысціцеля на Русі існавала ўжо ў XI стагоддзі. Праца Іакава Мніха прадстаўляе менавіта гэтую старажытнарускую тэндэнцыю. Услед за мітрапалітам Іларыёнам Іакаў праслаўляе Уладзіміра як хрысціцеля Русі і "апостола в князех". Заслугі Уладзіміра ў хрышчэнні дзяржавы і раздачы міласціны жабракам выкупаюць у вачах аўтара твора злачынствы князя ў паганскія часы. Жыццё завяршаеца пералікам паходаў і перамог Уладзіміра, які памірае ў набожнасці [17].

Даследчыкі не аднойчы звярталі ўвагу на тое, што "Памяць і пахвала…" складзена пад уплывам "Слова аб Законе і Ласцы" Іларыёна. Так, у творы Іакаў згодна з мітрапалітам Іларыёнам параўноўвае Уладзіміра з Канстанцінам у справе хрышчэння дзяржавы: "*И ты, блаженый княже Володимере, подобно Констянтину Великому дело сътвори, яко оно верою великою и любовью Божиею подвигся*" [17]. Паводле тэксту твора, асноўныя дасягненні князя – хрышчэнне насельніцтва, зніштажэнне язычніцкіх капішч і актыўнае будаўніцтва хрысціянскіх храмаў. У гэтай сувязі дзейнасць па распаўсюджванню хрысціянства Уладзімірам атаясамляецца з дзейнасцю першага хрысціянскага імператара Канстанціна.

Сярод літаратурных твораў старажытнарускага перыяду **"Павучэнне"**, напісанае кіеўскім князем Уладзімірам Манамахам (1053–1125), некаторымі даследчыкамі лічыцца першай свецкай пропаведдзю [18, с. 64]. "Павучэнне" дайшло да нас у складзе Лаўрэнцьеўскага летапіснага зводу (1377) і ўключае тры асноўныя часткі: само "Павучэнне", аповед аб "путях и словах" (аўтабіяграфія) і пісьмо да стрыечнага брата Алега Святаславіча (каля 1053–1115) [1].

У творы Уладзіміра Манамаха знайшлі сваё адлюстраванне разважанні на актуальныя для ранняга рускага сярэднявечча тэмы маральнага і жыццёвага характару. "Павучэнне" ў першую чаргу адрасавана дзецям князя, якія таксама ў будучыні павінны стаць князямі. "Павучэнне" – гэта пажаданне будучай старажытнарускай сацыяльнай эліце, якое складае практычныя парады палітычнага жыцця і княжацкай этыкі. Паводле некаторых даследчыкаў, гэты твор даволі празрыста ўпісваецца ў агульнаеўрапейскі кантэкст. "Для Сярэднявечнай культуры "Павучэне Уладзіміра Манамаха " – рэч вельмі ардынарная, больш таго, нават банальная" [19, с. 269–270]. На думку М.П. Аляксеева, "Павучэнне" служыла свайго роду школьным дапаможнікам, па якім практыкаваліся ў грамаце маладыя прадстаўнікі княжацкіх сем'яў, паралельна засвойваючы нормы маралі, прынятыя ў грамадстве, і атрымліваючы агульныя звесткі аб сваёй будучай справе [20, с. 35–37]. Акрамя гэтага, "Павучэнне" Уладзіміра Манамаха з'яўляецца крыніцай уяўленняў аб праблемах сацыяльнага быцця, праблемах чалавечых каштоўнасцей. У адрозненне ад літаратурных твораў, напісаных прадстаўнікамі духавенства, "Павучэнне" адрозніваецца адсутнасцю ў ім візантыйскай ідэйна-палітычнай спадчыны. Каштоўнасць твора заключаецца ў адлюстраванні менавіта ўсходнеславянскай мадэлі грамадска-палітычнай думкі [12, с. 155–156].

Уладзімір Манамах у творы малюе ідэальны вобраз князя. Пачынаецца твор з характарыстыкі князя сабе: "*Азъ худый* ***дедомъ своимъ Ярославомъ****, благословленымъ, славнымъ, нареченый въ крещении Василий, русьскымь именемь Володимиръ, отцемь възлюбленымь и* ***матерью своею Мьномахы.*** *…*" [21]. Прыніжаючы сябе ў духе хрысціянскай пакоры, Уладзімір Манамах, тым не менш, звяртае ўвагу чытача на сваё паходжанне. Яго дзед – "благословленыи" і "славныи," Яраслаў, па маці, кіеўскі князь вядзе сваё паходжанне ад візантыйскага імператарскага роду Манамахаў. Аналізуючы першыя радкі твора, можна

зрабіць выснову аб тым, што радавітасць у княжацкім родзе – безумоўная каштоўнасць. Каштоўнасць гэта заключаецца ў нараджэнні і прыналежнасці будучага ўладара да княжацкага роду Рурыкавічаў, які меў выключную манаполію на ўладу ў старажытнарускіх землях. У гэтай сувязі ўяўленні аб значнай ролі радавых сувязяў з'яўляюцца аднымі з галоўных у грамадскай свядомасці Старажытнай Русі.

Маральны імператыў, які прапагандуецца Уладзімірам Манамахам, палягае перш за ўсё ў дзеяннях, якія б адпавядалі закону продкаў, г. зн. універсальным нормам права, прынятым у грамадстве. Аналізуючы тэкст "Павучэння", Е.Б. Евароўскі прыходзіць да высновы, што "ва ўмовах феадальнай раздробленасці прытрымліванне законаў продкаў набывала асаблівую актуальнасць пры разбурэнні палітычных сувязяў, узмацненні сіндрому суверэнізацыі нараўне з дамоўным правам, якія актыўна развіваюцца ў гэтую эпоху, агульная памяць аб агульных продках выконвала велічэзную кансалідуючую функцыю ў старажытнарускіх землях" [19, с. 270].

У настаўленні князя сваім дзецям, асобную ўвагу варта звярнуць на яго асабістыя якасці. У адрозненне ад вобраза ідэальнага правіцеля, які склаўся ў візантыйскай грамадска-палітычнай думцы, князь Старажытнай Русі павінен выконваць працу сам ва ўзор іншым: *"В дому своем не ленитесь, но за всем сами наблюдайте; не полагайтесь на тиуна или на отрока, чтобы не посмеялись приходящие к вам, ни над домом вашим, ни над обедом вашим. На войну выйдя, не ленитесь, не полагайтесь на воевод; ни питью, ни еде не предавайтесь, ни спанью; сторожей сами наряживайте, и ночью, расставив стражу со всех сторон, около воинов ложитесь, а вставайте рано; а оружия не снимайте с себя второпях, не оглядевшись по лености, внезапно ведь человек погибает."* [21]. Акрамя асабістага ўмення, ідэальны князь, на думку Манамаха, павінен валодаць якасцямі, якія яго характарызуюць як узорнага хрысціяніна. Гэта клопат аб жабраках, прыхільнасць клятве, дадзенай на крыжы, павага да прадстаўнікоў духавенства і захаванне Божых запаведзяў [21].

Вяршыняй мастацкай сярэднявечнай літаратуры лічыцца твор **"Слова пра паход Ігараў"**, напісаны ў канцы XII стагоддзя. Урывак са "Слова..." пра міжусобіцы полацкіх князёў насычаны, як і ўвесь твор, паэтычнымі абагульненнямі і вобразамі. Тут ахоплены два перыяды з гісторыі Полацкай зямлі: часы князя Усяслава Брачыславіча (другая палова XI ст.) і перыяд княжацкіх міжусобіц на Полаччыне ў XII стагоддзі [22].

Паводле гісторыка-лінгвістычных даследаванняў, Г.В. Сумарукавым было выказана меркаванне аб магчымым аўтары "Слова" – полацкай княгіне Марыі Васількаўне, жонцы кіеўскага князя Святаслава Усеваладавіча [23]. У творы вялікі раздзел прысвечаны апісанню падзей, якія адбываліся ў Полацкай зямлі. "Полацкі раздзел" займае адну дзесятую частку твора. Пачынаецца апісанне падзей з гісторыі Полаччыны паведамленнем – устаўкай аб князе Ізяславе Васількавічы, які змагаўся на заходніх межах Полацкай зямлі з літоўцамі і там знайшоў сваю смерць. Пра князя Ізяслава Васількавіча не паведамляецца ў летапісах, але, верагодна, ён быў братам Марыі Васількаўны, і звестка аб ім у "Слове" яшчэ раз пацвярджае аўтарства полацкай княгіні. З кароткага апісання гібелі Ізяслава ў бітвах з літоўскімі плямёнамі мы даведваемся аб адным з полацкіх князёў, які быў невядомы летапісцам, або складальнікі летапісу свядома не звярталі ўвагу на гэтую асобу полацкай гісторыі.

Асобная ўвага ў "Слове" належыць полацкаму князю Усяславу Брачыславічу. Гэты полацкі князь, разам з Алегам Святаславічам з'яўляецца пачынальнікам шматлікіх усобіц у рускай зямлі. У гэтай сувязі паведамленне, якое датычыцца Ізяслава Васількавіча: *"Единъ же Изяславъ, сынъ Васильковъ, позвони своими острыми мечи о шеломы литовьскыя,* ***притрепа славу деду своему Всеславу****, а сам подъ чрълеными щиты на кровавее траве притрепанъ литовскыми мечи…"* [22, с. 86], сведчыць аб выкупленні князем мінулай благой славы свайго дзеда Усяслава. У апісанні падзей, звязаных з полацкім князем Усяславам, паведамляецца аб яго прэтэнзіях на авалоданне кіеўскім вялікакняжацкім сталом: "*На седьмом веце Трояни* ***връже Всеславъ жребий о девицю себе любу*** (Кіеў – *Ю. К.*). *Тъй клюками подпръ ся о кони и скочи къ граду Кыеву и дотчеся стружиемъ злата стола киевьскаго"* [22, с. 88]. Такім чынам, нягледзячы на пэўную ізаляванасць полацкай княжацкай дынастыі па прычне смерці старэйшага сына Уладзіміра Святаславіча Ізяслава раней за бацьку (у 1001 г.), асобныя полацкія князі (у прыватнасці Усяслаў Брачыславіч) не пакідалі прэтэнзій на Кіеў.

Адным з найбольш адметных узораў старажытнарускай агіяграфічнай літаратуры з'яўляецца "**Жыціе Ефрасінні Полацкай**", напісанае ў канцы XII – першай палове XIII стагоддзя. Першапачатковы варыянт тэксту не захаваўся, але на сённяшні момант налічваецца каля 150 спісаў XVI–XVIII стагоддзяў, што сведчыць аб значнай папулярнасці дадзенага твора. Вобраз галоўнай гераіні ідэялізаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі да агульных законаў агіяграфіі. Стваральніка твора ў першую чаргу цікавілі не рэальныя падзеі з жыцця Ефрасінні і яе акружэння, а тое агульнае, у чым, на думку аўтара, выяўлялася богаабранасць і святасць Ефрасінні. Тым не менш для даследавання палітычнай гісторыі Полацкага княства гэты твор каштоўны тым, што ў ім знайшлі адлюстраванне вобразы самой Ефрасінні Полацкай, яе бацькі, братоў, царкоўных іерархаў, таксама твор яскрава адлюстроўвае асаблівасці менталітэту і духоўных каштоўнасцей эпохі.

Ужо ў прадмове твора ідзе пералічэнне тых, каму гэтыт твор адрасаваны:*"Вы же, блазии послушници,* ***князи и боляре, и церковници, и честнии собори святых, сущии в манастырех, и простии люди****, снидетеся на новое сие слышание и послушайте прилежно…"* [24]. Такім чынам, у пачатку твора, у пераліку тых, да каго звяртаецца аўтар, адлюстроўваецца пэўная сацыяльная структура грамадства Полацкай зямлі. У пачатку твора аўтар звяртае ўвагу на радавод Ефрасінні. Яна была дачкой Святаслава-Георгія, сына славутага полацкага князя Усяслава Брачыславіча: *"Бысть князь в граде Полотсце именем Всеслав, той имея сыновы многы. И беше у него* ***меньший сын именем Георгий****, от него же родися сии блаженнаа отроковица."* [24].

Даследуючы палітычную гісторыю Полаччыны, з гэтага паведамлення можна даведацца аб старэйшынстве сыноў Усяслава і прыблізнай расстаноўцы сіл у іх дынастычнай барацьбе пасля смерці бацькі. Паказальна, што бацька Ефрасінні, Святаслаў-Георгій, у Жыціі названы князем Полацкім [24]. Аднак гэта не сведчыць аб тым, што ўдзелам Святаслава быў Полацк – галоўны горад княства. Гэты князь не мог займаць галоўны полацкі пасад па прычыне таго, што ён згодна з творам быў меньшым сынам Усяслава. У гэтай сувязі, аналізуючы паведамленне, дзе Святаслаў-Георгій названы полацкім князем, варта зрабіць выснову аб існаванні ў Полацку некалькіх князёў. Полацк фактычна з'яўляўся горадам-дзяржавай, і таму яго прыгарады (якія маглі знаходзіцца на значнай адлеглясці ад Полацка) знаходзіліся ў прамой залежнасці ад галоўнага горада княства. У гэтай сувязі найменне "Полацкія" насілі князі незалежна ад таго, дзе знаходзіліся вотчыны прадстаўнікоў дынастыі Ізяславічаў [25, с. 18].

Пры даследаванні сацыяльна-палітычнай гісторыі старажытнарускага перыяду значны інтарэс прадстаўляе паведамленне аб пачатку Полацкага манастыра Святога Спаса. Перад пачаткам будаўніцтва прысутнічалі "галоўны" полацкі князь Барыс, бацька Ефрасінні, Святаслаў, полацкі епіскап і баяры [24]. Перадача Сельца (якое з'яўлялася епіскапскай воласцю) [25, с. 32] для пабудовы манстыра, з'яўлялася значнай цырымоніяй, на якую епіскапам былі запрошаны Святаслаў (як бацька Ефрасінні – будучай намесніцы манастыра) і яго брат Барыс Усяславіч у якасці правячага полацкага князя, якому разам з прадстаўнікамі арыстакратыі (баярамі) належала права адабрэння падобных мерапрыемстваў.

Таксама ў тэксце Жыція ёсць паведамленне, з якога варта зрабіць выснову аб міратворчай і ўнтрыпалітычнай дзейнасці Ефрасінні: *"Тако бо бяше дан дар сей блаженной Еуфросинии от Бога, аще кто яе въпрошаше о коей вещи, она ему разрешаше, чему быти, и кто ея послушаше, той добро получаше, не бо хотяше видети кого которающася: ни князя со князем, ни болярина з болярином, ни от простых кого со своим другом, но всех хотяше имети, яко едину душу"* [24]. На думку А.А. Мельнікава, можна меркаваць аб існаванні ў Полацку, акрамя княжацкага і епіскапскага суда, суда манастырскага [25, с. 49]. Згодна з царкоўнай службай Ефрасінні яна: *"Князем сродником, друг на други дерзающим подъяти меч,* ***возбранила еси****, яко оружием обоюдоострым, пресекающим,* ***словом Божиим устрашающим****"* [25, с. 49]. Адсюль можна зрабіць выснову аб удзеле Ефрасінні ва ўнутрыпалітычным жыцці Полацкага княства, дзе яна выконвала ролю трацейскага суддзі паміж малодшымі полацкімі князямі. Разам з тым наяўнасць у Ефрасінні дзяржаўнай адміністрацыйнай пячаткі і факт знаходкі другой пячаткі, уладальнікам якой была жанчына-манахіня з манастыра Святога Спаса, дазваляе некаторым даследчыкам гаварыць аб канцэнтрацыі палітычнай улады ў Полацку ў руках Ефрасінні падчас высылкі полацкіх князёў у Візантыю (1129–1140) [26; 27]. Такім чынам паводле аналізу "Жыція Ефрасінні Полацкай" можна зрабіць пэўныя высновы аб палітычнай гісторыі Полаччыны першай паловы XII стагоддзя, яе сацыяльнай іерархіі і міжкняжацкіх адносінах унутры роду Ізяславічаў.

Вялікую каштоўнасць для старажытнарускай літаратурнай традыцыі прадстаўляюць творы **Кірыла Тураўскага** (1130 – каля 1180). Прысвяціўшы сябе духоўнаму жыццю, з'яўляючыся манахам, Кірыл выступаў са сваімі прамовамі публічна і такім чынам уключаўся ў ідэалагічную і палітычную барацьбу таго часу. У сваёй дзейнасці Кірыл выступаў на баку тураўскага князя Юрыя Яраславіча (каля 1112–1168). Менавіта па ініцыятыве гэтага князя Кірыл стаў тураўскім епіскапам (1169–1182). Сярод усіх твораў Кірылы Тураўскага найбольш распаўсюджанымі жанрамі з'яўляюцца публіцыстычная ("беседа") і аратарская ("словы") проза.

**"Прытча аб чалавечай душы і целе"** – апакрыфічная прытча, дзе разглядаюцца філасофскія праблемы суаднясення духоўнага і цялеснага, нябеснага і зямнога, свецкага і царкоўнага. Адной з асноўных мэт апавядання з'яўляюцца публіцыстычныя развагі аб узаемаадносінах свецкай і духоўнай улады, якія былі актуальнымі ў тыя часы. У творы ў алегарычнай форме прысутнічаюць дзеючыя асобы: сляпец, храмец, бесы, анёлы. Шэраг асоб не названыя па імёнах, але ў зашыфраваным выглядзе добра вядомы сучаснікам: Андрэй Багалюбскі ("храмец") і Уладзімірскі епіскап Фёдар ("сляпец") [28]. Сваім творам Кірыл Тураўскі асуджае палітыку Уладзімірскага князя Андрэя Юр'евіча Багалюбскага і епіскапа Фёдара. Уладзімірскі епіскап Фёдар пры падтрымцы Андрэя Багалюбскага заняў Уладзіміра-Суздальскую кафедру і паспрабаваў аддзяліцца ад кіеўскай мітраполіі. Кірыл, такім чынам, выступіў з асуджэннем дзейнасці ўладзімірскага князя і яго епіскапа, параўноўваючы іх з душой ("сляпец") і цела ("храмец"), якія переступілі Боскія запаведы і паплаціліся за гэта [28]. Інтарэс у асвятленні праблем узаемаадносін свецкай і

царкоўнай улады прадстаўляе апавяданне **“Повесть о белоризце и о мнишестве”** [29]. Галоўны сэнс “Аповесці” заключаецца ў праслаўленні “патаённага” жыцця – манаства. Згодна з асноўным зместам твора выразна прасочваецца ідэя прыярытэту духоўнай улады над свецкай.

Паводле аналізу літаратурных твораў Старажытнай Русі, трэба зрабіць выснову аб інфарматыўнай каштоўнасці гэтых крыніц у асвятленні легітымізацыі княжацкай улады. Аўтары твораў, якія, за асобнымі выключэннямі, з’яўлаліся прадстаўнікамі духавенства, асэнсоўвалі ролю князя і княжацкай улады ў Старажытнай Русі з пазіцыі хрысціянскага светапогляду. Акрамя непасрэдна ідэалагічнага складніка, у старажытнарускіх летапісных творах прысутнічае інфармацыя аб палітычнай гісторыі ўсходнеславянскіх (беларускіх) зямель, міжкняжацкіх узаемаадносінах і сацыяльнай іерархіі старажытнарускага грамадства.

Замежныя наратывы, якія адлюстроўваюць працэсы заражэння і развіцця першых інстытутаў улады на землях Усходняй Еўропы прадстаўлены візантыйскімі, заходнееўрапейскімі, усходнімі (мусульманскімі) і скандынаўскімі крыніцамі. Фрагменты замежных крыніц, якія датычацца паведамленняў пра ўсходніх славян і гісторыю Старажытнай Русі з V па XIII стагоддзе, паходзяць з розных гісторыка-культурных рэгіёнаў і таму адлюстроўваюць погляд на гісторыю Усходняй Еўропы скрозь своеасаблівую прызму культурнай традыцыі, да якой належаў аўтар.

Першыя творы, дзе адбываецца фіксацыя грамадскай арганізацыі і сацыяльнага ладу германцаў часоў правадырства, якіх тыпалагічна можна параўнаць з славянскімі плямёнамі V–VIII стагоддзяў, паходзяць з антычных часоў. Рымскі гісторык **Публій Карнелій Тацыт** (I ст. н. э.) у **“Аналах”** зафіксаваў асаблівасці вайсковай арганізацыі германцаў: “*Венеты перайнялі шмат з іх нораваў* (германцаў – *Ю. К.*), *бо з-за драпежніцтва ходзяць па лясах і гарах... Аднак іх хутчэй можна далучыць да германцаў, таму што яны будуюць сабе дамы, носяць шчыты і перамяшчаюцца пешшу*” [30].

Цэнтральнай фігурай ранневізантыйскай гістарыяграфіі з’яўляецца **Пракопій Кесарыйскі** (каля 500–560-х гг.), які даносіць да нас унікальныя звесткі аб старажытных славянах – склавінах і антах. Каштоўнасць паведамленняў Пракопія Кесарыйскага абумоўлена тым, што апісаныя ім землі, норавы і звычаі “варварскіх” народаў ён бачыў уласна. Такім чынам, у творах выразна захаваны эфект “аўтарскай прысутнасці”. У творы **“Вайна з готамі”** Пракопій паведамляе пра грамадскі лад і побыт славянскіх плямёнаў: “*Плямёны ж гэтыя, склавіны і анты не падпарадкоўваюцца аднаму чалавеку, але спрадвеку жывуць у народаўладдзіі* (дэмакратыі), *і таму ўсе выгодныя і невыгодныя справы ў іх заўсёды вядуцца разам*” [31]. Дадзенае паведамленне дало падставу многім гісторыкам сцвярджаць аб наяўнасці ў ранніх славян абшчыннага самакіравання ў выглядзе вечавых сходаў, якія захавалі сваю моц і ў значна пазнейшыя часы. Але тэрмін “дэмакратыя”, які выкарыстоўвае Пракопій, не тоесны разуменню сістэмы ўлады, якая існавала ў антычных полісах, што прадугледжвала ўдзел у грамадскім жыцці ўсіх свабодных жыхароў. Верагодна, тэрмінам “народаўладдзе” аўтар супрацьпастаўляе структуру ўлады славянскіх плямёнаў візантыйскай манархіі і вярхоўнай імператарскай улады хрысціянскага ўладара.

Пракопій Кесарыйскі даволі падрабязна апісвае лад жыцця і прынцып рассялення ранніх славян: “*Імя даўней у склавінаў і антаў было адно. Бо і тых і іншых спрадвеку звалі “спорамі”, як раз з-за таго, што яны засяляюць краіну, раскідана размясціўшы сваё жыллё. Менавіта таму яны і займаюць неймаверна вялікую тэрыторыю*” [31]. Назва “споры”, якая звязваецца аўтарам з пэўным славянскім племенем, цесна звязана з ладам жыцця і сістэмай рассялення качавых і полукачавых народаў, перш за ўсё гунаў. У дадзеным выпадку яскрава вылучаецца супрацьпастаўленне візантыйцаў, цівілізаванага народа, які пражывае кампактна на дакладна вызначанай тэрыторыі, і найменне “споры” ў сэнсе “рассеяныя”, качавыя варварскія народы, да якіх аўтар адносіць славян.

З канца VI стагоддзя паходзіць выбітны твор **“Стратэгікон”** візантыйскага імператара **Маўрыкія** (539–602 гг.). У “Стратэгіконе” адлюстраваны этналагічныя характарыстыкі “варварскіх народаў” – асноўных ваенных супернікаў Візантыі. У творы даецца падрабязная характарыстыка баявога майстэрства персаў, “скіфаў”, франкаў, лангабардаў, а таксама антаў і склавінаў. Вельмі важным для даследавання сацыяльнай структуры раннеславянскіх аб’яднанняў зяўляецца апісанне грамадскага ладу, побыту і нораваў “варварскіх народаў”. Каштоўным у творы з’яўляецца сведчанне аб наяўнасці ў славян племянных правадыроў, альбо ўладароў межплемянных аб’яднаняў: “*Паколькі ў іх шмат правадыроў і яны не згодныя адзін з адным, нялішне некаторых з іх прыбраць да рук з дапамогай прамоваў або дароў…*” [32]. У гэтай сувязі фрагментарнае паведамленне Маўрыкія аб грамадскім ладзе славян нагадвае пратраннае апісанне Тацытам прадстаўнікоў племяннай улады ў германскіх плямёнаў I ст. н. э.: “*Цароў яны выбіраюць з найбольш знатных* (прадстаўнікоў родаплямяннай арыстакратыі – *Ю. К.*), *правадыроў – з найбольш доблесных. Але і цары не валодаюць у іх бязмежнай і непадзельнай магутнасцю, **і правадыры ўладараць над імі*** (вылучана мной – *Ю. К.*), *хутчэй захапляючы прыкладам і выклікаючы іх захапленне, калі яны рашучыя, калі выдаюцца вартасцямі, калі ваюють заўсёды наперадзе, чым нададзеныя сапраўднай уладай.*” [30]. Такім чынам аналізуючы працэс зараджэння вярхоўнай улады ў раннеславянскіх аб’яднанняў VI–VII стагоддзяў варта выказаць меркаванне аб пэўным тыпалагічным падабенстве феномена правадырства ў славян і германскіх плямёнаў пачатку нашай эры.

У цэнтры гістарычных падзей візантыйскага гісторыка **Феафілакта Сімакаты** (каля 580 – пасля 641 г.) – апісанне ваенных сутыкненняў Візантыі са славянскімі плямёнамі, якія прыйшлі на Балканы ў VI–VII стагоддзях. У творы **"Гісторыя"** ў адносінах да вярхоўнага ўладара славян ужываецца хазарскі тэрмін "хакан" [33], што, верагодна, мае гістарычную аснову перыяду найбольшай актыўнасці хазараў у паўднёва-рускіх стэпах VII– IX стагоддзяў. Але хучэй за ўсё пад гэтым тэрмінам прадугледжваецца найменне вярхоўнага ўладара авар, у войска якога ўваходзілі славяне. У цэлым твор "Гісторыя" з'яўляецца больш літаратурнай працай, чым факталагічным апісаннем, што абумоўлівае шмат недакладнасцей і памылак аўтара.

Каштоўныя звесткі па гісторыі Старажытнай Русі першай паловы X стагоддзя змешчаны ў творы візантыйскага імператара **Канстанціна Парфірароднага** (905–959) **"Аб кіраванні імперыяй"**. Канстанцін з'яўляўся сучаснікам апісаных ім галоўных палітычных падзей першай паловы X стагоддзя, такіх як паходы кіеўскіх князёў Алега і Ігара на Канстанцінопаль, вынікам чаго сталі першыя пісьмова зафіксаваныя руска-візантыйскія дамовы 911 і 944 гадоў, змешчаныя ў АМЧ. Сярод дыпламатычнай дзейнасці імператара Канстанціна, важнае месца належыць прыёму ў Канстанцінопалі пасольства кіеўскай княгіні Вольгі, якое было адлюстравана ў творы **"Аб цэрымоніях візантыйскага двара"** [34].

Адной з галоўных інфарматыўных крыніц па гісторыі Усходняй Еўропы, з'яўляецца трактат "Аб кіраванні імперыяй". Аўтар трактату аналізуе ваенна-палітычны патэнцыял Русі ў кантэксце яе ўзаемаадносін з Візантыяй. Дзевятая глава трактата прысвечана апісанню галоўнага гандлёвага маршруту Усходняй Еўропы – шляху "З варяг у грэкі". У гэтым кантэксце пералічваюцца буйныя рускія гарады: Ноўгарад, Смаленск, Любеч, Чарнігаў, Вышгарад, Кіеў, Віцічаў. Таксама называюцца рускія князі – Ігар і Святаслаў [35]. Адсутнасць Полацка ў пераліку галоўных гарадоў Русі, якія, як вынікае з тэксту, знаходзіліся пад уладай кіеўскіх князёў, можа сведчыць аб неўключэнні горада ў сістэму ўлады Кіева ў першай палове X стагоддзя.

Канстанцін Парфірародны падрабязна распавядае пра ўзаемаадносіны княжацкай дружыны – "росаў" (пераважна скандынаваў) з славянскім насельніцтвам розных племянных тэрыторый. У трактаце Канстанціна тэрыторыя Русі падзелена на "Русь Знешнюю" (Наўгародская зямля) і Русь у вузкім сэнсе (тэрыторыя збора даніны кіеўскім князем). Апісваючы працэс збора даніны (палюддзя), Канстанцін акрэслівае прыблізную тэрыторыю кругавога аб'езду князя падуладных яму зямель: "*Зімовы ж і суровы лад жыцця росаў такі. Калі наступіць ліstапад месяц, адразу іх архонты выходзяць з усімі росамі з Кіева і адпраўляюцца ў палюддзе, што называецца "кружэннем", а менавіта ў Славініі вервіянаў, дрыгувітаў, крывічоў, северыяў і іншых славян, якія з'яўляюцца пактыётамі росаў. Яны харчуюцца там на працягу ўсёй зімы, потым яны зноў, пачынаючы з красавіка, калі растае лёд на рацэ Дняпры, вяртаюцца ў Кіеў*" [35]. У гэтым паведамленні ўзгадваецца племяннае аб'яднанне крывічоў, падуладнае кіеўскаму князю, але поўнасцю адсутнічаюць звесткі аб Полацку і Полацкай зямлі. Так, аналізуючы паведамленні аб тэрыторыі Русі, Полацк быў альбо невядомы візантыйскаму імператару, альбо ён не ўваходзіў у склад уласна "Русі" ў вызначэнні Канстанціна.

Важнай крыніцай у асвятленні падзей, якія адбываліся на беларускіх землях у пачатку XI стагоддзя, з'яўляюцца звесткі, змешчаныя ў **"Хроніцы" Цітмара Мерзебургскага** (975–1018), епіскапа мерзебургскай кафедры, набліжанага германскага караля Генрыха II. Асаблівая каштоўнасць хронікі палягае ў паведамленні пра падзеі старажытнарускай гісторыі канца княжэння Уладзіміра Святаславіча і міжусобнай барацьбы за ўладу паміж яго сынамі. У старажытнарускіх творах дадзеныя падзеі асвятляюцца згодна з агіяграфічнымі канонамі і ў большай ступені звязаны з ранняй кананізацыяй святых Барыса і Глеба, што пагаршае іх каштоўнасць як гістарычных крыніц. Адметнасць хронікі Цітмара і адрозненне яе ад іншых крыніц па старажытнарускаму перыяду палягае ў тым, што тэкст "Хронікі" дайшоў да нас у аўтарскім арыгінале. Асабліва важныя для гісторыі Русі паведамленні 1013–1018 гадоў былі напісаны непасрэдна "па слядах" апісаных падзей, што з'яўляецца паказчыкам пэўнай даставернасці аўтарскіх звестак.

"Хроніка" Цітмара з'яўляецца амаль адзінай крыніцай, з якой мы даведваемся аб матрыманіяльным саюзе паміж тураўскім князем Святаполкам і дачкой польскага караля Баляслава I. Таксама ў крыніцы паведамляецца аб спробе Святаполка, абапіраючыся на зяця Баляслава пры падтрымцы калабжэгскага (каталіцкага) епіскапа Рэйнберна, здзейсніць супраць свайго бацькі (паводле "Хронікі" – *Ю. К.*) Уладзіміра нейкую замову: "*Згаданы кароль* (кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч – *Ю. К.*), *даведаўшыся што яго сын па падгаворванні Балеслава мае намер таемна супраць яго выступіць, схапіў таго біскупа* (Рэйнберна – *Ю. К.*) *разам са сваім сынам і яго жонкай* (Святаполка – *Ю. К.*) *і заключыў у цямніцу, кожнага паасобку*" [36]. Некаторыя беларускія даследчыкі бачаць у гэтых дзеяннях спробу тураўскага князя, абапіраючыся на падтрымку польскага караля Баляслава і каталіцкай царквы, стварыць падмурак для адасобленага існавання Турава ад Кіева [37, с. 13; 38, с. 172]. Але прыблізна ў гэты ж час (1014–1015), паводле АМЧ, супраць Уладзіміра паўстае яго другі сын, наўгародскі князь Яраслаў, што, магчыма, было выклікана планамі Уладзіміра на конт размеркавання вярхоўнай кіеўскай спадчыны, а менавіта перадачы Кіева Барысу.

У "Хроніцы" таксама змешчана паведамленне аб падзеях, якія не асветлены ў старажытнарускіх крыніцах. Паведамленне датычыцца нейкай ваеннай акцыі канца 1017 – пачатку 1018 года Баляслава су-

праць кіеўскага князя Яраслава Уладзіміравіча: “*…кароль Русі* (Яраслаў – *Ю. К.*) *напаў на Баляслава, але, авалодаўшы горадам, нічога больш там не дамогся. Названы князь* (Баляслаў – *Ю. К.*) *уварваўся затым з войскам у яго каралеўства,* ***узвёў на прастол*** *яго брата, і свайго зяця* (Святаполка – *Ю. К.*), *які доўга знаходзіўся ў выгнанні, і задаволены вярнуўся”* [36]. Паводле тэксталагічнага аналізу “Хронікі”, праведзенага А.В. Назарэнка, мэтай паходу польскага караля было Бярэсце: “менавіта Бярэсце – заходні фарпост уладанняў Святаполка яшчэ ў бытнасці яго на тураўскім стале – урачыста называецца “прастол”, на які польскі князь узвёў свайго рускага зяця” [39, с. 460–470].

Паказальна, што Святаполк у хроніцы двойчы названы тытулам сеньёра (senior), тады як у адносінах да Уладзіміра і Яраслава ўжываецца тытул кароль (rex) [36]. Паводле заходнееўрапейскай лацінамоўнай традыцыі пад тытулам “senior” (гаспадар) меўся на ўвазе ўладальнік сіньёрыі – тэрытарыяльнага ўтварэння, у межах якога, функцыі гаспадарчага і юрыдычнага кіравання замацоўваліся за пэўнай асобай (юрыдычнай альбо духоўнай), якое пры гэтым не абавязкова надзялялася непасрэднымі правамі суверэна (незалежнага ўладара). У кантэксце паведамленняў пра падзеі 1016–1018 гадоў, дзе ўскосна адлюстраваны пэўныя дамаганні Баляслава на Кіеў, сумесныя дзеянні Святаполка і Баляслава могуць разглядацца як патранат апошняга над былым тураўскім князем і вяртанне яму “тураўскіх уладанняў” (уключаючы і адваяванае Берасце) у якасці сіньёрыі (Seigneurie). Таксама нельга адмаўляць пэўныя палітычныя сімпатыі Цітмара да Яраслава Уладзіміравіча – праціўніка Баляслава І, у якім храніст бачыць галоўнага суперніка германскага імператара Генрыха ІІ на ўсходзе [39, с. 478].

Важнай крыніцай у даследаванні міжусобнай барацьбы паміж Святаполкам і Яраславам у пачатку ХІ стагоддзя з’яўляецца **“Хроніка і дзеянні польскіх князёў”** польскага храніста **Гала Ананіма** (канец ХІ – пачатак ХІІ ст.). У творы праслаўляецца і ўзвялічваецца дзейнасць польскіх князёў, у тым ліку і аднаго з асноўных дзеючых асоб барацьбы паміж Святаполкам і Яраславам – Баляслава І Хараброга. У творы падкрэсліваецца падпарадкаванае становішча старажытнарускіх замель да Польшчы. Так, пасля бітвы на Буге, калі войска Яраслава пацярпела паразу, храніст адзначае: “*З тых часоў Русь надоўга стала даніцай Польшчы*” [40]. Пасля таго як Баляслаў авалодаў Кіевам, ён, паводле “Хронікі”, “паставіў” уладаром у Русі Святаполка: “*Але так як ён кіраваў вялікім мноствам каралеўстваў і ведаў, што яго сын Мешка яшчэ няздольны кіраваць, на адзінаццаты месяц ён паставіў там замест сябе кіраўніком нейкага* ***русіна з свайго роду*** (Святаполка – *Ю. К.*) *і з пакінутай казной рушыў у Польшчу.*” [40]. Такім чынам дадзенае паведамленне ўскосным чынам пацвярджае звесткі Цітмара Мерзенбургскага аб матрыманіяльным саюзе паміж Святаполкам і Бяляславам І. Далей храніст паведамляе пра падзеі, якія даюць ускосную падставу меркаваць аб удзеле ў канфлікце полацкага князя Брачыслава Ізяславіча: “*У той час як ён* (Баляслаў – *Ю. К.*) *з вялікай радасцю і багаццем вяртаўся і ўжо набліжаўся да межаў Польшчы, за яго спіной ішоў кароль Русі* (Яраслаў – *Ю. К.*), *сабраўшы* ***сілы рускіх князёў****, а таксама полаўцаў і печанегаў.*” [40]. Калі паведамленне пра полаўцаў выглядае як яўны анахранізм, то пад “сіламі рускіх князёў” можна бачыць Брачыслава Ізяславіча, альбо кагосці з малодшых Уладзіміравічаў, нягледзячы на тое, што старажытнаруская пісьмовая традыцыя не адзначае пра іх удзел у міжусобіцы [41, с. 170].

Твор Гала Ананіма належыць да ліку тыпічных княжацкіх апавяданняў, дзе выразна ўхваляюцца вобразы польскіх князёў, а вобразы князёў-апанентаў прыніжаюцца. “Хроніка” Ананіма складзена ў пачатку ХІІ стагоддзя, амаль праз сто год пасля апісаных падзей. Акрамя таго, значна зніжае гістарычную каштоўнасць твора панегерычны характар паведамленняў без дакладных дат, імён і назваў, што ўскладняе атаясамленне асобных звестак з канкрэтнымі гістарычнымі падзеямі і асобамі.

Сярод замежных крыніц па гісторыі Старажытнай Русі ІХ–ХІІІ стагоддзяў, асаблівую значнасць для даследчыка маюць скандынаўскія пісьмовыя помнікі, якія ўключаюць геаграфічныя творы, скальдычныя вершы, рунічныя каменныя надпісы і сагі. Сярод скандынаўскіх наратыўных крыніц пры даследаванні палітычных падзей Усходняй Еўропы першай паловы ХІ стагоддзя ўнікальную каштоўнасць уяўляе **“Пасма аб Эймундзе”**, якая захавалася ў складзе “Сагі аб Олафе Святым”. Даследчыкі адносяць твор да каралеўскіх саг. “Пасма аб Эймундзе” ўнікальна тым, што ўсе падзеі, апісаныя ў ёй адбываюцца на Русі (Гардарыкі). У гэтым творы падрабязна апісана дзейнасць скандынаўскіх наймітаў на Русі і ключавых асоб твора: Яраслава, Святаполка і полацкага князя Брачыслава. Напісанне “Пасмы” большасцю даследчыкаў адносіць да ХІІІ стагоддзя, што прыўносіць у твор шмат пазнейшых напластаванняў, грубых гістарычных недакладнасцей і неадпаведнасцей з іншымі крыніцамі.

У пачатку твора ідзе паведамленне аб расстаноўцы сіл на Русі паміж трыма “сынамі” Уладзіміра Святаславіча: Бурыцлейвам, Ярыцлейвам і Вартылавам [42]. Традыцыйна конунга Бурыцлейва трактуюць як зборны вобраз асноўных ворагаў Яраслава – Святаполка і Баляслава І Хараброга. Вартылаў атаясамляецца з полацкім князем Брачыславам Ізяславічам, дзе яго ўладаннем адзначаецца Полацк (Palteskja) [42]. У “Пасме” адзначаецца, што тры князі былі братамі. Паведамленне супярэчыць рэальнаму стану падзей, так як Брачыслаў Ізяславіч прыходзіўся пляменнікам Святаполку і Яраславу. Але варта адзначыць, што пераўтварэнне пляменніка Яраслава ў яго брата можа тлумачыцца пэўнымі маральна-этычнымі нормамі адносін паміж князямі на Русі.

Пры паведамленні пра забойства варагамі на чале з Эймундам конунга Бурыцлейва існуе думка, што ў гэтым месцы "Пасма" змяшчае інфармацыю пра забойства князя Барыса варагамі, падасланымі Яраславам. Асноўным аргументам на карысць такога выказвання з'яўляецца падабенства шэрагу падрабязнасцей з забойствам Барыса, аб якім выразна паведамляе "Аповесць аб мінулых часах" і "Сказанне аб Барысе і Глебе". Акрамя таго, некаторымі даследчыкамі імя "Бурыцлейў" напрамую атаясамліваецца з Барысам Уладзіміравічам [43; 44]. Дадзеная гіпотэза не пазбаўлена лагічнага падмурку і патрабуе далейшых даследаванняў, бо шэраг неадпаведнасцяў характэрны таксама для афіцыйнай царкоўна-рэгарыстычнай трактоўцы дадзеных падзей.

У паведамленні "Пасмы" пра дзейнасць Эймунда і Рагнара пры двары Брачыслава ўзгадваецца нейкі савет полацкага князя, г. зн. пэўнае кола асоб, якое прымае важныя рашэнні побач з князем. На прапанову з боку Эймунда аб службе Брачыслаў адказвае: "*Дайце мне тэрмін **параіцца са сваімі мужамі**, таму што яны **даюць мне грошы**, хоць я іх выплочваю*" [42]. Калі паведамленне адпавядае гістарычным падзеям, а не пераносіць сацыяльна-палітычныя рэаліі Скандынавіі XIII стагоддзя на ўсходнеславянскую глебу, варта весці размову аб існаванні ў Полацку пачатку XI стагоддзя княжацкага (або рэгентскага) савета пры князе Брачыславе. Згодна з тэкстам агульнага паведамлення, дадзены савет валодаў значнымі паўнамоцтвамі і функцыямі і мог аказваць пэўны ўплыў на князя. У кантэксце апавядання аб "мужах князя" сага паведамляе пра дзейнасць у Полацку XI стагоддзя веча (тынгу): "*Вартылаў конунг **збірае тынг** са сваімі мужамі і гаворыць ім які слых прайшоў аб Яраславе…*" [42]. У слове тынг, беларускі гісторык Г.В. Штыхаў бачыць баярскі савет [45, с. 15]. Расійскія даследчыкі І.Я. Фраянаў і А.Ю. Дварнічэнка разглядаюць гэтыя звесткі як факт дзейнасці веча ў Полацку [46, с. 254]. Але згодна з аналізам вядомага скандынавіста Е.А. Мельнікавай, для скандынаўскіх саг была характэрна неразвітасць сацыялагічнай тэрміналогіі. У гэтай сувязі перанос на іншую глебу скандынаўскіх інстытутаў улады можа не адпавядаць рэальным палітычным падзеям і не абавязкова выглядае пераканаўчым [47, с. 134].

У "Пасме аб Эймундзе" гаворыцца аб дамове, заключанай паміж полацкім Брачыславам і кіеўскім князем Яраславам Уладзіміравічам. Падчас найбольшай канфрантацыі вараг Эймунд спрыяў заключэнню міра паміж князямі, у выніку якога Яраслаў заставаўся князем Наўгародскім, Эймунд атрымаў ва уладанне Полацк, а Брачыслаў стаў кіеўскім князем [42]. Паводле аналізу сагі, зробленага беларускім даследчыкам Ю.А. Зайцам, у дадзенай крыніцы знайшла адлюстраванне дамова паміж Яраславам і Брачыславам 1024 года. У гэтым годзе становішча Яраслава ў супрацьстаянні з братам Мсціславам Уладзіміравічам было складаным. У сітуацыі паразы ад Мсціслава ў бітве пры Ліствене "захаванне саюзу з Брачыславам было жыццёвай неабходнасцю" [48, с. 10]. Такім чынам, згодна з высновамі даследчыка, з 1024 да 1026 года (года дамовы паміж Яраславам і Мсціславам аб падзеле сфер уплыву ў падняпроўскіх землях) кіеўскі пасад займаў Брачыслаў, пры захаванні вярхоўнай улады над горадам Яраславам [48, с. 10].

Варта адзначыць, што падзеі "Эймундавай сагі" XIII стагоддзя пераклікаюцца і маюць шматлікія паралелі са звесткамі "Аповесці аб мінулых часах" канца XI – пачатку XII стагоддзя. Але характэрная для скандынаўскага наратыву ўзвелічэнне ролі скандынаваў за межамі сваёй краіны, якая цалкам адлюстроўваецца ў тэксце "Пасмы аб Эймундзе", ускладняе адзнаку рэальнай ролі ў палітычных падзеях Усходняй Еўропы старажытнарускіх князёў Святаполка, Яраслава і Брачыслава.

Пры агульным недахопе звестак аб арганізацыі ўлады на беларускіх землях каштоўнымі з'яўляюцца звесткі арабскіх і персідскіх аўтараў IX–XI стагоддзяў, такіх як **Ібн Хардадбека, Ібн Русте, Гардізі, Ібрахіма Ібн Якуба, Ібн Фадлана**. У мусульманскіх геаграфічных апавяданнях і гістарычных творах змешчаны асноўныя характарыстыкі ўсходнееўрапейскіх уладароў і ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі сацыяльнай эліты (русі) і асноўнай масай насельніцтва (славянамі), а таксама звычаі, вераванні і традыцыі скандынаўскай прывелеяванай сацыяльнай групы.

Сярод заканадаўчых крыніц адной з галоўных з'яўляеццца **"Руская Праўда"** – зборнік прававых нормаў Старажытнай Русі, звязаны з законатворчай дзейнасцю наўгародскага і кіеўскага князя Яраслава Уладзіміравіча і яго сыноў. На дадзены момант захавалася каля 100 спісаў, якія адносяцца да XIII–XVIII стагоддзяў. Па зместу дадзеныя спісы падзяляюцца на тры рэдакцыі, пачынаючы ад Краткай Праўды (Праўды Яраслава і Яраславічаў), Прастраннай Праўды (XII ст.) і Скарочанай Рускай Праўды, якая захавалася ў позніх спісах XV стагоддзя і з'яўляецца скарочанай перапрацоўкай Прастраннай Праўды. Згодна з аналізам асноўных палажэнняў дадзенай крыніцы, даследуюцца пэўныя аспекты сацыяльнай гісторыі, эвалюцыя прававых палажэнняў і судовая дзейнасць князёў і княжацкай адміністрацыі. У гістарыяграфіі дадзеныя Рускай Праўды ўспрымаюцца як адны з галоўных пры даследаванні сацыяльнай стратыфікацыі старажытнарускага грамадства ў дамангольскі перыяд.

Пры захаванасці ў шэрагу артыкулаў Рускай Праўды рэліктаў архаічнага права, па аналізу тэкста варта прызнаць, што прававы помнік быў створаны па ініцыятыве княжацкай улады і ў асноўным быў прадуктам княжацкай заканадаўчай практыкі. Пры даследаванні функцыянавання інстытута ўлады варта адзначыць, што ў крыніцы адлюстравана сацыяльна-палітычная іерархія, прадстаўленая ў нормах, дзе ахоўваюцца людзі, якія ўваходзілі ў княжацкае атачэнне.

Асноўныя падходы ў гістарыяграфіі пры даследаванні сацыяльнай стратыфікацыі, паводле Рускай Праўды, зводзяцца да аналізу шкалы вір, паводле якой даследчыкі робяць выснову аб юрыдычна замацаваным сацыяльным падзеле старажытнарускага грамадства. Так, павелічэнне ў два разы штрафаў за забойства "княжага мужа" з 40 у Праўдзе Яраслава да 80 грывен у Праўдзе Яраславічаў (другая палова – канец XI ст.), на думку М.Б. Свярдлова і А.А. Горскага, з'яўляецца яскравым паказчыкам сацыяльнага расслаення і адасаблення княжацкай дружыны ў параўнанні з часам праўлення Яраслава (першая палова XI ст.) [49; 50]. Альтэрнатыўны пагляд на звесткі Рускай Праўды выказвае П.С. Стэфановіч. На думку гісторыка, аналіз змен у шкале вір, паводле рэдакцый Рускай Праўды, яшчэ не сведчыць пра юрыдычна замацаваную сацыяльную іерархію ўнутры княжацкага кола. Падвышаная віра вызначалася не па сацыяльнаму статусу, а па службова-функцыянальнай дзейнасці князёў [51, с. 518].

З высновамі П.С. Стэфановіча можна пагадзіцца, абапіраючыся на адсутнасць (за адзіным выключэннем у ст. 91 Прастраннай Праўды) звестак пра вышэйшы пасля князя сацыяльны слой Старажытнай Русі – баяр і іншых прадстаўнікоў старажытнарускай эліты. Тэрмін "баяры" не ўзгадваецца ў пераліку пакаранняў і вір Праўды Яраслава і Праўды Яраславічаў. У адрозненне ад баяр, у крыніцы ўзгадваюцца княжыя отракаі, конюхі, повары, грыдзі, купцы, мечнікі і ізгоі, за забойства якіх прадугледжвалася віра ў 40 грывен і княжыя цівуны, агнішчане, пад'ездныя і старэйшыя конюхі, за якіх належыла выплата ў 80 грывен [52, с. 406–407, 70, 104]. Такім чынам, старажытнарускі прававі помнік акрэслівае тыя сацыяльныя групы, якія стаялі на службе ў князя і вылучаліся паводле сваёй функцыянальнай, а не сацыяльнай прыналежнасці. У гэтым сэнсе можна весці гаворку аб законатворчых нормах, накіраваных на юрыдычную абарону важных для князя людзей, якія складалі княжацкі апарат кіравання. Адсутнасць узгадкі прадстаўнікоў улады – баяр, тысяцкіх, ваявод, пасаднікаў – перашкаджае высновам аб Рускай Праўдзе як крыніцы, дзе юрыдычна замацавана сацыяльная стратыфікацыя. У кантэксце даследавання інстытута княжацкай улады звесткі Рускай Праўды з'яўляюцца каштоўнымі пры даследаванні бліжэйшага княжацкага атачэння і таго кола асоб, якія былі цесна звязаны з княжацкім дваром XI–XII стагоддзяў.

Руская Праўда ўжывалася на практыцы ў якасці прававога кодэкса і ў больш позні час. Адным з прававых дакументаў, дзе адлюстроўваюцца пэўныя прававыя нормы Рускай Праўды, з'яўляецца "**Дагавор Смаленска, Віцебска і Полацка з Рыгай і Готскім берагам**". Дагавор 1229 года прысутнічае ў спісах, якія захаваліся ў Рыжскай і Готландскай рэдакцыях. Гісторыя дагавора адлюстроўвае ўзаемаадносіны Полацкай зямлі з Прыбалтыйскімі тэрыторыямі, якія дзейнічалі на працягу XIII стагоддзя.

**Заключэнне.** Падводзячы вынік аналізу пісьмовых сярэднявечных крыніц у асвятленні інстытута княжацкай улады на беларускіх землях IX–XIII стагоддзяў можна зрабіць наступныя высновы.

У летапісных крыніцах Старажытнай Русі гісторыя беларускіх зямель, у прыватнасці Полацка як аднаго з галоўных палітычных і эканамічных супернікаў Наўгародскай зямлі і Кіеўскага княства, амаль выключна разглядаецца ў сувязі з экстраардынарнымі падзеямі, звязанымі з войнамі, незвычайнымі прыроднымі з'явамі, або пошасцямі і бедствамі. Унутранае палітычнае жыццё, міжкняжацкія адносіны ўнутры полацкай дынастыі, звесткі пра тэрытарыяльныя межы і палітычны лад Полацкай зямлі практычна не асвятляюцца. Падзеі, прысвечаныя Полацку і Полацкай зямлі, якія даносяць да нас старажытнарускія летапісы, звязаныя перш за ўсё з ваяўнічай альбо "непаслухмянай" дзейнасцю полацкіх князёў. У гэтым сэнсе полацкія Рагвалодавічы прадстаўлены кіеўскім і наўгародскім летапісаннем як парушальнікі "агульнага парадку і міру" ў Рускай зямлі, а Полацкая зямля разглядаецца як незнаёмая і патэнцыйна варожая. Непрызнанне за полацкімі князямі праў на вялікакняжацкі кіеўскі стол пасля смерці старэйшага сына Уладзіміра Ізяслава (1001 г.) прадвызначыла далейшае асэнсаванне полацкай лініі Рурыкавічаў як адасобленай княжацкай галіны. Пры гэтым за Рагвалодавічамі прызнавалася законнае права на іх вотчыну – Полацкае княства. Прызнанне нашчадкаў Ізяслава Уладзіміравіча законнымі спадчыннікамі ўлады ў Полацку і адлюстраванне ідэалагічнага супрацьпастаўлення двух родных дынастый яскрава падкрэсліваецца паведамленнем Лаўрэнцьеўскага летапісу пры апісанні падзей канца X стагоддзя.

Працяглая палітычная залежнасць Тураўскай зямлі ад Кіеўскага княства ў X – першай палове XII стагоддзя абумовіла малаінфарматыўныя звесткі пра гісторыю гэтага рэгіёна ў "Аповесці аб мінулых часах". Асноўная інфармацыя пра палітычную гісторыю Тураўскага і Смаленскага княстваў XII стагоддзя змешчана ў Лаўрэнцьеўскім і Іпацьеўскім летапісных зводах. Сталае панаванне ў Тураве галіны кіеўскіх Ізяславічаў магло сведчыць аб спадчынным валоданні гэтай зямлёй прадстаўнікоў дадзенай лініі. Паведамленні пра палітычнае жыццё Смаленскай зямлі, якія былі даволі скупа асветлены ў пачатковым старажытнарускім летапісанні, абумоўлены палітычнай залежнасцю Смаленска ад Кіева і Манамахавічаў у XI стагоддзі. У XII стагоддзі летапісныя звесткі становяцца больш інфарматыўнымі ў сувязі з усталяваннем у Смаленску самастойнай княжацкай дынастыі Расціславічаў (нашчадкаў Мсціслава Уладзіміравіча) і значным уплывам Смаленска на іншыя землі Заходняй Русі.

Беларуска-літоўскае летапісанне, у прыватнасці "Аповесць пра Полацк", змешчаная ў легендарнай частцы "Хронікі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага", не адрозніваецца вялікай колькасцю паведамелнняў адносна гісторыі беларускіх зямель ранняга і сталага сярэднявечча. Але паводле ана-

лізу летапісных артыкулаў пра легендарную літоўскую княжацкую дынастыю, якая кіравала ў Полацку, можна зрабіць экстрапаляцыю дадзеных паведамленняў на ўяўленні аб гісторыі полацкай княжацкай дынастыі XII стагоддзя. Звесткі пра асаблівасці палітычнага ладу Полаччыны, адлюстраваныя ў "Аповесці пра Полацк", таксама могуць адпавядаць гістарычным падзеям першай паловы XII стагоддзя з улікам таго, што гэтыя звесткі, зафіксаваныя ў XVI стагоддзі, засноўваюцца на вуснай фальклорнай традыцыі і пэўным чынам карэлююца з паведамленнямі старажытнарускіх летапісаў.

Пры адносна невялікай колькасці паведамленняў, прысвечаных Полацкаму і Тураўскаму княствам у старажытнарускіх летапісных зводах, каштоўнымі гістарычнымі крыніцамі з'яўлюцца літаратурныя хрысціянскія творы, зробленыя непасрэдна на беларускіх землях. Гэта перш за ўсё "Жыціе Ефрасінні Полацкай" (XII ст.) і творы тураўскага епіскапа Кірыла (1130–1182 гг.). Пры аналізе старажытнарускіх літаратурных і агіяграфічных твораў і змешчаных у іх ідэалагічных канструкцый даволі важным з'уляецца ўспрыняцце дадзеных тэкстаў як асэнсаванне інстытута вярхоўнай улады з афіцыйнай пазіцыі "кніжнай эліты": манахаў, святароў, княжацкіх саветнікаў і г.д.

Такім чынам, погляд і ўспрыняцце вярхоўнай улады прадстаўнікамі інтэлектуальнай эліты, якія гуртаваліся вакол князя і сваімі творамі часцяком прадстаўлялі пазіцыю правячага асяроддзя, выглядае "аднабаковым" і ў нейкім сэнсе тэндэнцыйным. У гэтым выпадку на матэрыяле Старажытнай Русі правамерна казаць аб двух тыпах культур сярэднявечнага грамадства ўпершыню распрацаваных французскім медыевістам Ж. Ле Гофам: "навуковай", або пісьмовай культуры і культуры народнай, або "фальклорнай" [54, с. 233–236]. У гэтай сувязі пры фактычна поўнай адсутнасці крыніц XI–XII стагоддзяў, адлюстроўваючых уяўленні ніжэйшых слаёў грамадства, важна на аснове пісьмовых летапісных і літаратурных крыніц прааналізаваць погляды на ўладу з боку прадстаўнікоў "пісьмовай культуры". Пры дадзеным аналізе таксама варта ўсведамляць той факт, што "пісьмовая культура" не здолела ў поўнай меры перамагчы архаічныя фальклорныя ўяўленні і ў пэўнай ступені ўбірае іх у сябе.

Вялікае значэнне пры даследаванні сярэднявечнай гісторыі Усходняй Еўропы маюць наратыўныя творы замежных аўтараў. Гэта перш за ўсё крыніцы візантыйскага, лацінамоўнага і скандынаўскага паходжання. Істотнае значэнне маюць звесткі арабскіх і персідскіх аўтараў IX–XI стагоддзя. У наратывах, звесткі якіх непасрэдна датычацца беларускай гісторыі, асаблівае значэнне маюць "Хроніка Цітмара Мерзенбургскага", "Хроніка і дзеянні польскіх князёў" польскага храніста Гала Ананіма і ісландская крыніца "Пасма аб Эймундзе". Цантральныя падзеі гэтых крыніц гуртуюцца вакол адных і тых жа ваенна-палітычных падзей, а менавіта дынастычнага супрацьстаяння наўгародскага князя Яраслава Уладзіміравіча і тураўскага князя Святаполка Яраполчыча за кіеўскую спадчыну. Дадзеныя творы паходзяць з розных краін і рэгіёнаў. У гэтым выпадку цікавым з'яўляецца тлумачэнне адных і тых жа падзей рознымі аўтарамі ў залежнасці ад культурных традыцый, асаблівасцей, звязаных з асобай летапісца і палітычнымі ўмовамі, пры якіх ствараўся наратыў.

Аналізуючы тэкст першага пісьмова зафіксаванага заканадаўчага зборніка Старажытнай Русі Рускай Праўды, трэба мець на ўвазе той факт, што нет прамых сведчанняў дзейнасці прававых нормаў Праўды Яраслава і Яраславічаў на тэрыторыі беларускіх зямель у XI–XII стагоддзях. Але параўнанне дадзеных гэтага заканадаўчага помніка з дадзенымі позніх актавых крыніц XIII стагоддзя, якія дзейнічалі ў Полацку, Віцебску і Смаленску, дазваляе зрабіць выснову аб пераемнасці асноўных прававых традыцый. У дадзеным выпадку старажытнарускія заканадаўчыя матэрыялы XI–XII стагоддзяў і нормы гандлёвага заканадаўства першай паловы XIII стагоддзя дазваляюць выявіць істотныя і агульныя для ўсходнееўрапейскай сярэднявечнай прасторы асаблівасці прававога, сацыяльнага і палітычнага жыцця.

Пры даследаванні пісьмовых крыніц, у якіх захаваліся звесткі пра сацыяльную структуру і вярхоўную ўладу старажытнарускага грамадства, патрабуецца не толькі дбайная крыніцазнаўчая адзнака таго ці іншага паведамлення. Неабходна таксама асэнсоўваць, што сацыяльна-палітычная рэчаіснасць, адлюстраваная ў тэксце крыніцы, абсалютна нехарактэрна для той рацыяналізацыі і сістэматычнасці, якую выкарыстоўваюць пры даследаванні з'яў і працэсаў сучаснага грамадства. Старажытнарускую сацыяльную прастору немагчыма даследваць, не ўлічваючы культурныя і гістарычныя асаблівасці эпохі, умовы напісання тэкста крыніцы, а таксама аксіялагічныя ўстаноўкі і светапогляд аўтара.

## ЛІТАРАТУРА

1. Полное собрание русских летописей. – Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1926–1928. – Т. 1: Лаврентьевская летопись. – 379 с.
2. Прохоров, А.А. Князь Тур: история легенды. Сакрализация княжеской власти у славян / А.А. Прохоров. – Минск: БГУ, 2005. – 252 с.
3. Філіповіч, М.А. Полацкая зямля ў беларуска-літоўскай летапіснай традыцыі / М.А. Філіповіч // Беларускі гістарычны часопіс. – Мінск, 2012. – С. 20–30.
4. Шахматов, А.А. Разыскания о русских летописях / А.А. Шахматов. – М.: Академ. проект, Жуковський: Кучково поле, 2001. – 880 с.

5. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – 576 с.
6. Полное собрание русских летописей. – СПб.: Тип. М.А. Александрова, 1908. – Т. 2: Ипатьевская летопись. – 638 с.
7. Вилкул, Т.Л. Люди и князь в древнерусских летописях середины XI–XIII в. / Т.Л. Вилкул. – М.: Квадрига, 2009. – 408 с.
8. Полное собрание русских летописей. – М.: Изд-во “Наука”, 1975. – Т. 32: Хроника Литовская и Жмойтская. – 429 с.
9. Полное собрание русских летописей. – М.: Изд-во “Наука”, 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские. – 306 с.
10. Заяц, Ю. История Белорусских земель X – первой пол. XIII века в отображении летописей и хроник Великого Княжкства Литовского / Ю. Заяц // Гістарычна-археалагічны зб. – Мінск, 1997. – № 12. – С. 85–91.
11. Татищев, В.Н. История Российская / В.Н. Татищев. – М.: Эксмо, 2006. – 736 с.
12. Долгов, В.В. Быт и нравы Древней Руси / В.В. Долгов. – М.: Яуза, Эксмо, 2007. – 512 с.
13. Слово о Законе и Благодати митрополита Илариона [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4868. – Дата досткпа: 15.12.2013.
14. Марзалюк, І.А. Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў XI–XVII стст. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lingvo.minsk.by/mab/Glook/BVOKS/Albaruthenica.htm. – Дата доступу: 09.12.2013.
15. Сказание о Борисе и Глебе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4871. – Дата доступа: 07.02.2013.
16. Гудзий, Н.К. Хрестоматия по древнерусской литературе: учеб. пособие для студ. пед. ин-тов по спец. № 128 / Н.К. Гудзий; науч. ред. Н.И. Прокофьев. – изд. 8-е – М.: “Просвещение”, 1973. – 528 с.
17. Память и похвала князю русскому Владимиру [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://lib.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4870. – Дата доступа: 08.02.2013.
18. Березовая, Л.Г. История русской культуры / Л.Г. Березовая, Н.П. Берлякова. – М.: Владос, 2002. – Т. 1. – 400 с.
19. Гісторыя філасоўскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. / В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 1: Эпоха Сярэднявечча. – 578 с.
20. Алексеев, М.П. Англосаксонские параллели к поучению Владимира Мономаха / М.П. Алексеев // Тр. отдела древнерусской литературы. – М.; Л., 1935. – Т. 2. – С. 39 – 80.
21. Поучение Владимира Мономаха [Электронный ресурс]. – Режым доступа: http://lib.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4874. – Дата доступа: 12.11.2013.
22. Слово о полку Игореве / вступ. ст., ред. текста, досл., и объяснит. пер. с древнерус., примеч. Д.С. Лихачёва. – 8-е изд. – М.: Дет. лит, 1979. – 221 с.
23. Полоцкая княжна Мария Васильковна – автор “Слова о полку Игореве”: исследования тайнописи / вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судника. – Полоцк: А.И. Судник, 2008. – 53 с.
24. Житие Евфросинии Полоцкой [Электронны ресурс]. – Режим доступа: http://www.krotov.info/acts/12/3/evfrosinia_polozk.htm. – Дата доступа: 12.03.2013.
25. Мельников, А. Преподобная Евфросиния Полоцкая / А. Мельников. – Минск: Изд-во “Четыре четверти”, 1997. – 121 с.
26. Янин, В.Л. Актовые печати Древней Руси X–XV вв. / В.Л. Янин. – М.: Наука, 1970. – Т. I: Печати X – нач. XIII в. – 328 с.
27. Тарасаў С.В. “Белыя плямы” полацкай археалогіі і гісторыі // Зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара. – Полацк, 20–21 лістап. 2008 г. / пад рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 79–91.
28. Притча о человеческой душе Кирилла Туровского [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://old-ru.ru/03-14.html. – Дата доступа: 12.03.2013.
29. Повесть о белоризце человеце, и о мнишестве, и о душе, и о покоянии [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: http://briefly.ru_pritchi_kirilla_turovskogo. – Дата доступа: 12.03.2013.
30. Тацит Отрывки [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://lib.ru/POEEAST/TACIT/tazit1_1.txt. – Дата доступа: 24.05.2013.
31. Прокопий Кесарийский Война с готами покоянии [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus/Prokop/sodgot.phtml?id=1156. – Дата доступа: 25.12.2012.
32. Маврикий Стратегикон [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://krotov.info/acts/06/3/mavriky.htm. – Дата доступа: 12.10.2013.
33. Феофилакт Симокатта История [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus16/Simokatta/frametext1.htm. – Дата доступа: 12.10.2013.

34. Константин Багрянородный О церемониях [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus11/Konst_Bagr/cerem.phtml?id=731. – Дата доступа: 03.10.2013.
35. Канстанцін Багранародны Об управлении империей // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.vostlit.info/Texts/rus11/Konst_Bagr_2/index.phtml?id=6412. – Дата доступу: 13.10.2013.
36. Титмар Мерзебургский Хроника [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus11/Thietmar2/frametext.htm. – Дата доступа: 10.12.2013.
37. Новікаў, Я.У. Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.). / Я.У. Новікаў. Т. 2. – Мінск: Логвінаў, 2008. – 300 с.
38. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: “Экаперспектыва”, 2000. – Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.
39. Назаренко, А.В. Древняя Русь на международных путях: междисциплинарные очерки культурных, торговых, политических связей IX–XII вв. / А.В. Назаренко. – М.: Языки русской культуры, 2001. – 784 с.
40. Галл Аноним Хроника и деяния князей и правителей польских [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus9/Gall/frametext1.htm. – Дата доступа: 12.12.2013.
41. Древняя Русь в свете зарубежных источников: хрестоматия / под ред. Т.Н. Джаксон, И.Г. Коноваловой и А.В. Подосинова. Т. IV: Западноевропейские источники; сост., пер. и коммент. А.В. Назаренко. – М.: Рус. Фонд Содействия Образованию и Науке, 2010. – 512 с.
42. Прядь об Эймунде Хрингссоне [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://norse.ulver.com/src/konung/eymund/ru2.html. – Дата доступа: 15.12.2013.
43. Данилевский, И.Н. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX–XII стст.) / И.Н. Данилевский. – М.: Аспект пресс, 1998. – 205 с.
44. Филист, Г.М. История “преступлений” Святополка Окаянного / Г.М. Филист. – Минск: Беларусь, 1990. – 156 с.
45. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.
46. Фроянов И.Я. Города-государства Древней Руси / И.Я. Фроянов, А.Ю. Дворниченко. – СПб.: Изд.-во С.-Петерб. ун-та, 1988. – 269 с.
47. Древняя Русь в свете зарубежных источников: хрестоматия / под. ред. Т.Н. Джаксон, И.Г. Коноваловой и А.В. Подосинова. – М.: Русский Фонд Содействия Образованию и Науке, 2010. – Т. V: Древнескандинавские источники. – 512 с.
48. Заяц, Ю.А. Полоцкие события “Саги об Эймунде” / Ю.А. Заяц // Полоцкий летописец. – Полоцк, 1993. – № 1(2). – С. 5–11.
49. Свердлов, М.Б. Домонгольская Русь: Князь и княжеская власть на Руси VI – первой трети XIII в. / М.Б. Свердлов. – СПб.: Академ. проект, 2003. – 736 с.
50. Горский, А.А. Древнерусская дружина / А.А. Горский. – М.: Изд-во “Прометей”, 1989. – 122 с.
51. Стефанович, П.С. Бояре, отроки, дружины: военно-политическая элита Руси в X–XI вв. / П.С. Стефанович. – М.: “Индрик”, 2012. – 656 с.
52. Правда Русская / под ред. Б.Д. Грекова. – М.–Л.: АН СССР, 1940. – Т. I: Тексты. – 506 с.
53. Смоленская Торговая Правда [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.librus.ru/humanities_sciences/historical-sciences/russian-history/27287-smolenskie-gramoty-xiii-xiv-vekov.html. – Дата доступа: 15.11.2013.
54. Ле Гофф, Ж. Цивилизация средневекового Запада / Ж. Ле Гофф. – М.: “Прогресс”, 1992. – 376 с.

*Пастуміў 24.06.2014*

**CONSIDERATION INSTITUTE OF SUPREME POWER IN THE BELARUSIAN LANDS IN IX – THE FIRST HALF OF THE XIII CENTURIES IN WRITTEN SOURCES**

***JU. KEZHA***

*The article analyzes the main medieval written sources where institutions are considered the supreme authority in the Belarusian lands in IX–XIII centuries polovine first. According to ancient chronicles consideration and foreign sources, Christian literary works and legislative materials, concludes roznorodnosti information depending on the political, historical and cultural conditions of writing source. Socio-political reality reflected in the text of the source, can not be applied to streamline and systematize that is used in the study of the processes of modern society. Ancient social space can not be investigated without paying attention to the cultural and historical features of the era, the terms of writing the source text, as well as the values and worldview of the author.*

**УДК 94(476.4)**

# УЗБРАЕННЕ МАГІЛЁВА Ў КАНЦЫ XVI–XVII СТАГОДДЗІ (АГУЛЬНЫ АГЛЯД)

***Р.ДЗ. ГАЛЫНСКІ***
***(Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова)***

*Разглядаецца комплекс сродкаў абароны і нападу магілёўскіх мяшчан напрыканцы XVI–XVII стагоддзі. Мілітарная гісторыя асобных гарадоў рэдка вывучалася мэтанакіравана, асабліва разглядаемага намі перыяду. Аналіз прадметаў узбраення праводзіцца на аснове аналізу пісьмовых крыніц і археалагічных калекцый магілёўскіх музеяў. Усе сродкі бою, якія аналізуюцца ў артыкуле, падзяляюцца на засцерагальнае ўзбраенне і наступальную зброю. Вынікі даследавання кажуць аб важнейшай функцыі магілёўскага ўзбраення – абароны мяшчанамі горада, у адрозненне ад тых функцый, якія ставіліся пры забеспячэнні баявымі сродкамі шляхецкага паспалітага рушэння.*

Пісьмовыя крыніцы (актавыя кнігі і юрыдычныя дакументы магілёўскага магістрата) і археалагічныя матэрыялы з Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е.Р. Раманава і Музея гісторыі Магілёва дазваляюць здзейсніць комплексны аналіз узбраення магдэбургскага Магілёва напрыканцы XVI–XVII стагоддзя.

**Асноўная частка.** Усе сродкі бою, якія аналізуюцца ў артыкуле, падзяляюцца на засцерагальнае ўзбраенне і наступальную зброю.

***Засцерагальнае ўзбраенне*** патрабавалася дзеля аховы ваяра ад сродкаў нападу ворага. Яго можна падзяліць на тры катэгорыі: шчыты (рухомыя сродкі аховы), ахова галавы і ахова цела (нерухомыя сродкі аховы). Ахова галавы магілёўскіх камбатантаў прадстаўлена трыма відамі шлемаў: марыёнамі, шышакамі і прылбіцамі. Марыён у якасці сродка аховы галавы магілёўскіх ваяроў вядомы нам толькі па дадзеных археалогіі, шышак і прылбіца – толькі па згадках у актавых дакументах магістрата. Узгадка пра шышакі знаходзіцца ў «*Оповедане Гане Ивановне на Онопрея*» ад 15 кастрычніка 1597 года. Скарга тычылася рабунка: «*… тот час згинуло с клети моей два панцеры, которые стояли десети коп грошей, шышаки два, которые до схованья даны были от приятеля моего, сагайдаки два …*» [2, с. 425–426]. Што ж тычыцца шлема, то ён узгадваецца ў тэксце вопіса маёмасці нябожчыка Хамы Іванавіча Мокуса «*… прилбыцы тры…*» (запіс за 1578 г.) [2]. Засцерагальныя сродкі аховы цела (панцыр) узгадваюцца двойчы, толькі ў пісьмовых крыніцах XVI стагоддзя. Пра выкарыстанне шчытоў увогуле няма звестак у пісьмовых крыніцах і пацверджанняў у археалагічным матэрыяле [3, с. 102–110; 2, с. 498; 19, с. 214].

Такім чынам, можна казаць, што вялікай колькасці сродкаў аховы цела і галавы ў Магілёве XVI–XVII стагоддзяў не было. Магчыма гэта звязана з дарагавізнай гэтых мілітарый, альбо з наяўнасцю іншых сродкаў аховы цела, накшталт халатаў і цігіляяў. Наяўнасць марыёна можа тлумачыцца прысутнасцю ў горадзе наёмніка з Заходняй Еўропы (немец, шатландзец, іспанец). Гэты тып шлемаў характэрны для пяхоты (стралкі альбо пікінеры). Шышакі і прылбіцы, у сваю чаргу, выкарыстоўваліся ў асноўным кавалерыяй. У XVII стагоддзі ахоўнае ўзбраенне не згадваецца ўвогуле.

***Наступальная зброя*** падзяляецца на дзве катэгорыі: зброя дальняга і бліжняга бою. У першай катэгорыі вылучаюць кідальную і агняпальную, а ў другой – клінковую (мячы, шаблі і г.д.), абуховую (сякеры, булавы і г.д.) і дрэўкавую (коп’і, пікі, рагаціны і інш.) віды зброі. Усе віды маюць у сваім складзе тыпы, падтыпы, варыянты і больш меншыя – таксоны [2; 4–18].

Агляд прадметаў узбраення бліжняга бою трэба распачаць з дрэўкавага, так як гэту зброю можна ахарактарызаваць як зброю першага бліжняга кантакту. У Магілёве яна была рэпрэзентавана пікамі, коп’ямі, пратазанамі, рагацінамі і вошчапамі, а таксама эвалюцыйнамі мадыфікацыямі некаторых пералічаных вышэй мілітарый (рункамі, фрывульскімі коп’ямі, эспантонамі (?)) (мал. 1:1–15; 2:3) [4; 6]. Але неабходна памятаць, што асноўная колькасць наканечнікаў дрэўкавай зброі трапіла ў культурныя напластаванні горада і дно Дубравенкі, Дняпра і Дзябры падчас штурмаў горада войскам Януша Радзівіла ў лютым – красавіку 1655 года [1, с. 162–165].

Калі казаць пра пісьмовыя згадкі дрэўкавай зброі, то пра іх наяўнасць у магілёўскіх збраёўнях гавораць наступныя запісы:

- *«… рогатинка дана зол. один…»* [7, с. 24];
- *«Бердышовъ чотыры, шафалина одна»* [11, с. 145–146];
- *«… szafelinow para, złotem nabiianych, na trzcinach…»* [16, с. 369];
- *«петнадцат осщеповъ засчитныхъ з олстрами»* [2, с. 83].

Пад абуховай зброяй трэба разумець комплекс з сякер, кісцянёў, кляўцоў, бярдышоў, шастапёраў і інш. У пісьмовых крыніцах яны фігуруюць як:

- *«… за обушокъ который ему въ дорогу…»* [10, с. 231];

- *«… обухъ сребромъ набияный дали золотыхъ два и осмак. 20…»* [11, с. 31];
- *«… купили у Ческого сына Ивана барду полскую за золот. тры…»* [13, с. 83];
- *«… секиру в дорогу дали…»* [8, с. 95].



Мал. 1. Наканечнікі дрэўкавай зброі з фондаў УК “МАКМ імя Е.Р. Раманава” XVI–XVII стагоддзяў:
1, 5 – рагаціны; 2–3 – коп’і; 4, 12 – пратазаны; 6 – піка кавалерыйская (дрэва); 7, 10 – піка пяхотная;
8 – дроцік (вошчап); 9 – спетум (фрывульскае коп’ё); 11 – рунка; 13 – 15 эспантоны

*Заўвага: прамалёўка аўтара.*

У арсеналах магілёўскіх мяшчан знаходзіліся: сякеры, кісцяні, бярдышы (мал. 2), баявыя цапы і (магчыма) булавы. Археалагічныя матэрыялы пацвярджаюць бытаване толькі кісцянёў і бярдышоў, астатнія сродкі бою ўзгадваюцца ў пісьмовых крыніцах [2; 4–19]:

57. Сборник материалов для истории просвещения в России, извл. из архива М-ва нар. просвещения, 1893. – Т. 1: Учебные заведения в западных губерниях до учреждения Виленского учебного округа, 1783–1803; введ. И. Корнилова. – LX с., 896.
58. Сборник материалов для истории просвещения в России, извл. из архива М-ва нар. просвещения, 1897. – Т. 2: Учебные заведения в западных губерниях, 1802–1804; введ. И. Корнилова. – XCVI с.

59. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из архива М-ва нар. просвещения, 1898. – Т. 3: Учебные заведения в западных губерниях, 1805–1807 / предисл. О. Крыжановского; вступ. сл. И. Корнилова. – XXXVII с.
60. Севергин, В.М. Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или минералогические, хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802–1803 гг. – СПб.: Имп. Акад. наук, 1803. – Ч. 1. – 168 с.
61. Севергин, В.М. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства, или минералогические, хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802–1803 гг. Ч. 2. – СПб.: Имп. Акад. наук, 1804. – 224 с.
62. Соркіна, І.В. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII – першай пал. XIX ст. / І.В. Соркіна; навук. рэд. З.В. Шыбека: Еўрапейскі гуманіт. ун-т, 2010. – Вільня. – 487 с.
63. Статистические сведения о народонаселении некоторых южнорусских и западнорусских губерний по племенам и вероисповеданиям за 1860 г. // Вестн. Юго-Западной и Западной России. – 1862. – Год первый. Т. 1. Июль, отд. IV. – С. 55–56.
64. Статистическое описание Могилёвской губернии в лесном её отношении за 1844 год // Могилёвские губ. ведомости. Отд. II. Часть неофиц. к № 51. –1848. – С. 905–908.
65. Статистическое описание Могилёвской губернии в лесном её отношении за 1844 год // Могилёвские губернские ведомости. Отд. II. Часть неофиц. к № 50. – 1848. – С. 891–895.
66. Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX – нач. XX в.: в контексте Центр.-Вост. Европы / П.В. Терешкович. – Минск: БГУ, 2004. – 221 с.
67. Токць, С.М. Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / С.М. Токць; АН Буларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1997. – 21 с.
68. Церашковіч, П. Палякі і нацыянальная палітыка расійскай адміністрацыі на Беларусі ў другой палове XIX ст. / П. Церашковіч // Беларусы і палякі: дыялог народаў і культур. X–XX ст.: матэрыялы міжнар. круглага стала, Гродна, 28–30 верас. 1999 г.; адк. рэд. і уклад. Д. Караў. – Гродна: Б.в., 1999. – С. 354–357. – (Наш радавод; Кн. 8).
69. Чантурия, В.А. История архитектуры Белоруссии: дооктябрьский период: учеб. пособие по курсу «История архитектуры народов СССР» для архит. спец. вузов и для худож. ин-тов / В.А. Чантурия. – Минск: Выш. шк., 1969. – 262 с.
70. Чарняўская, Т.І. Архітэктура Магілёва: з гісторыі планіроўкі і забудовы горада / Т.І. Чарняўская; рэд. У.А. Чантурыя; Акад. навук Беларускай ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 92 с.
71. Чепко, В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX века: экономическое развитие / В.В. Чепко. – Минск: Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1981. – 142 с.
72. Швед, В.В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е гг.) / В.В. Швед. – Гродно: ПКФ «Орбикс», 1995. – 135 с.
73. Шелкопляс, В.А. Судебные органы в Беларуси: Конец XVIII – первая половина XIX в.: учеб. пособие / В.А. Шелкопляс; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, Акад. – Минск: Акад. МВД Респ. Беларусь, 1997. – 63 с.
74. Эркерт, Р.Ф. Этнографический атлас западнорусских губерний и соседних областей / Р.Ф. Эркерт. – СПб., 1863. – 6 л.
75. Янсон, Ю.Э. Сравнительная статистика России и западноевропейских государств / Ю.Э. Янсон. – СПб.: Тип. М. Стасюлевича, 1878. – Т. 1: Территория и население. – 388 с.

*Поступила 28.05.2014*

## THE HISTORY OF EXPLORING CITIES OF MOGILEV PROVINCE OF THE FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

***E. MAZUR***

*In the article the main stages of exploring cities of Mogilev Province of the first half of the XIX century are considered. In exploring cities of Mogilev Province three main stages can be divided. The first one is from the beginning of the XIX century until 1917, the second one is from 1918 to 1991, and the third – from 1991 to the present day. The main issues in the study of cities have been its socio-economic development, and only a small part of the author have examined the problems associated with the development of culture. However, since the XIX century to the present day specialized studies on the integration of cities of Mogilev Province in the socio-cultural and economic space of the Russian Empire in the first half of the XIX century haven't been conducted.*

УДК [94(476):341.95]«18/19»

# САСЛОЎНА-ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ЗАМЕЖНЫХ ПАДДАНЫХ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

*А.С. ПОТРАСАВА*
*(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)*

*Другая палова XIX – пачатак XX стагоддзя – перыяд актыўнага рэфармавання заканадаўства Расійскай імперыі, якое датычылася правоў замежнікаў. Даследуецца прававое становішча іншаземцаў, яно магло адрознівацца ў залежнасці ад маёмаснага стану, паходжання, веравызнання, нацыянальнасці, мэты прыезду. Асноўнымі катэгорыямі замежных падданых у беларускіх губернях згодна з заканадаўствам былі замежныя дваране, духавенства, каланісты, рамеснікі, купцы і яўрэі. Разглядаюцца магчымасці набыцця расійскага падданства і выхаду з яго. Адным з шляхоў набыцця падданства з'яўляецца натуралізацыя, якую падзяляюць на звычайную і надзвычайную. Дзяржава імкнулася максімальна ўраўнаваць прававы статус іншаземцаў са становішчам рускіх падданых. Палітыка ў адносінах да замежных падданных у беларускіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя насіла агульнаімперскі характар з некаторымі абмежаваннямі ў правах валодання нерухомай маёмасцю.*

**Уводзіны.** Найбольш поўнае ўключэнне чалавека ў грамадскае жыцце і валоданне ім усім спектрам правоў, абавязкаў і адказнасцю адбываецца толькі пры наяўнасці ў яго грамадзянства той дзяржавы, у якой ён знаходзіцца. Грамадзянства адлюстроўвае сувязь чалавека і дзяржавы. Аднак на тэрыторыі дзяржавы могуць пражываць таксама іншаземцы, якіх раней называлі замежнымі падданымі. У заканадаўстве Расійскай імперыі замест інстытута грамадзянства існаваў інстытут падданства, які вызначаў прававы статус чалавека. Як сцвярджае І. Шаура, інстытут грамадзянства ў Расійскай дзяржаве з'явіўся толькі ў 1917 годзе [1, с. 5]. Замежнікамі прызнаваліся падданыя іншых краін, якія не ўступілі ва ўстаноўленым парадку ў падданства Расіі. Ім загадвалася падпарадкоўвацца мясцовай уладзе і мясцовым законам, але ў сваю чаргу яны набывалі правы і гарантыі з боку расійскага заканадаўства і карысталіся абаронай паліцэйскіх і судовых устаноў [2, с. 1].

У апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі праводзіцца палітыка прыцягнення працаздольных мігрантаў для працы па менш запатрабаваных спецыяльнасцях, асабліва ў сельскія раёны, паступова павялічваецца колькасць замежнікаў, якія атрымалі від на жыхарства. Пражыванне іншаземцаў на тэрыторыі Беларусі мае шматвяковую гісторыю. Вялікую цікавасць для даследавання праблем міграцыі на сённяшні дзень уяўляюць пытанні, якія датычацца прысутнасці замежных падданых у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя. Гістарыяграфія даследавання дазваляе падкрэсліць павышаную ўвагу расійскіх навукоўцаў да высвятлення пытанняў прававога статусу замежнікаў. Да цяперашняга часу маецца шэраг прац, у якіх разглядаюцца асаблівасці ўезду, знаходжання, а ў большай ступені грамадскай, эканамічнай дзейнасці замежнікаў як у агульнаімперскім, так і рэгіянальным маштабе. У айчыннай навуцы гэтая праблема не атрымала належнага асвятлення і з'яўляецца малавывучанай. Да гэтага часу не напісана праца, якая б ахапіла ўсю гісторыю знаходжання замежнікаў, аналіз іх жыцця і дзейнасці на беларускіх землях. Але некаторыя аспекты грамадскай дзейнасці замежнікаў знайшлі асвятленне ў працах А. Кіштымава [3–5], Н. Філюты [6], В. Урублеўскага [7], М. Ялінскай [8], С. Рындзіна [9]. Так, А. Кіштымаў асноўную ўвагу ў сваіх працах надае прадпрымальніцкай дзейнасці замежных падданых у XIX – пачатку XX стагоддзя. Асаблівую каштоўнасць уяўляе зборнік дакументаў «Замежныя падданыя ў Беларусі», выдадзены ў 2012 годзе Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі. У гэтай працы змяшчаюцца архіўныя дакументы, якія адлюстроўваюць розныя аспекты жыцця і дзейнасці замежнікаў на тэрыторыі беларускіх губерняў з канца XVIII да пачатку XX стагоддзя [10].

Колькасны склад замежных падданых беларускіх губерняў у канцы XIX стагоддзя можна выявіць па наяўных статыстычных даных, атрыманых у выніку правядзення першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расіі ў 1897 годзе. Матэрыялы перапісу сведчаць, што ў пяці беларускіх губернях пражывала 13 468 чалавек, якія адносіліся да катэгорыі "замежныя падданыя". На першым месцы па колькасці пражывання замежнага насельніцтва стаяла Мінская губерня (5127 чал.), далей ішлі Гродзенская (4722 чал.), Віленская (1814 чал.), Віцебская (1098 чал.) губерні, найменшая колькасць замежнікаў пражывала на тэрыторыі Магілёўскай губерні (усяго толькі 707 чал.). Такім чынам, прадстаўнікі іншых дзяржаў ад агульнай колькасці наяўнага насельніцтва (8 518 347 чал.) складалі прыблізна 0,15 %. Сярод дзяржаў, падданыя якіх пражывалі ў беларускіх губернях, на першым месцы стаялі Германія, Аўстра-Венгрыя. Прыязджалі таксама грамадзяне Францыі, Швейцарыі, Бельгіі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Турцыі, Італіі, Іспаніі, Персіі і інш. Так, выхадцы з Аўстра-Венгрыі ў Мінскай губерні, паводле перапісу 1897 года, налічвалі 693 чалавекі, з іх 378 мужчын і 315 жанчын [11].

Размеркаванне насельніцтва па роднай мове, паводле перапісу, таксама дапамагае вызначыць колькасць замежнага насельніцтва, якое пражывала ў беларускіх губернях у канцы XIX стагоддзя. Аднак гэты паказчык дапамагае даследаваць толькі тэрытарыяльнае паходжанне замежніка і яго народнасць. Замежнікі, якія перайшлі ў падданства Расійскай імперыі, працягвалі карыстацца сваей роднай мовай. Так, дадзеныя перапісу сведчаць, што 27 311 чалавек назвалі нямецкую мову роднай. Носьбітаў чэшскай мовы налічвалася 868 чалавек. У Мінскай губерні, якая стаяла на першым месцы па колькасці чэшскага насельніцтва, пражывала 652 чалавекі. Чэшская народнасць складала 0,03 % ад усяго насельніцтва губерні. У сваю чаргу, нямецкае насельніцтва – 0,19 %. Менш за ўсе чэхаў пражывала ў Віцебскай губерні – усяго толькі 26 чалавек. Французскую мову сваей роднай мовай прызналі 524 чалавекі, англійскую – 74, турэцкую – 156, шведскую – 65, італьянскую – 25 чалавек [11].

**Асноўная частка.** Адным з важнейшых паказчыкаў прававога становішча замежнікаў з'яўляліся правілы ўезду і выезду з тэрыторыі дзяржавы. Пропуск асоб, якія перасякалі межы Расійскай імперыі, выrabляўся мытнымі ўстановамі або чынамі асобнага корпуса жандармаў. Права свабоднага ўезду і пражывання замежнікаў у заходніх губернях ажыццяўлялася на падставе агульнарасійскіх правіл, вызначанных Уставам аб пашпартах і Уставам мытным. Існавалі дзве катэгорыі неабходных дакументаў для пропуску замежнікаў на тэрыторыю Расійскай імперыі: першая – пашпарт расійскіх місій і консульстваў, якія знаходзяцца ў замежных дзяржавах, другая – засведчанны імі нацыянальны пашпарт. Пры адсутнасці дадзеных дакументаў замежнікі падлягалі высылцы [12, с. 60–61]. Для вяртання замежніка ў Расію не патрабавалася новага засведчання місій і консульстваў, калі ў пашпарце меўся надпіс аб выдачы асаблівага рускага віда на жыхарства. Пратэрмінаваным лічыўся нацыянальны пашпарт, пасля консульскай візы якога прайшло больш за 6 месяцаў. Віды на жыхарства і перамяшчэнне ў Расіі выдаваліся замежнікам тэрмінам на адзін год. Па заканчэнні гэтага тэрміну іншаземец абавязаны быў атрымаць новы пашпарт у губернатара той губерні, у якой ён знаходзіўся [2, с. 39–40].

Але згодна з артыкулам 219 Устава аб пашпартах існаваў спіс асоб, якіх не дапускалі да ўезду ў расійскія губерні: тыя, якім урад пайменна забараняў уезд на тэрыторыю дзяржавы; у дачыненні да якіх, па звестках пасольстваў, місій і консульстваў, меліся прычыны прызнаваць іх нядобранадзейнымі; езуіты, цыгане, катрыншчыкі, разносчыкі аптэчных матэрыялаў і гіпсавых фігур і наогул людзі валацужныя. У рускае падданства не маглі ўступаць: 1) замужнія іншаземкі асобна ад мужа, 2) яўрэі, 3) дэрвішы. Сярод замежных яўрэяў уезд у Расійскую імперыю дазваляўся тым, якія прыязджалі з мэтай ажыццяўлення працоўнай дзейнасці, у гэтым выпадку яны маглі быць прыняты нават у расійскае падданства [13, с. 60–61].

Рускае падданства набывалася рознымі шляхамі: нараджэннем ад рускіх падданых, натуралізацыяй (укараненне), а для іншаземак – шлюбам з рускім падданым. Адрозніваюць звычайную і надзвычайную натуралізацыю. Згодна з звычайнай натуралізацыяй, прыняццю падданства павінна было папярэднічаць «змяшчэнне» замежніка ў межах імперыі. Прашэнне аб «змяшчэнні» падавалася начальніку губерні, у якой іншаземец жадаў пасяліцца. Начальнік губерні выдаваў пасведчанне, якое служыла доказам пачатку яго знаходжання ў губерні. Па заканчэнні пяцігадовага тэрміну прашэнне аб прыняцці падданства падавалася ў Міністэрства ўнутраных спраў і павінна было змяшчаць указанне аб роду дзейнасці, якім жадаў займацца замежнік. Прыкладалася пасведчанне аб змяшчэнні, ладзе жыцця і акт стану просьбіта. Жонка прыпісвалася да стану свайго мужа. Ад замежніка мужчынскага полу патрабавалася пасведчанне аб праходжанні вайсковай павіннасці або вызваленні ад яе. Міністэрства магло задаволіць прашэнне або адмовіць у прыняцці падданства [10, с. 65–66]. Прыняцце падданства суправаджалася прысягай, якая вымаўлялася ў прысутнасці губернскага праўлення, духоўнай асобы таго веравызнання, да якога належыць іншаземец або старэйшы член праўлення.

Надзвычайная натуралізацыя прадугледжвала скарачэнне тэрміну папярэдняга змяшчэння, нават здзейсненае яго скасаванне. Для замежнікаў, якія аказалі Расіі асаблівыя паслугі або вядомыя выдатнымі талентамі, асаблівымі навуковымі ведамі, ці якія змясцілі значныя капіталы ў рускія прадпрыемствы, тэрмін папярэдняга змяшчэння мог быць скарочаны па меркаванні міністра ўнутраных спраў [10, с. 66]. Дзеці рускіх падданых, якія былі замужам за замежнікамі, але аўдавелых або разведзеных, і дзеці замежнікаў, якія нарадзіліся альбо пасяліліся і атрымалі выхаванне ў Расіі, ці якія нарадзіліся за мяжой, але навучаліся ў рускіх вышэйшых або сярэдніх навучальных установах, набывалі права прыняць прысягу на падданства Расіі, калі таго пажадаюць, ці паступіць на рускую службу на працягу года па дасягненні імі паўналецця. Калі яны прапускалі гэты тэрмін, то падпарадкоўваліся правілам звычайнай натуралізацыі. У любы час і без усялякага тэрміну маглі прымаць рускае падданства замежнікі, якія знаходзіліся на рускай службе [14, с. 13].

Замежнікі, прынятыя ў рускае падданства, набывалі ўсё правы і неслі ўсе абавязкі падданых у адпаведнасці з тым саслоўем, да якога яны залічваліся. Выхад з рускага падданства адбываўся ці сам сабой па праву, ці шляхам адмысловага звальнення. Само сабой спынялася падданства ў выпадку выхаду рускай падданай замуж за замежніка або ў выпадку аўдавення ці скасавання шлюбу. Такая былая руская падданая магла зноў вярнуцца ў ранейшае падданства з дапамогай простага пасведчання перад

мясцовым губернатарам аб спыненні шлюбу з замежнікам. Звальненне з рускага падданства здзяйснялася на падставе спецыяльнага дазвалення імператара, запрошанага міністрам унутраных спраў праз Савет міністраў. Самавольны пераход у замежнае падданства караўся. Дзеці замежных грамадзян, якія нарадзіліся да прыняцця прысягі, не прызнаваліся падданымі Расіі. Паўналетнія дзеці самі заяўлялі пра сваё жаданне ўступіць у падданства і вымавіць прысягу на ільготных умовах [10, с. 67].

Многія даследчыкі схіляюцца да думкі, што дзяржава імкнулася максімальна ўраўнаваць прававы статус іншаземцаў са становішчам рускіх падданых, аднак нярэдка адбываліся ўнутры- і знешнепалітычныя працэсы, якія ўплывалі на ўвядзенне абмежавальных мер у адносінах да іншаземцаў або пашырэнне іх удзелу ў розных сферах грамадскага жыцця. Расійскае заканадаўства не лічыла натуралізаваных замежнікаў «сапраўднымі» падданымі, такімі ж як і рускіх падданых па нараджэнню. У многіх крыніцах іншаземец так і называўся «іншаземец, які прыняў прысягу на падданства». Натуралізаваны іншаземец займаў прамежкавы стан паміж падданымі і замежнікамі. Так, У. Мікалаеў лічыў, што натуралізаваныя іншаземцы – гэта адна з катэгорый замежнікаў, прававы стан якіх адрозніваўся ад “прыродных” падданых [15, с. 54]. За імі прызнавалася права на бесперашкодны выезд на радзіму. Нярэдка здаралася, што іншаземец, які прыняў прысягу на падданства, знаходзіўся ў такім жа становішчы, як і непрысягнуты замежнік. Даследчык М. Каркуноў, наадварот, адзначаў, што расійскае заканадаўства добразычліва ставілася да пытанняў ураўнавання правоў замежнікаў і расійскіх падданых, забяспечвала першым шэраг палітычных правоў: удзел у дзяржаўнай службе па вучэбным ведамствам, саслоўныя правы [16].

Менавіта да сярэдзіны XIX стагоддзя праходзіла сістэматызацыя заканадаўства па замежным падданым. Прававы статус іншаземцаў мог адрознівацца ў залежнасці ад маемаснага стану, паходжання, веравызнання, нацыянальнасці, мэты прыезду. Кожная катэгорыя мела свае асаблівасці, якія датычыліся парадку ўступлення ў расійскае падданства, парадку знаходжання ў губернях, правоў і абавязкаў [12, с. 59]. Так, заканадаўства Расійскай імперыі вылучала наступныя катэгорыі замежных грамадзян: замежныя дваране, замежнае духавенства, замежныя каланісты, замежныя рамеснікі, замежныя купцы і замежныя яўрэі.

Замежнымі дваранамі па расійскаму заканадаўству прызнаваліся «дваране, у ліку якіх павінны разумецца шляхціцы, падданыя іншых дзяржаў, калі яны пацвердзяць сваё дваранства». Доказам стану служылі дыпломы і пасведчанні, выдадзеныя замежнымі ўрадамі [13, с. 291]. Замежнікаў, якія прысягнулі на падданства Расіі і прасілі аб прыняцці іх у расійскае дваранства згодна з дыпломам сваіх краін, залічвалі да дваранства на падставе заслуг, аказаных расійскаму ўладару і дзяржаве, або пасля дасягнення чыноў, пры якіх гэта званне прысвойвалася карэнным падданым. Пры гэтым замежнікі, дасягнуўшыя на расійскай службе чын, які прыносіць спадчыннае дваранства, але яшчэ не прысягнуўшыя на падданства Расіі, не маглі быць ні самі, ні іх нашчадкі зацверджаны ў дваранскай годнасці, пакуль не прымуць прысягі на падданства Расіі [2, с. 2–3]. Так, паводле перапісу 1897 года ў Мінскай губерні было зарэгістравана 99 патомных і 16 асабістых замежных дваран [11]. Замежных дваран, якія мелі дакументы аб сваім паходжанні і прысягнулі на падданства Расіі, дазвалялася спецыяльным рашэннем Кіраўнічага Сената прымаць на грамадзянскую службу з атрыманнем трэцяга разрада канцылярскіх служачых. Замежныя дваране ў выпадку злачынстваў не падвяргаліся цялесным пакаранням.

Прававое становішча замежных духоўных асоб рэгламентавалася Уставам замежных веравызнанняў. Замежнае духавенства рымска-каталіцкага веравызнання прымалася на службу ў манастыры, духоўныя і свецкія вучылішчы, яму дазвалялася ўдзельнічаць у ажыццяўленні рэлігійнага культу толькі з дазволу епархіяльнага кіраўніцтва і Міністэрства ўнутраных спраў. Напрыклад, займаць месца пастара і весці прапаведніцкую дзейнасць замежнікі маглі толькі на падставе пасведчання аб прыняцці падданства. Духоўныя асобы замежных веравызнанняў, запрошаныя па распараджэнні Міністэрства ўнутраных спраў на службу ў Расію, дапускаліся да прыняцця прысягі на падданства ў любы час [2, с. 4–5].

Яшчэ 7 ліпеня 1798 года ў Беларускае губернскае праўленне быў накіраваны Указ Кіраўнічага Сената аб парадку знаходжання ў губернях замежных гандляроў. Было загадана памежным губернатарам строга сачыць за ўсімі прыезджымі чужакамі: “кто из торгующих иностранцев, выехавших из России, или вовсе не бывших, пожелают в оную въехать, таковой должен снабдить себя двумя видами…: рекомендациею к какому-либо Российскому или Иностранному в России пребывающему торговому дому, или к кому-либо известному в торговле обращающемуся…, и свидетельством от одного из Министров Двора Нашего или котораго-либо из Наших Консулов” [10, с. 21]. Да канца XIX стагоддзя дзейнічала становішча, паводле якога замежнікі, якія жадаюць уступіць у Расіі ў першую купецкую гільдыю, павінны былі мець пасведчанне аб тым, што яны хрысціяне. Замежным рамеснікам было дазволена ўступаць у цэхі пасля зацвярджэння мясцовымі казеннымі палатамі. Яны абавязаны былі падаць пасведчанне ад цэха іншага горада або атэстат навучальнай установы.

Што датычыць замежных каланістаў, то сярод іх вылучаюць сельскіх працоўных і пасяленцаў. Яны запрашаліся ўрадам і мясцовымі памешчыкамі для заняткаў у сельскагаспадарчай вытворчасці, удасканалення прыёмаў апрацоўкі зямлі, развядзення новых культур і парод жывёл, для ўдзелу ў кіраванні ма-

ёнткамі і гаспадаркамі. Практыка запрашэння замежных каланістаў у расійскія губерні вядома ячшэ з часоў праўлення Пятра І і Кацярыны ІІ. Існавалі замежныя калоніі двух тыпаў: на казенных землях і на землях, якія замежнікі набылі ў маемасць. Правы замежных каланістаў рэгламентаваліся Уставам аб калоніях замежнікаў. Усім землеўласнікам 18 снежня 1861 года надавалася права наймаць замежных працоўных. Указ Сената ад 28 чэрвеня 1873 года дазваляў мінскаму губернатару В.Н. Токараву вызваліць чэшскіх пасяленцаў ад выплаты казённых мыт, калі тыя прынялі расійскае падданства і жадаюць набыць маёнткі ў памешчыкаў польскага паходжання [8, с. 72]. Нягледзячы на наяўныя прывілеі для замежнікаў, якія знаходзіліся ў Расіі, усталёўваліся абмежаванні ў правах на набыццё ва ўласнасць, валоданне або карыстанне маёмасцю. У адпаведнасці з Указам ад 14 сакавіка 1887 года ў Віленскай, Віцебскай, Мінскай, Гродзенскай губернях замежнікі не маглі набываць права ўласнасці на нерухомасць.

Асобы статус мелі паводле расійскага заканадаўства замежныя яўрэі. Па агульнаму правілу, займацца гандлёвай справай замежным яўрэям не дазвалялася. Аднак існаваў шэраг выключэнняў у адносінах да тых яўрэяў, хто быў “вядомы па свайму становішчу ў грамадстве і па вялікім гандлёвым абаротам”. Замежным яўрэям для таго, каб гандляваць у губернях імперыі, ствараць банкірскія канторы і наладжваць фабрыкі, а таксама набываць нерухомасць, неабходна было атрымаць адмысловы дазвол міністэрстваў фінансаў, унутраных і замежных спраў. Дадзеная катэгорыя мела магчымасць набываць і наймаць нерухомыя ненаселеныя маёнткі [3].

**Заключэнне.** У другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя ў беларускіх губернях Расійскай імперыі склаўся механізм прававога рэгулявання статусу замежных грамадзян. У заканадаўстве не існавала істотных адрозненняў у правах паміж замежнікамі і расійскімі падданымі. Аднак натуралізаваныя замежнікі не лічыліся «сапраўднымі» падданымі. Усе мерапрыемствы, якія праводзіліся заканадаўчай уладай і рэгламентавалі пражыванне замежных падданых у беларускіх губернях, насілі агульнарасійскі характар. Прававое становішча іншаземцаў адрознівалася ў залежнасці ад маёмаснага стану, роду заняткаў, веравызнання і мэты прыезду. Істотна абмяжоўваліся замежнікі, якія пражывалі ў заходніх губернях, у сферы маёмасных правоў, у свабодзе перамяшчэння. Былі арганізаваны меры па кантролю за перамяшчэннем іншаземцаў у губернях.

## ЛІТАРАТУРА


1. Шауро, И.Г. Возникновение и развитие института подданства в России в XVI – начале XX века: автореф. дис. … канд. юрид. наук / И.Г. Шауро. – М., 2013. – 27 с.
2. Мыш, М.И. Об иностранцах в России: сб. узаконений, трактатов и конвенций, с относящимися к ним правительственными и судебными разъяснениями / М.И. Мыш. – СПб., 1888. – 561 с.
3. Киштымов, А.Л. Германские капиталы и немецкие предприниматели в экономике Беларуси XIX – начала XX в. / А.Л. Киштымов // Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 7. Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы; рэдкал.: Л. Кулажанка [і інш.]. – Мінск, 1996. – С. 13–21.
4. Киштымов, А.Л. Турецкие капиталы и турецкие предприниматели в экономике Минска начала XX века / А.Л. Киштымов // Беларусь – Турция: пути сотрудничества: материалы междунар.-науч. практ. конф., Минск, 8 дек. 2009 г. – Минск: Четыре четверти, 2010. – С. 92–97.
5. Кіштымаў, А.Л. Удзел замежных прадпрымальнікаў і фінансістаў у развіцці прамысловасці транспарту Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / А.Л. Кіштымаў // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, 1999. – Мінск, 1999. – С. 57–63.
6. Филюта, Н.М. Чешский и словацкий этносы в истории Беларуси (XIX – начало XXI в.) / Н.М. Филюта // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф.; редкол.: Т.А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2011. – С. 219–223.
7. Урублеўскі, В.В. Род галандскіх дваран Гартынгаў на Беларусі / В.В. Урублеўскі // Архіварыус: зб. навуковых паведамленняў і артыкулаў. Вып. 7; рэдкал.: Ю.М. Бохан [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 258–266.
8. Елинская, М.М. Источники о дворянских родах западноевропейского происхождения в белорусских губерниях конца XVIII – начала XX в.: автореф. дис. … канд. ист. наук / М.М. Елинская. – Минск, 2005.
9. Рындин, С.Н. Этнические немцы на территории Беларуси в конце XIX – начале XXI века / С.Н. Рындин // Актуальные вопросы философии, истории и политологии: междунар. заочная науч.-практ. конф., Россия, Новосибирск, 28 янв. 2013 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://sibac.info/index.php/2009-07-01-10-21-16/6236. – Дата доступа: 21.01.2014.
10. Иностранные подданные в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / сост. И.Л. Вернер; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: Тип. Макарова и К°, 2012. – 528 с.

11. Первая Всеобщая перепись населения Российской Империи 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. Т. I. Общий свод по Империи результатов разработки данных Первой Всеобщей переписи населения, произведенной 28 января 1897 года. – СПб., 1905. – Табл. VIII. Распределение населения по сословиям и состояниям.
12. Тесленко, А.М. Правовой статус иностранцев в России (вторая половина XVII – начало XX в.): дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / А.М. Тесленко. – Екатеринбург, 2000. – 226 с.
13. Свод уставов о паспортах и беглых 1833 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – Т. XIV, № 10102.
14. Свод законов Российской Империи. Законы о состояниях Т. IX. – СПб.: Гос. тип., 1857. – 572 с.
15. Николаев, В.Б. Подданство Российской империи: его установление и прекращение: (историко-правовой анализ): дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / В.Б. Николаев. – Нижний Новгород, 2008. – 205 с.
16. Коркунов Н.М. Русское государственное право: Введение и общая часть. Т. 1 / Н.М. Коркунов; под ред. и с доп.: З.Д. Авалов, М.Б. Горенберг, К.Н. Соколов. – 6-е изд. – СПб.: Тип. М.М. Стасюлевича, 1908. – 623 с.
17. Вишняков-Вишневецкий, К.К. Иностранцы в структуре петербургского предпринимательства (1860-е гг. – 1914 г.): дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / К.К. Вишняков-Вишневецкий. – СПб., 2005. – 509 с.
18. Градовский, А.Д. Начала русского государственного права / А.Д. Градовский. – М., 1892. – Т. 1: О государственном устройстве. – 441 с.
19. Жукова, С.А. Иностранцы в Москве на рубеже XIX–XX вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / С.А. Жукова. – М., 2012. – 30 с.
20. Позняк, Т.З. Иностранные подданные в городах Дальнего Востока России (вторая половина XIX – начало XX в.): автореф. дис. … канд. ист. наук / Т.З. Позняк. – Владивосток, 2001. – 30 с.
21. Позняк, Т.З. Иностранные подданные в городах Дальнего Востока России (вторая половина XIX – начало XX в.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Т.З. Позняк. – Владивосток, 2001. – 459 л.
22. Смирнов, С.А. Правовое регулирование иностранного предпринимательства в России во второй половине XIX – начале XX века: дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / С.А. Смирнов. – Волгоград, 2002. – 164 л.
23. Таможенный устав 1857 г. // Свод законов Российской империи. – СПб. – Т. 6: Уставы таможенные 1857.
24. Тесленко, А.М. Правовой статус иностранцев в России (вторая половина XVII – начало XX в.): дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / А.М. Тесленко. – Екатеринбург, 2000. – 226 с.
25. Устав о паспортах: [Внесены узаконения, обнар. по 31 дек. 1903 г.]. – СПб.: Гос. тип., 1903. – 126 с. – (Свод законов Российской империи. – Т. 14).

*Пастуniў 24.06.2014*

**LEGAL STATUS OF FOREIGN SUBJECTS IN BELARUSIAN PROVINCE IN SECOND HALF OF THE XIX CENTURY – THE BEGINNING OF THE XX CENTURY**

***A. POTRASAVA***

*The second half of XIX – the beginning of the twentieth century – the period of active reform in the legislation of the Russian Empire, which concerned the rights of foreigners. In the article the legal status of foreigners is investigated. It can vary depending on the property status, ancestry, religion, nationality, purpose of visit. The main categories of foreign nationals in the Belarusian provinces under the law were foreign nobles, clergy, colonists, artisans, merchants and Jews. The possibilities to purchase Russian citizenship and to exit from it are considered. One way of acquiring citizenship is the naturalization, which is divided into ordinary and extraordinary. The state strives to equalize the legal status of foreigners with the position of Russian citizens. Policy towards foreign nationals in the Belarusian provinces in the second half of XIX – the beginning of the XX century wore empire-wide character with some restrictions on the right of ownership fixed assets.*

**УДК 903/904(476.6)**

# З ГІСТОРЫІ ВЫВУЧЭННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ БАСЕЙНА РАКІ ШЧАРЫ

***А.М. МАКСІМОВІЧ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуецца гісторыя археалагічных помнікаў эпохі Сярэднявечча на тэрыторыі басейна ракі Шчары. Вылучаны чатыры этапы ў вывучэнні рэгіёна: канец XIX – пач. XX ст.; 1920–40-е гг.; 1950–70-е гг.; 1980-е – пач. XXI ст. У рамках кожнага з этапаў разгледжана дзейнасць асноўных даследнікаў (Ф.У. Пакроўскі, Ф.Д. Гурэвіч, Я.Г. Звяруга, У.Г. Супрун, А.У. Квяткоўская і інш.). Дана адзнака стану даследаванняў (наяўнасць складзенай крыніцазнаўчай базы, шэрагу гіпотэз аб этнічным складзе насельніцтва, эканамічным і культурным развіцці рэгіёна); складзена карта вядомых помнікаў (каля 160, з іх 9 даследавана раскопкамі); вызначаны актуальныя праблемы: праверка і ўдакладненне наяўных гіпотэз, даследаванне сістэмы рассялення, а таксама шляхі іх магчымага рашэння – археалагічнае даследаванне з прыцягненнем метадаў сумежных навук.*

Басейн ракі Шчары – адзін з рэгіёнаў Панямоння. У прыродна-геаграфічным плане яму ўласціва пэўная арганічнасць, якую забяспечвае наяўнасць натуральных межаў: на поўначы – рака Нёман, на захадзе – рака Зальвянка, на ўсходзе – Моўчадзь, на поўдні – рака Ясельда (мал. 1). Гэта акалічнасць часам абумоўлівала адміністратыўны падзел дадзенай тэрыторыі, напрыклад, межы Слонімскага павета Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) праходзілі па лініі азначаных рэк [1, с. 340–341].




Мал. 1. Басейн ракі Шчары – тэрыторыя даследаванняў

У гісторыка-культурным аспекце тэрыторыя басейна ракі Шчары таксама ўяўляе вельмі цікавы рэгіён, які з’яўляўся часткай гэтак званай Чорнай Русі. Да XIII стагоддзя гэта зямля ўваходзіла ў склад Полацкага княства, а пазней – ВКЛ. Доўгі час за валоданне ёю спрачаліся літоўскія і галіцка-валынскія князі, і яе памежны характар, магчыма, знайшоў адлюстраванне ў назве галоўнага мясцовага горада Слоніма, найменне якога, па аднаму з меркаванняў, паходзіць ад слова “ўслон” – заслон, пэўнае засланяючае збудаванне. Значнасць гэтай тэрыторыі абумоўлена ракой Шчарай, якая злучае Палессе з Панямоннем і Прыбалтыкай [2, с. 28; 3, с. 6–7].

Вывучэнне помнікаў басейна ракі Шчары пачалося яшчэ ў XIX стагоддзі і звязана з дзейнасцю беларуска-польскага фалькларыста, этнографа і археолага М. Федароўскага, які праводзіў 1880-х гадах раскопкі ў наваколлях Слоніма. У 1881 годзе ім быў раскапаны курган пад Вішавам (мал. 2: *2*). У кургане было знойдзена каля дваццаці фрагментаў ганчарнай керамікі XI–XII стагоддзяў. Вынікі працы

М. Федароўскага былі апублікаваны ў 1882 годзе З. Глогерам [4; 5, с. 7; 6, с. 84]. Матэрыялы захоўваюцца ў зборах Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве (Польша) [7, с. 126].




Мал. 2. Помнікі басейна ракі Шчары:
**гарадзішчы:** 5 – Збочна, 9 – Слонім, 12 – Маскалі, 16 – Навасёлкі, 22 – Дзярэчын, 26 – Шулякі, 43 – Пархуты, 56 – Асабнякі, 59 – Мяльканавічы, 67 – Шылавічы, 73 – Высацк, 74 – Дзераўная, 77 – Жыровіцы, 87 – Талькаўшчына, 94 – Ніз, 102 – Ягнешчыцы, 111 – Гарадзішча, 112 – Станкевічы, 113 – Вялікае Сяло, 118 – Добры Бор, 123 – Старая Мыш, 136 – Косава, 142 – Свяціца, 143 – Воньki, 144 – Гарадзішча, 145 – Ляхавічы;
**селішчы:** 10 – Каралі, 17 – Навасёлкі, 18 – Сінявічы, 23 – Дзешкавічы, 24 – Казловічы, 36 – Дварэц, 38 – Норцэвічы, 40 – Гарадкі, 42 – Пархуты, 44 – Салавічы, 46 – Чарлёнка, 48 – Дзямянаўцы, 50 – Накрышкі, 52 – Латышы, 54 – Вялікая Воля, 57 – Асабнякі, 60 – Пасінічы, 63 – Парэчча, 65 – Чапялева, 68 – Шылавічы, 69 – Рахавічы, 71 – Высацк, 75 – Кавалі, 78 – Русакова, 80 – Баравікі, 82 – Масілавічы, 84 – Мілошавічы, 85 – Міцькавічы, 86 – Талькаўшчына, 88 – Шундры, 91 – Юхнавічы, 93 – Ніз, 96 – Голі, 99 – Камлявічы, 100 – Ягнешчыцы, 104 – Глоўсевічы, 105 – Забулле, 106 – Залессе, 107 – Сурынка, 108 – Сянькоўшчына, 109 – Ісаевічы, 110 – Гарадзішча, 116 – Падгорная, 117 – Добры Бор, 119 – Колбавічы, 126 – Доўгае, 127 – Пагор'е;
**могільнікі:** 1 – Васілевічы, 2 – Вішава, 3 – Галынка, 4 – Збочна, 6 – Клепачы (воз. Бяздоннае), 7 – Орлавічы, 8 – Паўлавічы, 11 – Маскалі, 13 – Чарлёнка, 14 – Шчара, 15 – Дубраўка, 19 – Клімавічы, 20 – Пустаборы, 21 – Старое Сяло, 25 – Сынкавічы, 27 – Валоўнікі, 28 – Гернікі, 29 – Гнаінскія, 30 – Нагорнікі, 31 – Явар, 32 – Войневічы, 33 – Маркавічы, 34 – Пруд, 35 – Талявічы, 37 – Галаўлі, 39 – Казлоўшчына, 41 – Нянадавічы, 45 – Салавічы, 47 – Дукрава, 49 – Дзямянаўцы, 51 – Накрышкі, 53 – Студзераўшчына, 55 – Вялікая Воля, 58 – Какошчыцы, 61 – Сакалова, 62 – Ганькі, 64 – Хадзявічы, 66 – Чапялева, 70 – Рахавічы, 72 – Высацк, 76 – Піронім, 79 – Міжэвічы, 81 – Баравікі, 83 – Старадзевяткавічы, 89 – Шундры, 90 – Саковічы, 92 – Юхнавічы, 95 – Паўлавічы, 97 – Едначы, 98 – Камлявічы, 101 – Ягнешчыцы, 103 – Бярдовічы, 114 – Моўчадзь, 115 – Стрэлава, 120 – Серабрышча, 121 – Сталовічы, 122 – Уцес, 124 – Белалессе, 125 – Люшнева, 128 – Жытлін, 129 – Сярадава, 130 – Хадакі, 131 – Галік, 132 – Руда, 133 – Альшаніца, 134 – Бялавічы, 135 – Косава, 137 – Сенькавічы, 138 – Святая Воля, 139 – Гошчава, 140 – Завінне, 141 – Марынова, 146 – Гулічы, 147 – Яцкаўшчына, 148 – Куршынавічы, 149 – Мыслабаж, 150 – Перахрэсце, 151 – Падлессе, 152 – Навасёлкі

*Заўвага*: 1–9 – даследаваныя археалагічнымі раскопкамі.

Значныя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Панямоння былі праведзены ў сувязі з падрыхтоўкай да IX археалагічнага з'езда, які адбыўся ў 1893 годзе ў Вільні. З'езду папярэднічала вялікая падрыхтоўчая праца. Была выпрацавана праграма вывучэння старажытнасцей Беларусі і Літвы, якая прадугледжвала праверку наяўных звестак аб археалагічных помніках рэгіёна (курганах, гарадзішчах), пошук і раскопкі новых помнікаў, стварэнне археалагічных карт і збор даных аб прыватных калекцыях, абагуль-

ненне атрыманых матэрыялаў. Для збора патрэбнай інфармацыі была створана спецыяльная анкета, якая павінна была рэгламентаваць апісанне археалагічных аб’ектаў падчас правядзення раскопак і разведак. Гэтая анкета была разаслана ў колькасці некалькіх тысяч экзэмпляраў прадстаўнікам мясцовых адміністрацый і статыстычных камітэтаў, а таксама настаўнікам, святарам і ляснічым [8, с. 6; 9, с. 11].

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні IX археалагічнага з’езда прымаў настаўнік Віленскай гімназіі і захавальнік Віленскага музея старажытнасцей Ф.В. Пакроўскі, які праводзіў даследаванні на беларуска-літоўскім памежжы [10, с. 163]. Падчас падрыхтоўкі да з’езда ён склаў падрабязную археалагічную карту Гродзенскай губерні [11], дзе абагульніў усю наяўную інфармацыю аб курганных і грунтовых могільніках, гарадзішчах, паселішчах, скарбах, асобных знаходках манет і культавых камянях, у тым ліку і старажытнасцях басейна ракі Шчары.

Археалагічную карту Гродзенскай губерні складаў да з’езда і Е.Р. Раманаў, але яна так і не была апублікавана [5, с. 9]. Пра курганы і гарадзішчы Слонімшчыны пісалі выкладчык Свіслацкай настаўніцкай семінарыі І.К. Шуліцкі [12, с. 60–65] і святар Я. Міхайлоўскі [13, с. 165–187]. Апошнім быў часткова раскапаны адзін з чатырох каменных курганоў каля гарадзішча Збочна (мал. 2: *4*). Ён жа часткова раскапаў курган каля вёскі Паўлавічы (мал. 2: *8*) [13, с. 166–167, 173], дзе ў 1962 годзе В. Сядоў даследаваў яшчэ адзін курган [14, с. 49–50]. Паведамляў Я. Міхайлоўскі пра курганны могільнік каля маёнтка Орлавічы (зараз паўночны край вёскі Новаорлавічы Слонімскага раёна) (мал. 2: *7*), курганы якога раскопвалі гаспадары маёнтка. Атрыманыя падчас гэтых раскопак матэрыялы былі перададзены ў Варшаўскі музей [13, с. 179].

Разам з Ф.В. Пакроўскім, І.К. Шуліцкім і Я. Міхайлоўскім археалагічныя помнікі тэрыторыі Панямоння на з’ездзе прадстаўляў В.А. Шукевіч. Свае даследаванні ён пачаў яшчэ ў 1880-я гады. Навукоўца цікавілі ў першую чаргу пахавальныя помнікі правабярэжжа верхняга і сярэдняга цячэння Нёмана. Вывучэннем могільнікаў, непасрэдна басейна ракі Шчары, В.А. Шукевіч не займаўся, але на падставе яго прац упершыню стала магчымым уявіць сабе эвалюцыю пахавальнага абраду на тэрыторыі Панямоння ад эпохі латэна да часу ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Да таго ж В.А. Шукевіч першым узняў праблему даследавання летапіснай Чорнай Русі як гістарычнай з’явы, акцэнтуючы ўвагу на геаграфічным фактары яе засялення [8, с. 7–8; 5, с. 9; 15, с. 431].

Адначасова з В.А. Шукевічам іншы раз тыя ж самыя помнікі даследаваў Э.А. Вольтэр. Археалагічных раскопак ён амаль не праводзіў, але зрабіў апісанне прыватных калекцый З. Глогера, В.А. Шукевіча і М. Федароўскага [8, с. 7–8; 5, с. 9]. Больш вядомы як этнограф і антраполаг, Э.А. Вольтэр прысвяціў шэраг публікацый прусам і яцвягам Гродзенскай губерні [16, с. 1–9; 17, с. 151–160].

Віленскі археалагічны з’езд меў вялікае значэнне ў справе археалагічнага вывучэння не толькі тэрыторыі Панямоння, у тым ліку басейна ракі Шчары, але і тэрыторыі Беларусі ўвогуле. Распрацаваная інструкцыя па абследаванню і раскопкам помнікаў археалогіі рэгламентавала палявую працу даследчыкаў, што садзейнічала не толькі павелічэнню колькасці знаходак, але спрыяла сістэматызацыі і павелічэнню інфарматыўнасці атрыманых матэрыялаў. Навукоўцы праводзілі мэтанакіраваныя даследаванні, вынікі якіх у далейшым былі апублікаваны ў працах Віленскага аддзялення Маскоўскага падрыхтоўчага камітэта [18] і IX археалагічнага з’езда [19; 20].

Неабходна адзначыць, што ў вышэйзгаданых публікацыях разглядаліся пераважна помнікі пахавальнага тыпу, а іншыя іх катэгорыі, за невялікім выключэннем, засталіся па-за ўвагай даследчыкаў.

Такім чынам, на пачатак XX стагоддзя быў назапашаны пэўны фактычны матэрыял. Яго абагульніў у сваіх працах А.А. Спіцын, які займаўся вывучэннем, сістэматызацыяй і публікацыяй старажытнасцей Усходняй Еўропы [21, с. 311]. Спіцын зрабіў агляд помнікаў археалогіі Гродзенскай губерні [22, с. 294–297], у якім інфармацыя размяшчалася ў храналагічным парадку, з каменнага веку да Сярэдневечча. Таксама даследчык сістэматызаваў матэрыялы каменных магіл, якія лічыў пахавальнымі помнікамі Чорнай Русі [23, с. 303–310] і абагульніў усе назапашаныя даныя па археалагічных помніках Прыбалтыкі [24]. З матэрыялаў, якія датычацца басейна ракі Шчары, А.А. Спіцын у сваіх публікацыях узгадвае толькі даследаванні М. Федароўскага пад Слонімам, вынікі якіх былі апублікаваны З. Глогерам.

У 1920–1930-х гадах вывучэннем Панямоння займаліся польскія навукоўцы, супрацоўнікі мясцовых музеяў. Як і ў папярэдні час, даследаванне археалагічных помнікаў басейна Шчары было эпізадычным і не мела мэтанакіравана характару. Працягвалася вывучэнне пераважна пахавальных помнікаў. Так, пад Галынкай (сучасная в. Старая Галынка, Зельвенскі раён) Я. Фітцке былі раскапаны тры курганы (мал. 2: *3*) [7, с. 126]; Р. Якімовіч даследаваў тры курганы пад Орлавічамі (сучасная в. Новаорлавічы, Слонімскі раён) (мал. 2: *7*) [25, s. 214, 223; 7, с. 136–137; 26, s. 152–156]. Усе атрыманыя імі матэ-рыялы захоўваюцца ў зборах польскага Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве і на сённяшні дзень цалкам апублікаваныя [7; 26].

У гэты ж час польскія навукоўцы ўпершыню паставілі перад сабой мэту пошуку першапачатковых цэнтраў старажытных гарадоў. У месцы ўпадзення ракі Ісы ў Шчару спробу знайсці старажытны цэнтр горад Слоніма прадпрыняў заснавальнік гарадскога музея І.І. Стаброўскі [27, с. 112].

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны археалагічныя даследаванні ў рэгіёне спыняюцца. Здабыты за папярэднія гады матэрыял застаўся амаль неапублікаваным, а археалагічныя калекцыі былі разрозненыя і часткова загінулі разам з дакументацыяй раскопак.

Працы аднаўляюцца толькі ў 1950-х гадах. З 1955 года пачынае працу Славяна-Літоўскі атрад Прыбалтыйскай археолага-этнаграфічнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам Ф.Д. Гурэвіч. Даследаваннямі былі ахоплены два берагі Нёмана, археалагічная карта папоўнілася новымі помнікамі [8, с. 11]. Атрыманыя матэрыялы дазволілі даследчыцы скласці меркаванне аб гаспадарцы, культуры і этнічным складзе насельніцтва Панямоння. Гэтай тэме Ф.Д. Гурэвіч прысвяціла сваю манаграфію «Древности Белорусского Понеманья» [8] і шэраг іншых публікацый [28], у якіх разам з іншымі помнікамі разглядае старажытнасці эпохі Сярэднявечча з тэрыторыі басейна ракі Шчары. Асаблівую ўвагу даследчыца надавала вывучэнню гарадоў Чорнай Русі, у тым ліку Слоніму. У сваіх працах Ф.Д. Гурэвіч разглядала пытанні, звязаныя з фарміраваннем гарадоў [29; 30; 31], іх эканамічным развіццём і знешнім гандлем [32; 33], жылымі і гаспадарчымі гарадскімі пабудовамі [34]. У 1955 годзе Ф.Д. Гурэвіч даследавала каменны курган каля вёскі Васілевічы (мал. 2: *1*) і каменную магілу каля вёскі Клепачы, на беразе возера Бяздоннае (мал. 2 :*6*) [8, с. 193; 14, с. 51–54].

Вывучэннем старажытнага Слоніма займаўся таксама Г.І. Пех. У 1946 годзе ў раёне горада ім былі знойдзены фрагменты рэчаў XII стагоддзя (шкляны бранзалет, кавалкі керамічнага посуду). У 1953 годзе ў месцы, дзе былі зроблены знаходкі, даследчык заклаў шурф, у якім выявіўся культурны пласт XII–XVII стагоддзяў [27, с. 112]. У 1959 годзе на тым самым месцы Г.І. Пех правёў раскопкі [35, с. 276–279].

Значны ўклад у археалагічнае вывучэнне тэрыторыі басейна ракі Шчары ўнёс В.Р. Супрун, які праводзіў свае даследаванні ў 1963–1970 гадах. За гэты час ён выявіў і апісаў каля 200 археалагічных помнікаў, сярод якіх селішчы, гарадзішчы, курганныя і бескурганныя могільнікі. Яго справаздачы аб палявых даследаваннях сталі асновай для складання археалагічных карт Гродзенскай і Брэсцкай абласцей [36, с. 332].

У 1966 годзе пачаў працу Верхненёманскі атрад Інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам Я.Г. Звяругі. Галоўнай мэтай было вывучэнне сярэднявечных гарадоў, селішчаў і курганных могільнікаў Панямоння [5, с. 12]. Вынікі шматгадовай працы Я.Г. Звяруга падсумаваў у манаграфіі «Верхнее Понеманье в IX–XIII вв.» [5], у якой паспрабаваў разгледзець старажытнасці балтаў і славян, прааналізаваць іх пахавальныя помнікі, гаспадарку, культуру і вераванні. Шэраг сваіх публікацый Я.Г. Звяруга прысвяціў Слоніму, які даследаваў у 1968 годзе [37; 38; 2]. У выніку археалагічных раскопак на тэрыторыі горада быў сабраны багаты археалагічны матэрыял, які з улікам працы, праведзенай раней Г.І. Пехам, дазволіў вывучыць рэшткі гарадской забудовы XII–XIII стагоддзяў і вырашыць пытанні планіроўкі дзядзінца старажытнага Слоніма.

З мэтай даследавання пластоў XIV–XVIII стагоддзяў у горадзе Слоніме былі праведзены раскопкі ў 1983 (кіраўнікі экспедыцыі Н. Здановіч, А. Краўцэвіч) і 1988 гадах (кіраўнікі І.У. Ганецкая, Н. Здановіч). Даследаванні паказалі, што познесярэднявечныя культурныя напластаванні існуюць у розных частках горада, акрамя таго, была пацверджана наяўнасць пасада XII–XIII стагоддзяў уздоўж левага берага ракі Шчары [27, с. 112; 39, с. 21–22].

З 1981 года даследаванне каменных могільнікаў, у тым ліку і на тэрыторыі басейна Шчары, пачынае А.В. Квяткоўская [14]. Даследчыца вывучала каменныя могільнікі, якія суадносіла з яцвяжскім і прускім насельніцтвам [40; 41]. Вынікі сваёй працы яна абагульніла ў манаграфіі «Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII в.) [42], у якой разгледзела пахавальны абрад, інвентар і храналогію могільнікаў, акрэсліла арэал іх распаўсюджвання. У 1982 годзе каля вёскі Клепачы, на беразе возера Бяздоннае, А.В. Квяткоўскай былі даследаваны адзін каменны курган і 66 каменных магіл (мал. 2: *6*) [14, с. 52, 54–56].

У 1990-х гадах даследаванні на тэрыторыі басейна ракі Шчары праводзіў С.А. Піваварчык. У 1995, 1997–1998 гадах з мэтай вывучэння абарончых канструкцый, удакладнення датыроўкі і функцыянальнага прызначэння ён даследаваў гарадзішча Збочна (мал. 2: *5*), на якое неаднаразова звярталі ўвагу Ф.Д. Гурэвіч, В.Р. Супрун, В.В. Сядоў, але грунтоўных раскопак не праводзілі [43; 44, с. 67–68].

Вынікам даследаванняў 1950–1980-х гадоў з’яўляецца таксама выхад шэрагу абагульняючых прац. Сярод іх археалагічныя карты і зборы помнікаў Ю.У. Кухарэнка [45], Г.В. Штыхава [46], Л.Д. Побаля [47], падрыхтаваны пры ўдзеле супрацоўнікаў аддзела археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» [48; 49], аглядныя працы па археалогіі [50; 51; 52 і інш.]. Аднак непасрэдна тэрыторыя басейна Шчары разглядаецца ў іх павярхоўна, як правіла, пры апісанні старажытнасцей Панямоння.

У апошнія дзесяцігоддзі басейн ракі Шчары амаль не вывучаецца археалагічна, але маюць месца тэарэтычныя даследаванні навукоўцаў, краязнаўцаў і супрацоўнікаў мясцовых музеяў. На базе Слонімскага раённага краязнаўчага музея праводзяцца навуковыя канферэнцыі. Па матэрыялах канферэнцыі 2002 года, прысвечанай 750-годдзю Слоніма, быў выдадзены зборнік навуковых артыкулаў [53].

Такім чынам, у гісторыі вывучэння тэрыторыі басейна ракі Шчары можна вылучыць некалькі этапаў:

1) канец XIX – пачатак XX стагоддзя. Пачатак этапа лагічна звязаць з часам падрыхтоўкі і правядзення IX археалагічнага з’езду ў Вільні. Ён характарызуецца высокім навукова-метадычным узроўнем

(распрацоўка адзінай сістэмы археалагічных даследаванняў) і павелічэннем аб'ёму палявых работ. У гэты час былі складзены археалагічныя карты, якія ахопліваюць амаль усё Панямонне. Даследаваліся пераважна пахавальныя помнікі. Даследаваннем менавіта тэрыторыі басейна ракі Шчары было нязначным;

2) 1920–40-я гады. У сувязі з тым, што Заходняя Беларусь да 1939 года знаходзілася ў складзе Польшчы, асаблівасцю другога этапа з'яўляецца вывучэнне разглядаемага рэгіёна толькі польскімі навукоўцамі. Як і ў папярэдні час, вывучаліся пераважна пахвальныя помнікі, разам з тым былі зроблены першыя спробы ў даследаванні гарадоў, у прыватнасці пошукі іх старажытных цэнтраў. Палявыя даследаванні на тэрыторыі басейна ракі Шчары, за невялікім выключэннем, не праводзіліся;

3) 1950–70-я гады. Трэці вылучаны этап адзначаны інтэнсіфікацыяй археалагічных даследаванняў у рэгіёне, якая звязана з даследчыцкай дзейнасцю Ф.Д. Гурэвіч, Г.І. Пеха, Я.Г. Звяругі, В.Р. Супруна. У гэты час разам з вывучэннем пахавальных помнікаў і гарадзішчаў пачалося шматбаковае даследаванне гарадоў і вясковых паселішчаў. Праводзілася абследаванне берагоў Шчары і яе прытокаў, але грунтоўныя раскопкі на мясцовых помніках, як і раней, заставаліся эпізадычнай з'явай;

4) 1980-я гады – пач. XX стагоддзя. Асаблівасцю чацвёртага этапа стала пашырэнне навуковых інтарэсаў: нараўне з вывучэннем раннесярэднявечных гарадоў, гарадзішчаў, селішчаў і курганоў пачынаецца мэтанакіраванае даследаванне матэрыялаў XIV–XVIII стагоддзяў. Сярод даследчыкаў гэтага часу трэба адзначыць А.В. Квяткоўскую, Н.І. Здановіч, І.У. Ганецкую, С.А. Піваварчыка.

На сённяшні дзень на тэрыторыі басейна ракі Шчары вядома каля 160 помнікаў археалогіі (гл. мал. 2), культурны слой якіх утрымлівае матэрыялы эпохі Сярэднявечча. Сярод іх прыкладна палову складаюць курганныя і бескурганныя могільнікі, другую палову – умацаваныя і неўмацаваныя паселішчы з суадносінамі апошніх 1:2 адпаведна. Раскопкамі была даследавана толькі невялікая частка з іх (табліца; мал. 2: *1–9*).

Помнікі басейна ракі Шчары, даследаваныя раскопкамі

| № | Адміністрацыйная прыналежнасць | Тып помніка | Даследчык, час даследавання | Датыроўка помнікаў | Даследаваная плошча/раскапана пахаванняў |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в. Васілевічы, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны могільнік | Ф.Д. Гурэвіч, 1955 г. | XVI (?) ст. | 1 курган |
1. Ліс, А.С. Структура і семантыка абрадаў. Тыпалогія і паэтыка песень / А.С. Ліс // Каляндарна-абрадавая паэзія; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск, 2001. – С. 169–187.
2. Соколова, В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов XIX – начало XX в. / В.К. Соколова. – М.: Наука, 1979. – 288 с.
3. Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць / рэдкал.: П.Ф. Глебка [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1967. – 392 с.
4. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 247 с.
5. Толстая, С.М. Деды в полесском народном календаре / С.М. Толстая // Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд: тез. докл. / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР; редкол.: Вяч.Вас. Иванов (отв. ред.), Л.Г. Невская. – М., 1985. – С. 81–83.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – 797 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – 910 с.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Выш. шк., 2010. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь: у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – Кн. 1. – 847 с.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне: у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – Кн. 1. – 608 с.
10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / [ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай]. – Мінск: Выш. шк., 2008. – Т. 4: Брэсцкае Палессе: у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – Кн. 1. – 559 с.
11. Никифоровский, Н.Я. Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Типо-Литограф. насл. М.Б. Неймана, [1903]. – [2], 26 с.
12. Троицкий, А. Уклад / А. Троицкий // Литов. епарх. ведомости. – 1875. – 27 июля. – С. 69–70.
13. Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта УА «ПДУ» (АГФФ). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны (ліпень 1996 г.). – Сш. 2. Запісы студэнтаў групы 95-Гіс Гаўрылава В., Далгова Д., Сакалова Ю., Яронька В., Зубровай А., Муляронак Н., Кірычык В., Вярцінскай А., Зайцавай А., Змітрачэнка А., Рублеўскай В.
14. Валодзіна, Т. Буркаўкі / Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 55.
15. Lietuvių literatūros ir tautosakos instituto Lieuvių tautosakos rankraštynas. – B. 7647. Tautosaka 2006 m. liepos mėnesį prie Neris ištakų surinkta Lietuvos ir Baltarusijos mokslininkų grupės, vadovaujamos Vykinto Vaitkevičiaus.

16. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 4. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я.
17. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 5. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я.
18. Лобач, У.А. Сімвалічны статус і рытуальныя функцыі могілак у беларускай народнай культуры вярхоўяў Бярэзіны і Віліі XX – пач. XXI ст. / У.А. Лобач // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманіт. навукі. – 2008. – № 1. – С. 71–82.
19. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: в 3 т. / П.В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. 1, ч. 2: Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.
20. Агапкина, Т.А. Очерки весенней обрядности Полесья / Т.А. Агапкина // Славянский и балканский фольклор: этнолингвистическое изучение Полесья. – М., 1995. – С. 21–107.
21. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 5. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Пастаўскі раёны (4–18 ліпеня 2012 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Лобача У.А., Малюжанца П., Нікалаевай Г., Краснабаева С.
22. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 8. Палявыя этнаграфічныя запісы Аўсейчыка У.Я. (2005–2011 гг.). – Сш. 7. Матэрыялы этнаграфічнай экспедыцыі у в. Гайдукі Пастаўскага раёна (2008–2009 гг.).
23. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 11. Матэрыялы апытання па тэме: «Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння» (2012–2013 гг.).
24. Васілевіч, У. Радаўніца / У. Васілевіч, Л. Дучыц, С. Санько // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 394–395.
25. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – [2], X, 307, 30 с.
26. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Лобача У.А., Зянько В., Шаўчэнка Я.
27. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. – 3-е выд. – Мінск: Беларусь, 2001. – 190 с.
28. Гарошка, Т.Г. Народныя святы, абрады, звычаі / Т.Г. Гарошка // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск, 2001. – С. 593–599.
29. Сінкевіч, І.Л. Песенная спадчына Расоншчыны / І.Л. Сінкевіч // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Расонскага раёна. – Мінск, 1994. – С. 542–546.
30. Полацкі этнаграфічны зборнік / Полац. дзярж. ун-т; [уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача]. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. Ч. 2. – 368 с.
31. Крук, І.І. Народныя абрады і звычаі Верхнядзвіншчыны / І.І. Крук // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Верхнядзвінскага раёна: у 2 кн. – Мінск, 2000. – Кн. 2. – С. 292–319.
32. Шлюбскі, А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны: у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск: Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.
33. Серебренников, Ф. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах / Ф. Серебренников // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. – СПб., 1865. – С. 75–90.
34. Листова, Т.А. Региональная специфика обрядовой культуры (на примере семейных обрядов) / Т.А. Листова // Белорусско-русское пограничье. Этнологическое исследование; отв. ред. Р.А. Григорьева, М.Ю. Мартынова. – М., 2005. – С. 235–348.
35. Аўсейчык, У.Я. Абрад Стаўроўскія Дзяды на Докшыччыне / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – Ч. 2. – С. 111–123.
36. Гурская, Ю.А. Древние фамилии современного белорусского ареала на славянском и балтийском фоне / Ю.А. Гурская. – Минск: Белорус. гос. пед. ун-т, 2007. – 360 с.
37. Chodorowska, I. Świat żywych i umarłych (możliwości transgresji) / I. Chodorowska // Браслаўскія чытанні: матэрыялы 4-й навук.-краязн. канф., Браслаў, 24–25 красав. / Браслаўскае музейнае аб’яднанне, Браслаўскае краязнаўчае таварыства; рэдкал.: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 1997. – С. 133–145.
38. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А., Траццяковай А.
39. Верещагина, А.В. Праздники и таинства в жизни христиан Беларуси / А.В. Верещагина. – Минск: Белорус. наука, 2009. – 232 с.

40. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 3. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Высоцкага С., Шаўчэнка Я., Шыпіла Н., Путронка К.
41. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 4. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Докшыцкі раён (ліпень 2011 г.). – Сш. 2. Запісы Аўсейчыка У.Я.
42. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). – Сш. 6. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Радзюка А., Шаўчэнка Я., Высоцкага С., Шыпілы Н., Путронка К.
43. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 4. Запісы Аўсейчыка У.Я., Круткіна А., Шумілава Дз., Жахоўскага Б., Салаўёва С., Путронка К., Пятрова І., Траццяковай А.
44. АГФФ. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 3. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Глыбоцкі і Ушацкі раёны (5–22 ліпеня 2010 г.). – Сш. 1. Запісы Аўсейчыка У.Я., Філіпенкі У.С., Круткіна А.
45. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнограф. сб. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.
46. Валодзіна, Т. Старац / Т. Валодзіна, У. Лобач // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. – Мінск, 2011. – С. 459–460.
47. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Старцы / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1892. – № 1. – С. 70–105.
48. Аўсейчык, У.Я. Абрад Стаўроўскія Дзяды на Докшыччыне / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т; пад агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – Ч. 2. – С. 111–123.

*Паступіў 02.06.2014*

**FUNERAL RITES OF PADZVINNE BELARUSSIANS AT SPRING PERIOD (ON THE ETHNORGAPFICAL MATERIALS OF THE 19$^{TH}$ – BEGINNING OF THE 21$^{ST}$ CENTURIES)**

***U. AUSEICHYK***

*On the basic of the ethnographical materials of the 19$^{th}$–20$^{th}$ centuries it is devoted the funeral rites of Padzvinne belarussians at spring period. The funeral traditions are analyzed at Maslianitsa and Verbnitsa Dziady, as the rites of consideration of forefathers at Easter, Radaunitsa and Holy Trinity. The characteristic of variants of rites names is given, their areas are determined, the order of ritual actions is considered, the modern position of the rites is characterized, their region particularities and local differences in Padzvinne are exposed. The new field materials are drawn to the ethnological studies, the part of them is fixed by the author. The results of research can be used for the learning of world outlook and religion beliefs as for solutions of problems in the ethnic history of the region.*

**УДК [39:636+636] (=161.3) (091) “18/19 4…”**

# СТАН І ДЫНАМІКА РАЗВІЦЦЯ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў БЕЛАРУСАЎ (канец XIX – 40-я гады XX ст.)

***Л.П. СІВУРАВА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Аналізуецца значэнне жывёлагадоўлі ў гаспадарчым жыцці беларусаў у канцы XIX – 40-х гадах XX стагоддзя. Удакладняюцца яе асноўныя функцыі. Выяўляюцца прычыны змен у развіцці жывёлагадоўлі, якія адбываліся пад уплывам грамадска-палітычных падзей першай паловы XX стагоддзя. Паказана, што працэсы стабілізацыі жывёлагадоўчай гаспадаркі паскорыліся ў 1933–1940 гадах, калі з боку дзяржавы пачала аказвацца пэўная дапамога жыхарам вёскі ў набыцці свойскай жывёлы для прысядзібных гаспадарак, вялася работа па паляпшэнні парод гэтай жывёлы.*

**Уводзіны.** Важнае месца ў гаспадарчай дзейнасці беларусаў мела жывёлагадоўля. Сяляне ўтрымлівалі кароў, коней, свіней, авечак, коз і інш. “Багацейшыя сяляне мелі па 2–3 кані, 3–4 каровы, 5–7 свіней, 8–10 і больш авечак, сераднякі – усяго гэтага напалову, а бяднейшыя па 1 каню, 1 карове альбо і зусім нічога не мелі” [1, с. 22–24]. Галоўнай галіной жывёлагадоўлі на большай частцы земляробчай тэрыторыі з’яўлялася гадоўля буйной рагатай жывёлы. Яе пагалоўе ў розныя гістарычныя перыяды вагалася і залежыла ад розных прычын (неўраджайныя перыяды, ваенныя дзеянні, міграцыя насельніцтва, моравыя хваробы і іншыя фактары). Колькасны склад свойскіх жывёл знаходзіўся ў залежнасці ад прыродна-кліматычных умоў, нацыянальна-культурнага складу насельніцтва, наяўнасці кармавой базы і іншых фактараў.

Бібліяграфію праблемы сладаюць матэрыялы дарэвалюцыйнага перыяду, у першую чаргу, “Памятныя кнігі” беларускіх губерняў, сельскагаспадарчая і перыядычная літаратура 20–30-х гадоў XX стагоддзя, крыніцы пасляваеннага часу, даследаванні беларускіх навукоўцаў апошняй чвэрці XX стагоддзя. У перыядычнай літаратуры 20–30-х гадоў XX стагоддзя, у прыватнасці часопісах “Наш край” (1926–1930), “Плуг” (1926–1929), змяшчаліся матэрыялы аб перадавых спосабах вядзення сялянскай жывёлагадоўлі, папярэджанні хвароб, ветэрынарнай дапамозе, паляпшэнні парод свойскіх жывёл, арганізацыі малочна-жывёлагадоўчых таварыстваў і развіцці малочнай кааперацыі, прыводзіліся звесткі аб якасці і колькасці свойскай жывёлы ў аднаасобных і калектыўных гаспадарках, спосабах яе догляду і кармлення. Аўтарамі артыкулаў былі ветэрынары, аграномы, пісьменныя сяляне і хутаране з розных рэгіёнаў Беларусі.

У 20-я – 30-я гады XX стагоддзя Сельгассектар Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі выпусціў серыю матэрыялаў “Сялянская бібліятэка” з мэтай распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў сярод насельніцтва. Калгаснікам і рабочым саўгасаў, а таксама сялянам, якія вялі аднаасобную гаспадарку, адрасаваліся папулярныя кніжкі, памяткі, дапаможнікі па доглядзе свойскай жывёлы Мітэцкага і Іваноўскага, М. Томэ і А. Дзіямідава, А. Юрмаліата і інш. [2–4].

Серыю папулярных матэрыялаў па тэме дапаўняюць кніжкі-дапаможнікі Дзяржаўнага ваеннага выдавецтва БССР, якія былі прысвечаны догляду коней і адрасаваліся чырвонаармейцам кавалерыйскіх дывізій. У сваёй “Памятцы чырвонаармейцу” М. Федасееў распавядаў пра ўтрыманне коней, службу абозаў, правілы догляду абознага каня і павозкі, там жа змяшчаліся звесткі пра запражку, выездку і з’ездку коней, патрабаванні да іх кармлення, паення, купання, чысткі памяшканняў, даваліся апісанні хвароб, тлумачыліся правілы аказання першай даветэрынарнай дапамогі жывёле “ў баявой абстаноўцы” [5].

Некаторыя даследчыкі разглядалі жывёлагадоўлю як галіну гаспадарчай дзейнасці. Аналіз яе статыстычных паказчыкаў у Літве і Заходняй Беларусі за 1811–1861 гады зрабіў М. Улашчык [6]. Этнагеаграфічныя асаблівасці развіцця жывёлагадоўлі на тэрыторыі Беларусі выдзеліў В.С. Цітоў у рабоце “Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов” (1993). Ён прыйшоў да высновы, што тэрытарыяльныя адметнасці жывёлагадоўлі на беларускіх землях праяўляліся ў ступені развітасці жывёлагадоўлі і яе ролі ў гаспадарчым жыцці мясцовага насельніцтва, яе ўнутранай структуры, працоўных навыках і звычаях, умовах утрымання жывёл, характары выкарыстання прадуктаў жывёлагадоўлі, у яе канкрэтнай сувязі з хлебаробствам і сялянскімі промысламі, якія ў комплексе характарызавалі гаспадарча-побытавы і этнакультурны ўклад жыцця беларусаў [7, с. 90−91].

Хаця пазначаныя крыніцы і раскрываюць многія аспекты развіцця жывёлагадоўлі, аднак яны ахопліваюць пэўныя храналагічныя рамкі. Жывёлагадоўчыя заняткі вельмі сцісла аналізаваліся з пункту гледжання этналогіі. Па-за ўвагай даследчыкаў засталіся працэсы развіцця жывёлагадоўлі як асобнай галіны сельскай гаспадаркі беларусаў у перыяд грамадска-палітычных пераўтварэнняў першай паловы XX стагоддзя. Мала ілюстраваліся колькасныя і якасныя паказчыкі развядзення пэўных відаў свойскай жывёлы (коней, валоў і інш.), не раскрыта абумоўленасць характару і форм жывёлагадоўлі ў гэты перыяд грамадска-палітычнымі працэсамі. Мэта дадзенай работы – прасачыць дынаміку развіцця жывёлагадоўлі, у першую чаргу развядзення буйной рагатай жывёлы і коней у сялянскіх гаспадарках беларусаў у канцы XIX – 40-я гады XX стагоддзя.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** У беларускіх губернях, якія ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ўваходзілі ў склад царскай Расіі, жывёлагадоўля была развіта слаба. Сялянскія гаспадаркі мелі малапрадуктыўную беспародную жывёлу. Высокапрадуктыўную жывёлу культурных парод разводзілі толькі асобныя памешчыкі і кулакі. "Памятная книжка Виленской губернии на 1888 год" паведамляла: "У 1886 годзе на 1 267 375 чалавек насельніцтва свойскай жывёлы ўтрымлівалася 1 253 344 галавы, а менавіта: коней 205 530, рагатай жывёлы 387 545, авечак звычайных 341 315, танкарунных 10 087, свіней 271 888, коз 36 979" [8, с. 113]. У 1890 годзе свойскіх жывёл налічвалася 1 240 481 галоў, у тым ліку 219 798 коней, 417 151 буйной рагай жывёлы, авечак простых 325 153 і танкарунных 6 700, свіней 237 070, коз 34 608 [9, с. 10].

Статыстыка аб колькасці буйной рагатай жывёлы ў Віцебскай губерні, з іх ліку дойных кароў, і аб'ёме малакавытворчасці ў прыватных гаспадарках даецца ў "Справаздачы аб дзейнасці таварыства віцебскіх сельскіх гаспадароў за 1901 год" [10, с. 69].

Колькасць буйной рагатай жывёлы ў беларускіх губернях у 1901 годзе

| Паказчыкі | Беларускія губерні | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Віцебская | Мінская | Смаленская | Магілёўская |
| Колькасць буйной рагатай жывёлы на 100 душ | 37 | 34 | 33 | 27 |
| Колькасць дойных кароў на 100 душ | 18 | 17 | 16 | 14 |
| Колькасць малака ў вёдрах на жыхара ў год | 11 | 10 | 10 | 8 |

Жывёлагадоўля мела важнае значэнне ў сельскай гаспадарцы Мінскай губерні. У 1909 годзе тут налічвалася 2 452 747 галоў свойскіх жывёл; у тым ліку 353 515 коней, 915 885 буйной рагатай жывёлы, простых авечак 597 472, тонкарунных 12 689, свіней 558 363 і коз 14 823. Коней утрымлівалі для выканання палявых і транспартных работ. Буйная рагатая жывёла патрабавалася для вырабу ўгнаення і малака пераважна для прыватнага спажывання. Транспартнай сельскагаспадарчай жывёлай былі валы. Насельніцтва займалася развядзеннем і адкормам свіней як для сваёй неабходнасці, так і на продаж. Коз разводзілі ў асноўным яўрэі, якія гатавалі стравы на казіным малацэ. Воўна і скура авечак ішла на вопратку, а мяса ўжывалі ў ежу [11, с. 62].

Насельніцтва Мінскай губерні для выканання палявых работ трымала коней. Яны таксама выкарыстоўваліся зімой на возцы лесу і дроў да берагоў сплаўных рэк і чыгуначных станцый. Простых авечак разводзілі ў губерні паўсюдна; шэрсць і скуру выкарыстоўвалі на вопратку, а мяса ішло ў ежу, рэдка патрапляла ў продаж. Ва ўсіх уездах, акрамя Барысаўскага і Рэчыцкага, разводзілі танкарунных авечак. Яны давалі гаспадарам воўну, якая збывалася на суконныя фабрыкі. Гандаль жывёламі адбываўся пераважна на гарадскіх рынках, а таксама ў мястэчках на базарах і ярмарках [11, с. 69].

Вялікае значэнне ў сельскай гаспадарцы мелі коні. З дапамогай коннай цягі выконвалі розныя сельскагаспадарчыя работы − узорванне глебы, перавозка грузаў. Коні давалі каштоўны гной, якім не толькі ўгнойвалі глебу, але таксама дадавалі ў корм свіней. На конях выконвалі транспартныя работы. Коней упрагалі ў калёсы, брычкі для перавозкі людзей і транспарціроўкі грузаў, выкарыстоўвалі ў паштовай і вайсковай справе.

У беларускіх губернях разводзілі коней мясцовай пароды. Хаця яны і не вызначаліся добрымі якасцямі, былі маларослыя і слабыя, аднак адрозніваліся вынослівасцю. Мелкія непатрабавальныя да ўмоў утрымання коні былі зручныя ў гаспадарцы. Аўтары Мітэцкі і Іваноўскі пісалі: "Найбольш пашыраны ў сельскага беларускага насельніцтва беспародзісты конь, або вырадак, сумесь розных парод. Гэты конь малога росту, мае малую жывую вагу, між тым ад росту і вагі залежыць і сіла каня. Просты сялянскі конь важыць у сярэднім 190–240 кг (12–15 пудоў) і вязе ў сярэднім 240–320 кг (15–20 пудоў). Такім канём нельга глыбока ўзараць зямлю, на ім шмат не павязеш, а таксама ён непрыгодны і для кавалерыі, і артылерыі" [2, с. 8–9]. "Коні на Магілёўшчыне трымаюцца выключна для абслугоўвання сваёй гаспадаркі, кормяцца дрэнна (сенам, а то і саломай). Парода дробная, ад 117 да 137 см ростам. Па гутарках сялян відаць, што буйны конь магілёўскага селяніна не задавальняе. Ён аддае перавагу каню малому, але каб ён быў моцны, рухавы, трывалы і не пераборлівы" [12, с. 30]. Глыбока даследаваў праблемы развядзення коней на тэрыторыі Беларусі В. Гладзенка. Ён таксама прыйшоў да высновы, што "коні абарыгенных парод вылучаліся сілай, рухомасцю і цалкам задавальнялі гаспадарчыя патрэбы большасці сялянскіх гаспадарак. Яны былі непатрабавальныя да кармоў і маглі доўгі час захоўваць свае працоўныя якасці нават пры скудным кармленні" [13, с. 16].

Паводле статыстычных дадзеных, у 1826–1836 гадах больш 28 % сялянскіх двароў коней не мелі. Гэта было абумоўлена як маёмасным статусам гаспадароў, так і традыцыямі вядзення жывёлагадоўчай гаспадаркі. У дарэвалюцыйнай Расіі паводле перапісу 1913 года на кожныя 100 сялянскіх гаспадарак прыпадала 30 гаспадарак, дзе коней не было. Лік гаспадарак, якія мелі па адным кані, у 1912 годзе складаў 43 %, гэта значыць амаль палавіну ўсяго сялянства [1, с. 3–7].

Конь шырока выкарыстоўваўся ў вайсковай справе. Ён быў важнай стратэгічнай баявой адзінкай у артылерыі і кавалерыі. Падчас ваенных дзеянняў конь выконваў наступныя работы: падвоз харчоў, фура-

жу, баяпрыпасаў, рознай тэхнічнай і інжынернай маёмасці, перавозка гарматаў, людзей (кавалерыя) ды інш. [2, с. 3–7]. "Падчас імперыялістычнай вайны (1914–1918) усе арміі мелі велізарныя конскія масы, роўныя мільёнам коней. Кожная армія мела за сабою вялікі абоз, транспарт. Руская армія мела ў франтавой арганізацыі на 1000 байцоў да 1400 коней. Ва ўзброеных сутычках ваяваўшых дзяржаў з боку рускай арміі прымала ўдзел 3 164 000 коней" [2, с. 6].

Можна прасачыць колькасную дынаміку конскага статка ў царскай Расіі. "Да вайны ў Расіі было 35 мільёнаў коней усіх парод. За гады імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў гаспадарка панесла вялікія страты. Лік коней зменшыўся амаль удвая, у 1922 годзе іх засталося 18 мільёнаў. З 1923 года колькасць коней стала паступова павялічвацца. З пераходам на мірны стан савецкім урадам адразу былі зроблены захады для таго, каб наладзіць сельскую гаспадарку і, у паасобку, гадоўлю коней сялянамі. Усе завадскія і палепшаныя коні, а таксама і жарабяты былі перададзены з Чырвонай Арміі зямельным органам. Пачалі наладжвацца жывёлагадоўчыя выстаўкі; сялянам даваліся льготы па гадоўлі і палепшанні коней, і нарэшце, паложаны пачатак гадоўлі коней каапeрацыяй, якая з'яўляецца адным з лепшых сродкаў да хутчэйшага палепшання нашага сялянскага каня" [2, с. 9].

Статыстычныя паказчыкі ўтрымання коней у 1938–1940 гадах былі наступныя. Конны статак у Беларусі ў пазначаны перыяд складаў 630 301 і 614 807 галоў. У аднаасобных гаспадарках пагалоўе коней паступова змяншалася і складала адпаведна 55 500 і 23 649 [14].

Сталую традыцыю складала гадоўля і выкарыстанне беларускімі сялянамі валоў. Яны служылі асноўнай цяглавай сілай на Палессі, Панямонні і на большай тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі да 20-х гадоў XX стагоддзя. У калектыўных гаспадарках у 30–40-я гады XX стагоддзя валы выкарыстоўваліся ў якасці транспартнай сілы нараўне з трактарамі і канямі: "Вол у гаспадарцы служыць неабходным дапаўненнем да трактарнага і коннага парадкаў" [15, с. 26]. Валы былі добра адаптаваныя да прыродна-кліматычных умоў, больш вынослівыя за коней і менш патрабавальныя да корму. Валоў з належнай эфектыўнасцю выкарыстоўвалі на работах, дзе патрабавалася пастаяннае раўнамернае напружанне: пры пад'ёме цаліны, перавозцы цяжкіх грузаў на кароткія адлегласці па прамому шляху, для работы на механічных млынах, малацілках, сукнавальнях, лесапілках і інш. У зімовы перыяд і на паваротных шляхах валы працавалі неэфектыўна. Лепшы за коней вынік яны давалі пры яздзе па няроўных дарогах, а таксама пры рабоце на пясчаных і балоцістых глебах. У калгаснай сельгасвытворчасці раілася выкарыстоўваць валоў у рабоце па падцягванню копаў сена да стагоў, на стагі, па перавозцы паліва, па падвозцы сена і на іншых цяжкіх транспартных работах. Пры адсутнасці альбо недахопе трактароў валоў накіроўвалі на глыбокае ворыва, веснавое ўзворванне, на жніво збожжа і іншыя работы, а коней – на работы па баранаванні, сенакашэнні, на работу ў сеялцы і г.д. Валы былі вынослівымі і працаздольнымі жывёламі. Работа трох валоў прыраўнівалася да работы двух коней. Пры належным доглядзе і ўтрыманні яны маглі працаваць па 10–12 гадзін у дзень. Пара валоў здольна за 10-гадзінны рабочы дзень прайсці адлегласць у 20 км з грузам у 1 тону [15, с. 24–26]. Валы разглядаліся таксама ў якасці крыніцы таннага мяса для выканання дзяржаўных мясапаставак. Адкормлены вол па якасці мяса замяняў 2–3 кароў або 6–8 галоў маладняка (ва ўзросце 12 месяцаў) [15, с. 6].

У 1928 годзе ў БССР колькасць валоў складала 86,2 тыс. галоў, альбо 4,0 % ад агульнага пагалоўя буйной рагатай жывёлы. Раёнамі масавай валагадоўлі былі Жыткавіцкі, Тураўскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі, Глускі, Парыцкі, Мазырскі, Ельскі, Нараўлянскі, Камарынскі, Хойніцкі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Плешчаніцкі Палескай вобласці. У пачатку 1934 года ў у калгаснікаў і аднаасобнікаў засталося 11,7 тыс. валоў (0,9 %). Гэта значыць, што за адно пяцігоддзе пагалоўе валоў паменшылася больш, чым у сем разоў. Да 1934 года вышэйпералічаныя раёны захавалі валоў у статку буйной рагатай жывёлы ў наступнай колькасці: Плешчаніцкі, Глускі, Рэчыцкі, Парыцкі, Хойніцкі і Лоеўскі – ад 0,3 да 1 %. Толькі Лельчыцкі (3 018 валоў – 16,9 %), Тураўскі (758 – 7,6 %), Петрыкаўскі (2 239 – 6,4 %) і Ельскі (1 818 – 9,4 %) раёны захавалі значны працэнт валоў у статку буйной рагатай жывёлы [15, с. 3–4]. Статыстычныя паказчыкі ўтрымання валоў (старэй за 2 гады) у дынаміцы 1938–1940 гадоў сведчаць, што па колькасці ўтрымання валоў лідзіравала Палеская вобласць (29 230). Самая меншая колькасць гэтай жывёлы налічвалася ў Віцебскай вобласці (1 401). У суадносінах з агульнай колькасцю буйной рагатай жывёлы па БССР валы складалі 1,9 % у 1938 годзе і 2,57 % у 1940-м [14, с. 5, 6, 18, 29, 42, 55].

Гэты від буйной рагатай жывёлы пэўны час захоўваўся ў БССР як у аднаасобных, так і ў калектыўных гаспадарках. Жывёлавод па доглядзе валоў у калектыўнай гаспадарцы называўся "валавік", памяшканне для ўтрымання валоў – "валоўня". Старшы валавік адказваў за стан жывога цягла і яго падрыхтоўку да работы. Яму падпарадкоўваліся асобныя работнікі, якія замацоўваліся за валамі. Яны павінны былі чысціць жывёл, карміць і паіць. Валоў прывучалі да работы з 2–3-гадовага ўзросту, рабочую прадуктыўнасць яны набывалі ў 4–5-гадовым узросце. Пры добрым доглядзе, правільным кармленні і выкарыстанні валы маглі працаваць да 10–12 гадоў. Пры дрэнных умовах догляду і ўтрымання тэрмін рабочай службы скарачаўся да 7–8 гадоў [15, с. 17–18, 29–30].

Скарачэнне пагалоўя валоў было выклікана рознымі прычынамі. Адной з іх называюць супраціўленне аднаасобнікаў абагульненню свойскай жывёлы і масавае знішчэнне валоў. Разам са знішчэннем да-

рослых валоў бязлітасна забіваўся маладняк буйной рагатай жывёлы, "каб знішчыць дарослую жывёлу і той рэзерв, з якога яна магла расшырацца і рамантавацца". Палітыку па ліквідацыі валоў праводзілі таксама паслядоўнікі прышчэпаўскай палітыкі, якія пераконвалі насельніцтва ў тым, што вол у калгасах не патрэбен, ён можа быць толькі ва ўмовах адсталай гаспадаркі [15, с. 4–5]. Рэзкае скарачэнне маштабаў і наступнае поўнае згортванне волагадоўлі на тэрыторыі Савецкай Беларусі было выклікана ў першую чаргу сацыяльна-палітычнымі і эканамічнымі працэсамі, сярод якіх стварэнне буйных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў (кааператываў, калгасаў, саўгасаў) з механізаванай вытворчасцю, выкананне планаў мясанарыхтовак, ваеннымі дзеяннямі на тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Стабільнае развіццё жывёлагадоўлі ў сялянскіх і памешчыцкіх гаспадарках назіралася да 1916 года [6, с. 139–172]. Вышэйпазначаная сітуацыя захоўвалася да пачатку імперыялістычнай і грамадзянскай вайны (1914–1922) [16, с. 5]. "Больш як шасцігадовыя ваенныя дзеянні ў спалучэнні з рэвалюцыйнымі падыходамі савецкай улады да вырашэння сацыяльна-эканамічных задач давялі гаспадарку да катастрафічнага стану. Сельгасвытворчасць да 1921 года ў параўнанні з даваенным узроўнем зменшылася прыкладна ўдвая. Адчувальныя страты панесла жывёлагадоўля, пагалоўе ўсіх відаў скаціны зменшылася" [17, с. 138].

У 1928–1929 гадах адбылося аднаўленне і нават павышэнне колькасці пагалоўя ўсіх відаў жывёлы (акрамя коней) у параўнанні з 1916 годам. Аднак дробныя сялянскія гаспадаркі не задавальнялі патрэбы насельніцтва гарадоў і прамысловых цэнтраў, якія хутка развіваліся, прадуктамі жывёлагадоўлі. Большая частка прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі спажывалася ў саміх сялянскіх гаспадарках, таварнасць іх была невысокай [16, с. 5].

У 1930–1932 гады ў СССР была праведзена масавая калектывізацыя сялянскіх гаспадарак. У гады сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў калгасах былі створаны жывёлагадоўчыя фермы, арганізавана шырокая сетка жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, перад якімі ставіліся задачы павелічэння вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі [16, с. 5]. Падводзячы вынікі першай пяцігодкі (1930–1934) у сельскай гаспадарцы Савецкага Саюза, М. Томэ і А. Дзіямідаў пісалі: "Тысячы дробных гаспадарак аб'яднаны ў буйныя калектыўныя гаспадаркі. Арганізаваны спецыяльныя фермы і соўгасы па малочнай і мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, трусаводству, птушкаводству. <…> За пяцігодку ў 4 гады колькасць жывёлы ў соцыялістычным сектары ўзрасла ў дзесяткі разоў. За гэты ж час павялічыліся пасевы траў для жывёлы, развілося сіласаванне кармоў, былі пабудаваны занава тысячы жывёламесц, многія соўгасы і калгасы механізавалі жывёлагадоўлю даільнымі машынамі і іншымі спецыяльнымі апаратамі. Соўгасы і калгасы сталі асноўнымі вытворцамі жывёлагадоўчай таварнай прадукцыі для пролетарскай дзяржавы" [3, с. 3].

Вялікі ўдар па развіцці жывёлагадоўлі нанесла палітыка раскулачвання. Найбольш заможныя сяляне, якія апрацоўвалі вялікія ўчасткі зямлі і ўтрымлівалі значна большы за беднякоў жывёльны статак (мелі па трое і больш коней, чатырох і больш кароў), былі аднесены да ліку кулакоў. Прыналежная ім жывёла была канфіскавана і перададзена ў калгасы. Так, да канца 1930 года было раскулачана 15 629 сялянскіх гаспадарак [17, с. 156–157].

Каб забяспечыць насельніцтва жывёлагадоўчай прадукцыяй, партыя і ўрад імкнуліся стварыць магутную грамадскую жывёлагадоўлю ў калгасах і саўгасах, забяспечыць на гэтай аснове агульны ўздым жывёлагадоўлі ў краіне. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў СССР было значна павялічана пагалоўе жывёлы і яе прадуктыўнасць, асабліва ў калгасах і саўгасах, хоць вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі далека не ў поўнай меры забяспечвала патрэбы ў іх насельніцтва нашай краіны [16, с. 5].

У 30-х гадах ажыццяўляліся захады па арганізацыі жывёлагадоўлі ў асабістым карыстанні калгаснікаў. Ставіліся задачы павышэння якасці жывёлагадоўлі, пароднасці, скараспеласці, павелічэння яе прыбытковасці ў гаспадарках – павелічэння ўдойлівасці, выхаду парасят, выхаду мяса ад кожнай забітай жывёлы, настрыгу воўны, вагі і добраякаснай скуры. Уздымалася пытанне аб неабходнасці правядзення даследаванняў, якая парода найбольш адпавядае мясцовым умовам і запатрабаванням і якія ёсць магчымасці для развіцця малочнай гаспадаркі і беконнай свінагадоўлі [3, с. 4; 18, с. 15].

Перад калгаснікамі, рабочымі саўгасаў і аднаасобнікамі ставілася задача "стварэння высокамалочнага статка і ліквідацыі бескароўнасці" [3, с. 7]. Саветам народных камісараў СССР і Цэнтральным камітэтам Камуністычнай партыі былі прыняты адпаведныя Пастановы (1933) і ажыццяўляліся мерапрыемствы па дапамозе бескароўным калгаснікам у набыцці кароў і паляпшэнні якасці малочнага статка: пакрыццё малочных кароў племянным бугаём на злучных пунктах і вырошчванне ад іх цёлак, абмен бычкоў на цёлак, абмен старых і маламалочных кароў у часе мясанарыхтовак на больш маладых і іншыя мерапрыемствы [3, с. 5; 17, с. 156–157].

**Высновы:**

1) асноўнымі функцыямі жывёлагадоўлі з'яўляліся: харчовая – забеспячэнне сялянскай сям'і харчовымі прадуктамі (малочнымі, мяснымі, тлушчам); сыравінная – скуры, воўна служылі сыравінай для вырабу адзення, гаспадарчых прадметаў; транспартная – коней выкарыстоўвалі для пасажырскай язды (верхавой і вупражнай у калёсах, брычках), у паштовай справе; дапаможная ў сельгасвытворчасці (коні і валы ў якасці цяглавай сілы для транспарціроўкі грузаў, прывядзення ў рух сельгаспрыстасаванняў); забеспячэнне раслінаводства ўгнаеннем; ваярская (кавалерыя, артылерыя);

2) стабільнае развіццё жывёлагадоўлі ў сялянскіх гаспадарках назіралася да 1916 года. У першай палове XX стагоддзя імклівымі тэмпамі адбываліся пераўтварэнні ў гаспадарча-эканамічным і грамадска-культурным укладзе жыцця беларусаў. Яны былі выкліканы грамадска-палітычнымі падзеямі (імперыялістычная, грамадзянская войны (1914–1922 гг., польская акупацыя земляў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчынная вайна і інш.);

3) рэзкія змены жывёлагадоўля перацярпела пры пераходзе ад аднаасобнай да калектыўнай гаспадаркі, які распачаўся ў 1927–1928 гадах. Значная колькасць коней, кароў, валоў былі абагульнены ў сельгаспадарчыя кааператывы і калектыўныя гаспадаркі. У аднаасобных гаспадарках значна зменшылася колькасць кароў, скараціўся конскі статак, зменшылася колькасць валоў. Вялікі ўдар па развіцці жывёлагадоўлі нанесла палітыка раскулачвання найбольш заможных сялян;

4) працэсы стабілізацыі жывёлагадоўчай гаспадаркі паскорыліся ў 1933–1940 гадах, калі з боку дзяржавы аказвалася пэўная дапамога жыхарам вёскі ў набыцці свойскай жывёлы для прысядзібных гаспадарак, вялася работа па паляпшэнні парод.

ЛІТАРАТУРА


1. Пратасевіч, П. Якую маюць скаціну сяляне вёскі Тушкова Аршанскае акругі і як яе даглядаюць / П. Пратасевіч // Плуг. – 1927. – № 8.
2. Мітэцкі, Іваноўскі. Конь у сельскай гаспадарцы і арміі / Мітэцкі, Іваноўскі. – Менск: БДВ, 1930. – 72 с.
3. Томэ, М.Ф. Асновы жывёлагадоўлі: пер. з рус. / М.Ф. Томэ, А.М. Дзіямідаў. – Мінск: ДВБ. Сельгассектар, 1934. – 556 с.
4. Юрмалиат, А.П. Выращивание молодняка крупного рогатого скота / А.П. Юрмалиат. – М.: Сельхозиздат, 1961. – 152 с.
5. Федасееў, Н. Памятка чырвонаармейцу павозачнаму / Н. Федасееў. – Менск: Дзярж. ваеннае выд-ва БССР, 1932. – 66 с.
6. Улащик, Н.Н. Скотоводство в Литве и Западной Белоруссии (1811–1861) / Н.Н. Улащик // Материалы по истории сельского хозяйства у крестьянства СССР: сб. / Н.Н. Улащик. – М.: Изд-во АН СССР, 1960. – С. 139−172.
7. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов: XIX − начало XX в. / В.С. Титов. – Минск: Наука и техника, 1983. – 152 с.
8. Памятная книжка Виленской губернии на 1888 год. – Вильно: Виленская губ. тип., 1887. – 164 с.
9. Памятная книжка Виленской губернии на 1892 год. Изд. Виленского губерн. стат. комитета. – Вильно: Виленская губернская типография, 1891. – 188 с.
10. Отчет о действиях общества витебских сельских хозяев за 1901 год. – Витебск, 1905. – 18 с.
11. Памятная книжка Минской тубернии на 1911 год. – Мінск: Губерн. Тип., 1910. – 362 с.
12. Дыяконенка, С. Жывёлагадоўля Магілёўшчыны / С. Дыяконенка // Плуг. – 1927. – № 11.
13. Гладенко, В.К. Белорусская лошадь / В.К. Гладенко. – Мінск: Ураджай, 1976. – 105 с.
14. Численность скота в БССР на 1 января 1940 г. (предварительные итоги). – Минск: Изд. УНХУ БССР, 1940. – 64 с.
15. Фёдараў, А.М. Догляд за рабочым валом / А.М. Фёдараў. – Мінск: ДВБ. Сельгассектар, 1925. – 48 с.
16. Есаулаў, П.А. Асновы жывёлагадоўлі: вучэб. дапамож. для вучняў IX класаў сельскіх школ / П.А. Есаулаў, С.С. Шаін. – выд. трэцяе з чацвёртага рускага. – Мінск: Дзярж. вуч.-пед. выд. М-ва асветы БССР, 1961. – 194 с.
17. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экоперспектива, 2007. – 613 с.
18. Самцэвіч, В. Праблема павышэння ўраджайнасці і краязнаўства / В. Самцэвіч // Наш край. – 1929. – № 3. – С. 15.


*Паступіў 21.05.2014*

**THE STATE AND THE DEVELOPMENT OF STOCK-RAISING IN BELARUS (END OF XIX – 40 YEARS OF THE TWENTIETH CENTURY)**

***L. SIVURAVA***

*The importance of stock-raising in economic activity of Byelorussians is analyzed in this article. The basic functions are defined more exactly. The author detects the reasons of the changes in the development of stock-raising which happened in the result of social and political events in the 1 half of XX century.*

УДК 94(474/476)+355.48(474/476)

# ВОЕННЫЕ ДЕЙСТВИЯ В БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ЗЕМЛЯХ В 1831 ГОДУ

*В.Е. ЗАЙЦЕВ*
*(Белорусский государственный университет, Минск)*

*Дана общая характеристика использованных в ходе исследования источников и литературы. Рассматриваются основные предпосылки начала восстания 1830–1831 годов в Королевстве Польском и землях Великого Княжества Литовского, подготовка к вооруженному выступлению в Виленской губернии, его начало в марте 1831 года, ответные мероприятия российского командования. Анализируется ход военных действий в белорусско-литовских землях в апреле – августе, в том числе действия польского отряда барона Дезидерия Хлаповского, корпуса генерала Антония Гелгуда. Описан штурм Вильно в июне 1831 года, поражение и отступление повстанцев из белорусско-литовских земель. Автор выделяет причины поражения восстания на рассматриваемой территории и приводит некоторую информацию о численности его участников и потерях с их стороны, дает оценку деятельности генералов А. Гелгуда и Г. Дембинского, а также подчеркивает значимость событий 1830–1831 годов в белорусской истории.*

**Введение.** Восстание 1830–1831 годов оставило значительный след в истории Беларуси. Однако в настоящее время в отечественной историографии не все вопросы этой темы исследованы сполна, среди них и такой важный вопрос, как вооруженная борьба белорусских и литовских повстанцев с российской армией. Поэтому представляемое исследование посвящается именно этому аспекту.

По рассматриваемой теме существует большое количество источников и литературы. В работе были использованы мемуары современников тех событий: российского генерала Д.В. Давыдова [1]; польского генерала, активного участника повстанческой борьбы, – Дезидерия Хлаповского [2]; дневник воспоминаний белорусского повстанца Игнатия Клюковского [3]. Помимо этих данных, автор приводит письма Николая I главнокомандующему резервной армией графу, генералу П.А. Толстому [4]. Среди вызывающих интерес источников по военной истории XIX века полковые истории [5].

Интересующая нас тема затрагивалась в ряде исследований, опубликованных в дореволюционный период. В первую очередь, следует назвать работу А.К. Пузыревского «Польско-русская война 1831 года» [6]. Этот труд описывает ход военных действий, содержит большое количество подробных таблиц (о состоянии войск, их передвижениях, потерях), хотя и несет на себе идеологический отпечаток той эпохи. Репрессивные меры российских властей при подавлении освободительной борьбы 1831 года на рассматриваемой территории описаны в работе Д.А. Кропотова «Жизнь графа М.Н. Муравьева» [7]. Политическое положение Королевства Польского, а также белорусско-литовских земель перед восстанием анализируются в книге Ш. Аскенази [8]. Сведения биографического характера о многих участниках описанных в представляемой работе событий приведены в «Русском биографическом словаре» А.А. Половцева [9–11]. Большое внимание теме восстания уделено в польской историографии: [12–15].

В наши дни немало белорусских историков в той или иной степени успешно занимаются изучением вопросов восстания 1830–1831 годов в Беларуси [16–22].

**Основная часть.** После присоединения к Российской империи территорий бывшей Речи Посполитой перед Санкт-Петербургом возникла новая глобальная проблема, так называемый «польский вопрос». В начале XIX века проблема восстановления государственности на землях бывшей Речи Посполитой стала одной из центральных в европейской политике. В ходе Наполеоновских войн (1799–1815 гг.), в 1807 году было создано Княжество Варшавское. По решению Венского конгресса (1814–1815 гг.) большая его часть отошла к Российской империи, и в 1815 году на этих землях было образовано Королевство Польское, получившее от императора Александра I автономию и либеральную конституцию [8, с. 2; 6, с. 2]. Вместе с тем земли бывшего Великого Княжества Литовского не были присоединены к Царству Польскому. Таким образом, нарушалось длительное единство этих народов. Политика, проводимая по отношению к их населению не в лучшую сторону, отличалась от политики в отношении жителей Польского королевства и вела к значительному ухудшению положения народа. Эти обстоятельства вызывали недовольство у широких слоев польской общественности, а также и у передовой части граждан бывшего ВКЛ (шляхты, духовенства, студенчества), и наряду с постоянными нарушениями «либеральной конституции» российского императора Александра I стали серьезными предпосылками для начала освободительной борьбы. В любом случае, народ Речи Посполитой не мог смириться с тем, что его Отечество захвачено и разделено [19, с. 39; 15, с. 24; 16, с. 20; 8, с. 90].

В конечном итоге 29 ноября 1830 года в Варшаве началось национально-освободительное восстание. В тот день, вечером, группа из 18-ти человек совершила неудачное покушение на наместника императора в Королевстве Польском цесаревича Константина Павловича. Петр Высоцкий поднял на восста-

ние школу подпрапорщиков – отряд из 160-ти лиц направился в казармы русских и польских полков. Однако высшие польские офицеры первоначально не поддержали восставших. И только младшее офицерство вывело на улицы столицы свои роты, чем спасло восстание. К ним присоединились горожане, а затем и полки войск, генералитет, аристократия [16, с. 45].

Спустя некоторое время наместник императора сдал повстанцам все крепости, военные арсеналы и покинул пределы Королевства. Польские земли охватила революция [6, с. 8]. Оценка действий Константина сегодня – дискуссионный вопрос. Ведь, как полагали многие очевидцы Варшавских событий, у цесаревича имелись возможности подавить мятеж в «зародыше» [1, с. 27; 5, с. 173].

Известие о начале вооруженного выступления в Варшаве поступило в Санкт-Петербург в первых числах декабря 1831 года. Российское командование незамедлительно приняло меры по мобилизации своей армии и сосредоточило ее в одном месте. Главнокомандующим действующей армией был назначен граф, генерал-фельдмаршал И.И. Дибич-Забалканский. С целью нераспространения крамолы 13 декабря 1830 года в Минской, Гродненской, Виленской губерниях, Белостокской области, а также Волынской и Подольской губерниях вводилось военное положение. Эти территории передавались в подчинение графу И.И. Дибичу-Забалканскому. Таким образом, их население попадало под юрисдикцию военно-полевых законов [19, с. 43].

В последующем русским, вопреки расчетам, вследствие серьезного отпора противника не удалось разгромить польскую армию «одним ударом», в результате война приняла затяжной характер [6, с. 133].

Жесткие полицейские меры, принятые царским правлением для предотвращения распространения восстания, не смогли помешать революционному порыву многих патриотов. При поддержке эмиссаров из Варшавы для подготовки и руководства восстанием в белорусско-литовских землях в январе 1831 года был создан Виленский Центральный комитет. В различные районы направились его представители, в том числе в Минщину и Витебщину. В феврале Центральный комитет принял решение начать выступление в Виленской губернии, поскольку эта область слабо охранялась российской армией. В то время ее основные силы находились в Белостоке, Гродно, Минске и Слониме. Однако время шло, а Комитет в Вильно приказа о начале военных действий не отдавал [19, с. 44; 16, с. 62].

Тяготы русско-польской войны, возложенные российским военным командованием на население белорусско-литовских земель, вызывали у него все большее недовольство. В особенности угнетались крестьяне. Наряду с многочисленными реквизициями, наблюдались и факты злоупотреблений полномочиями со стороны военных. К примеру, в марте 1831 года в районе Слонима татарский полк нанес серьезный вред крестьянским хозяйствам, в то же время в Слонимском уезде полному опустошению подверглось усадьба помещика Н. Михайловского (имение Льняники). Подобный случай был зафиксирован и в Свислочи, где ограбили местного священника [19, с. 45]. Непростая ситуация сложилась в Жмуди [14, с. 221].

Наконец, 26 марта 1831 года повстанческие отряды, состоящие из крестьян и шляхты, напали на город Россиены Виленской губернии. Они обезоружили небольшую российскую команду и овладели населенным пунктом. Захваченная территория включалась в состав возрождавшегося Королевства Польского. Населению гарантировались свобода и равенство, зафиксированные в Статуте ВКЛ 1588 года [16, с. 63].

Это событие стало своего рода сигналом к всеобщему выступлению. За считанные дни восстание охватило Виленщину [6, с. 261]. Патриоты под предводительством Кароля Залусского всерьез начали готовиться к штурму недостаточно защищенного губернского центра. Однако захват Вильно по ряду обстоятельств, и в первую очередь из-за недостаточной военной подготовки, не был осуществлен [13, с. 19; 3, с. 62; 6, с. 263]. В то же время отрезанный от театра военных действий Виленский комитет не смог руководить ходом восстания, повстанцы каждого уезда действовали обособленно [19, с. 46]. Организующей силой выступала шляхта, она же и составляла основной костяк формирований [20, с. 192]. Среди шляхты находилось немало бывших офицеров времен наполеоновских войн [19, с. 45].

В Ворнах был устроен оружейный завод. Помощь свинцом и порохом оказывали пруссаки [6, с. 138].

Освободительная борьба затронула и Гродненскую губернию. Подготовка к восстанию здесь велась с января 1831 года. Тайная координирующая организация была основана в губернском городе. Концентрация в этом крае имперских войск не позволяла развернуть широкую борьбу за освобождение, подобно той, которая развернулась в Виленской губернии [16, с. 84].

Вооруженное выступление в Виленской губернии явилось большой проблемой для действующей российской армии, которая в результате оказалась практически неспособной вести военные действия с противником в Королевстве Польском. Фельдмаршалу И. Дибичу-Забалканскому пришлось бросить в «Литву» крупные формирования. С целью локализации опасных очагов и скорейшего подавления восстания в апреле 1831 года была создана многотысячная резервная армия под командованием генерала от инфантерии Петра Александровича Толстого с подчинением ему Витебской, Могилевской и Минской губерний, а в июне – Виленской, Гродненской губернии и Белостокской области [7, с. 277].

Первым крупным поражением повстанцев стал Ошмянский бой, который произошел 16 апреля. В этот день казаки полковника Верзилина, направленного с отрядом в 1500 человек и 4-мя орудиями для

действий против ошмянских «инсургентов», откинули небольшой отдел защитников Ошмян, ворвались в этот город и учинили жестокую расправу над населением. Итогом «кровавых» событий стали жертвы более чем 350 человек [19, с. 48; 3, с. 50]. В 20-х числах того же месяца специальные карательные отряды под руководством опытных царских военачальников (Я. Отрощенко, Н. Сулимы, С. Хилкова и др.) поочередно приступили к подавлению восстания. К концу мая 1831 года Виленщина вместе со всеми важнейшими дорогами находилась под контролем российских войск, подчиненных незадолго графу П.А. Толстому [6, с. 270]. Освободительное движение потерпело серьезный удар, повстанцы лишились оружейного завода, поставок из Пруссии, немало из них погибло в боях. Но даже после этого многие патриоты продолжали вести партизанскую войну, и в будущем примкнули к польским регулярным войскам [13, с. 22].

В то время как на территории упомянутой губернии восстание пошло на спад, его новые серьезные очаги возникли в Дисненском уезде Минской губернии. К середине мая 1831 года в этом месте сосредоточились крупные силы из различных уездов, примерно 6 тысяч человек. В конечном итоге, после ряда неудачных боев, 16 мая повстанцы объединились в Лужках. Ввиду подхода значительных российских войск они приняли решение об отступлении. В целях отвлечения внимания военного противника, провели удачный маневр (в Лепельский уезд выступил отряд в 1200 человек, который впоследствии был разбит), что позволило их значительной части (2000 чел.) успешно отступить в Виленскую губернию [16, с. 82; 6, с. 271].

